**Сяргей Законнікаў**

# Беларускае сэрца

*Публіцыстычны роздум, эсэ*

Мінск
«Беларусь»
1993

ББК 84 Бел
З-19
УДК 882.6-4

Серыя заснавана ў 1991 годзе

ISBN 5-338-01107-7
© С. Законнікаў, 1993

## ІНШАГА ШЛЯХУ НЯМА

Жыццё ставіць нас перад сур'ёзным выпрабаваннем. Закранем некаторыя, самыя балючыя, праблемы. На жаль, бурнае шпаркае развіццё прамысловасці (асабліва хімічнай) і сельскай гаспадаркі, нізкі ўзровень тэхналогіі, спажывецкія адносіны да прыроды рэзка пагоршылі экалагічнае становішча ў рэгіёне яшчэ да чарнобыльскай катастрофы. Даўно ўжо выведзена з гаспадарчага ўжытку значная частка зямель, нішчацца лясы, забруджваюцца паветра, рэкі і азёры, грунтовыя воды, людзі вымушаны спажываць харчовыя прадукты, перанасычаныя нітратамі, пачасціліся выпадкі цяжкіх захворванняў. Бясспрэчна адно — нам неабходна больш уважліва вывучаць і актыўна вырашаць экалагічныя праблемы, пачынаючы з самай жахлівай і непрадказальнай па выніках чарнобыльскай і канчаючы, на першы погляд, нязначнымі.

Час дэмакратызацыі і галоснасці высвеціў і іншыя негатыўныя бакі нашага жыцця. Ён адкрыў для ўсёй краіны яшчэ адзін беларускі «феномен». Вось што пра гэта піша кандыдат юрыдычных навук І. Цімчанка ў артыкуле «Не дзяржаўная, а міжнацыянальная», змешчаным у газеце «Аргументы и факты» (№ 31, 1988 г.): «На жаль, прававыя акты ў гэтай галіне (у нацыянальнай палітыцы) — С. З.) не заўсёды і не ўсюды захоўваюцца. Невыпадкова з'яўленне ў друку шэрага публікацый пра неапраўданае масавае закрыццё ў недалекім мінулым школ, напрыклад, з беларускай, украінскай мовай навучання, пра факты так званага «суперінтэрнацыяналізму» і нацыянальнага нігілізму, пра звужэнне сферы ўжывання шэрага нацыянальных моў. Гэтыя і іншыя факты з'явіліся, у прыватнасці, адной з прычын падзей у Нагорным Карабаху».

Сёння мы справядліва лічым, што карані таго катастрафічнага стану беларускай мовы, які склаўся ў рэспубліцы, трэба шукаць не ў далёкай мінуўшчыне, а ў першую чаргу ў канцы 20-ых і ў 30-ыя гады.

Зараз вядома значна больш (але далека не ўсё!) пра тыя часы, калі самыя таленавітыя прадстаўнікі нашага народа, якія стваралі матэрыяльны, навуковы і духоўны патэнцыял рэспублікі, пасля навешвання ярлыкоў «надцэмаў» знішчаліся фізічна. Хваля рэпрэсій кацілася па Беларусі і пасля вайны. Пад сатрапаўскім ціскам мяккіх ічыгаў Сталіна, якія з замілаванасцю апяваліся ў многіх мастацкіх творах аж да сённяшняга дня, не толькі нашаму народу дяжка было выпрастаць спіну. Будзем спадзявацца, што гісторыя скажа праўдзівае слова пра адносіны да лёсу нацый і народнасцей СССР «бацькі ўсіх народаў» і яго паплечнікаў, крывавых спраў майстроў — Ягоды,

Яжова, Берыі, Кагановіча, Молатава, Варашылава і многіх іншых, аслабаніць школьныя падручнікі і шматтомныя акадэмічныя навуковыя даследаванні ад цынічнай хлусні. І ўсё ж, як ні дзіўна, школы з беларускай мовай навучання ў гарадах і райцэнтрах рэспублікі тады яшчэ існавалі.

Актыўны наступ на школы — першааснову нацыянальнага духоўнага здароўя — пачаўся ў вірах бурнай эксперыментатарскай дзейнасці (асабліва на апошнім этапе) Хрушчова. У адным са сваіх выступленняў у Прыбалтыцы ён, маючы на ўвазе моўную сітуацыю ў нашай рэспубліцы, сцвярджаў, што трэба браць прыклад з беларусаў, што яны першымі ўвойдуць у камунізм. Сёння мы з усмешкаю згадваем утопіі Мікіты Сяргеевіча, але гэтая наша ўсмешка, як кажуць, скрозь горкія слёзы.

А заканчваўся гэты наступ «суперінтэрнацыяналізму» ў застойнай твані брэжнеўскага часу, калі карупцыя, хабарніцтва, прыпіскі, махлярства і іншыя злачынствы «вярхоў і нізоў» пакрываліся зялёнай раскаю дэмагогіі, хлусні, лізаблюдства і абыякавасці. Над ідэалогіяй, асветай і культурай навіс цень «шэрага кардынала» — так трапна ў народзе ахрысцілі Суслава.

Паўтарылася тая сітуацыя, пра якую геніяльны Максім Багдановіч пісаў у 1913 годзе:

Народ, Беларускі Народ!
Ты — цёмны, сляпы, быццам крот.
Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі, —
У ёй нават мовы няма.
Збудзіўшысь ад грознай бяды,
Ўвесь поўны смяротнай жуды,
Ты крыкнуць не вольны: «Ратуйце!»
І мусіш ты «Дзякуй» крычаць.
Пачуйце жа гэта, пачуйце,
Хто ўмее з вас сэрцам чуваць!

Роднае слова марнела катастрафічна хутка. Беларусь анямела, перайшла на жахлівую трасянку.

Атмасфера фальшу, угодніцтва, чынашанавання вымагала штодзённых пераможных рэляцый, рапартаў знізу ўверх не толькі ў эканоміцы, але і ў іншых сферах. І наша дробнае чыноўніцтва, адчуваючы падтрымку з Мінска, рада было старацца, імкнулася быць «святцей папы рымскага», без аніякага рашэння, без апытання насельніцтва пераводзіла беларускія школы на рускую мову навучання. Побач з гэтым ішло выжыванне роднай мовы са справаводства, з

друку, кніжных выдавецтваў і г. д. У кабінетах чыноўнікаў — і тых, што былі прысланы з Расіі, і мясцовых — вырошчваліся бацылы страшнай хваробы — нацыянальнага нігілізму. Гэтая хвароба перарасла ў эпідэмію, пракацілася, як чума, па душах людзей, аслабіла народны арганізм, давяла яго да крытычнай мяжы. Як зямля, воды, паветра ўжо не могуць сваёй сілаю сёння супрацьстаяць усёзнішчальнай атацы безгаспадарчасці, экалагічнага невуцтва, так і душы людзей, вынішчаныя, апустошаныя, сталі безабароннымі перад націскам ваяўнічага мяшчанства, спажывецтва, апалітычнасці, абыякавасці.

Пра тое, чым гэта заканчваецца, расказала 7 жніўня 1988 года газета «Советская Белоруссия» ў судовым нарысе «Зграя». Ёсць у ім і такія словы: «Як жа выраслі ва ўмовах савецкай школы сапраўдныя фашысты, іншае слова знайсці проста цяжка? Адказ на гэтае пытанне шукаюць і вучоныя, і юрысты, і настаўнікі, і журналісты. Адназначнага адказу няма. Але тое, што ў аснове ўсяго — уражваючая бездухоўнасць, бясспрэчна». Вывад правільны. Зазначым, што, як піша газета, у лесапарку Сцяпянкі і ў самім пасёлку, дзе на працягу доўгага часу адбываліся зверствы, асабліва жорсткія і цынічныя згвалтаванні дзяўчат, замахі на жыццё людзей, шантаж, гналася і ракою цякла самагонка, міліцыя і дружыннікі амаль ніколі не бывалі.

Затое нядаўна ў цэнтры горада ў Купалаўскім скверы, як кажуць, сярод белага дня мне давялося ўбачыць столькі міліцыі і дружыннікаў, што гэта выклікала натуральную цікавасць. Падышоў бліжэй і даведаўся, што члены аб'яднання «Талака» праводзяць тут збор подпісаў за тое, каб беларускай мове вярнуць страчаныя правы, статус рабочай, дзяржаўнай мовы. На планшэце, які моладзь трымала ў руках, у звароце да людзей былі ленінскія словы.

Да талакоўцаў падыходзілі людзі. Адны падпісваліся, другія чыталі, паціскалі плячамі і праходзілі, трэція спыняліся, распытвалі: дзеля чаго гэта робіцца? Усё ішло як быццам спакойна, але праз нейкі час купка талакоўцаў — чатыры ці пяць чалавек — была акружана міліцыяй і дружыннікамі. Падпалкоўнік міліцыі і прадстаўнік Цэнтральнага райвыканкама прапанавалі ўсім разысціся, спрабавалі адабраць планшэт. З іх вуснаў загучала такое: «Что вы здесь устраиваете митинг, мешаете отдыху трудящихся? Прекратите недозволенное сборище». Талакоўцы стаялі моўчкі і толькі пасля гэтых слоў адказалі: «Таварыш падпалкоўнік! Вы самі бачылі, што мы стаім спакойна, маўчым, нікому не перашкаджаем. Няхай людзі чытаюць, хочуць падпісвацца — калі ласка, не хочуць — не трэба. А вы сваім павышаным тонам сапраўды збіраеце зараз людзей, ствараеце непатрэбны ажыятаж вакол нас». Абурана загаварылі і людзі, якія стаялі: «Што вы

робіце? Што гэта за дэмакратыя? Чаму разганяеце? Чым яны вам перашкаджаюць?» Я таксама пачаў сцішваць запал ваяўнічых ахоўнікаў правапарадку. Але яны аж кіпелі ад злосці, ніякія ўгаворы не дапамагалі.

Пажылая жанчына прамовіла: «Тут все правильно. Нужно подписать. А чего их прогоняют?» Сяброўка тузанула яе за рукаво: «Идем отсюда, а то и тебя тоже возьмут». На гэта жанчына з усмешкаю адказала: «А что? Это даже интересно. Меня еще никто никогда в жизни не хватал и не сажал».

Тым часам актывізаваліся некаторыя дружыннікі і нейкія людзі без павязак, якія дасюль стаялі на алейцы. Яны ўціснуліся ў натоўп, пачалі штурхацца, крычаць, абвінавачваць талакоўцаў у... нацыяналізме, фашызме, у жаданні адарваць беларусаў ад рускіх. Асабліва стараўся адзін чалавечак у карычневай замшавай куртачцы. Правакатары яўна хацелі такой жа сутычкі, якая, як мне потым расказалі, адбылася днём раней, у пятніцу 5 жніўня, калі некалькі талакоўцаў былі дастаўлены ў аддзяленне міліцыі за «ўчынены беспарадак».

Але на гэты раз сутычкі не адбылося. Талакоўцы па загаду прадстаўнікоў улады перавярнулі планшэт і паклалі яго на лаўку. Згадзіліся яны і на тое, каб за 10 дзён узяць дазвол на правядзенне такой акцыі, хоць і зазначылі, што гэта не той выпадак, што дзеянні міліцыі і прадстаўніка райвыканкама неправамерныя. Адзін дружыннік сказаў па-беларуску: «А чаго мы да іх прычапіліся? Што яны — жабруюць ці яшчэ што кепскае робяць?» Пачалася мірная дыскусія талакоўцаў і тых, хто іх падтрымліваў, з дружыннікамі і міліцыяй па нацыянальных праблемах. І мне падалося, што абодва бакі паразумеюцца.

Пра фінал гэтай гісторыі мне расказалі назаўтра. Усё ж аднаго члена «Талакі» даставілі ў аддзяленне міліцыі, забралі планшэт, склалі пратакол і затым адпусцілі.

Зараз асаблівая ўвага надаецца нацыянальным пытанням, па ўсёй краіне ідзе стварэнне маладзёжных палітычных клубаў, народ кінуўся ў палітыку, а тут зноў — «не пушчать».

Бяда ў тым, што нашы ідэолагі не ведаюць гісторыі беларускай зямлі і яе народа, не ўмеюць весці канструктыўную дыскусію, палеміку, карыстаюцца састарэлымі догмамі, стэрэатыпамі і клішэ. Яны вышукваюць у дзейнасці нефармалаў перакосы, палохаюць імі недасведчаных людзей і гэтым самым стараюцца паказаць важнасць сваёй работы. Але ці такая выхаваўчая работа патрэбна сёння?

Рост наркаманіі, правапарушэнняў сярод моладзі, выпадкі цынічнага здзеку над нашымі святынямі — помнікамі воінам і партызанам, ахвярам фашызму і многае іншае пераконваюць, што мы па-

вінны гаварыць у поўны голас пра экалогію маралі, культуры, пра ваяўнічую бездухоўнасць, якая набывае ўсё большыя і большыя памеры.

Дык чаму ж мы звыкліся з хамствам, нецэнзуршчынай, закрываем вочы на злоўжыванні службовым становішчам, спекуляцыю, хабарніцтва, але ў той жа час баімся цікавасці да духоўнай спадчыны, нацыянальнай мовы і культуры, якая пачынае расці ў народзе? Спадзявацца, што гэтую цікавасць можна спыніць нарадамі міліцыі і дружыннікаў, марна.

Трэба не палохацца, а радавацца, што многія людзі, і асабліва моладзь, пачынаюць выходзіць са стану ачмурэння заходняй эрзацкультурай або з летаргіі, што ў іх абуджаецца нацыянальная свядомасць, пачуццё павагі да гісторыі свайго народа, любові да роднага краю, жаданне зрабіць для яго нешта карыснае, што яны ўспамінаюць неўміручыя словы Янкі Купалы: «Людзьмі звацца». Даўно вядома: калі няма патрыёта, то няма і сапраўднага інтэрнацыяналіста.

Але не ўсе гэта разумеюць. Сярод нас ёсць яшчэ шмат людзей, якім і сёння вельмі хочацца ў рэспубліцы, якая на алтар інтэрнацыяналізму паклала не толькі сапраўды гераічную працу, але і мільёны жыццяў сваіх лепшых сыноў і дачок, ствараць атмасферу падазронасці, варожасці, у самым маленькім праяўленні нацыянальнай годнасці шукаць нацыяналізм.

Апошнім часам мне даводзілася часта бываць і выступаць на заводах, фабрыках, у калгасах, ВНУ, школах, маладзёжных клубах. Амаль заўсёды літаратурныя сустрэчы перарасталі ў ажыўленыя дыскусіі па самых розных набалелых пытаннях нашага жыцця. Пераканаўся, што лёс беларускай мовы і культуры, вяртанне гісторыі народа, экалагічныя праблемы хвалююць людзей самых розных нацыянальнасцей, узростаў, прафесій, кругагляду. На сустрэчы ў Віцебскім абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў уразілі словы выкладчыцы з Наваполацка: «Шаноўныя пісьменнікі! Вы маладзейшыя за мяне, але я пакланюся вам і прашу зрабіць гэта ўсю аўдыторыю за тое, што вы захоўваеце, абараняеце нашу мову, культуру, родную прыроду, дбаеце пра народ, пра яго духоўнае і фізічнае здароўе. Ведаю, як вам бывае нялёгка, але заступіліся і за нас, навапалачан. А ў нас бяда. Хварэюць... паміраюць... дзеці...» Жанчына заплакала.

Настаўніцу з Наваполацка я ўспомніў на Валыні, у час правядзення Дня памяці выдатнай паэтэсы Лесі Украінкі. Пасля літаратурнага вечара ў Луцку мяне абступіла група пажылых людзей. Гэта былі былыя члены Камуністычнай партыі Заходняй Украіны, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны працы, якія прыехалі сюды з розных куткоў рэспублікі. Сівавусы львоўскі рабочы горача, усхвалявана

загаварыў: «Дарагі беларус! Дзякуй за выступленне. Каб ты ведаў, з якой радасцю мы слухалі цябе, тваю мову. Якая яна прыгожая! Але мы ведаем, што робіцца з ёю ў вашай рэспубліцы. Просім цябе, як зможаш — праз газету, па тэлебачанні ці радыё, на сустрэчы з людзьмі — перадай беларусам, што мы, украінцы, старыя людзі, становімся перад імі на калені і заклінаем — ратуйце мову. Што ж вы робіце! Будзьце людзьмі! Калі яна памрэ, не жыць і нашай мове. А без вашай і нашай мовы стане сіратою і збяднее руская».

Цяжка было слухаць гэтыя шчырыя, разумныя словы. Хоць ты скрозь зямлю праваліся ад сораму.

А чыноўнікі ў нас кажуць: «А што вы, пісьменнікі, хочаце? Народ сам адмаўляецца ад сваёй мовы, аддае перавагу рускай. Мовы блізкія, гата аб'ектыўны працэс».

Абсурднасць такіх аргументаў відавочная. Людзі на працягу дзесяцігоддзяў не маюць магчымасці змалку авалодваць сваёй мовай, у сваёй рэспубліцы беларусаў прымушаюць пісаць заявы і прасіць, каб іх дзецям дазволілі навучацца па-беларуску — і гэта падаецца як аб'ектыўны працэс?! А што, моўныя праблемы ў Кіргізіі, Казахстане, Малдавіі, Латвіі, Татарыі, Якуціі і г. д. таксама выкліканы блізкасцю нацыянальных моў з рускай?

У тым, што адбылося, народ не вінаваты. Нават, калі ён маўчыць. Вінаваты дэнацыяналізаваныя служкі пачварнай сістэмы, якія за родную мову расстрэльвалі людзей, садзілі за калючы дрот, ссылалі на Поўнач, у Сібір, знішчалі дзесяткі моў і культур.

Я веру ў свой народ, у тое, што ён быў і застаецца носьбітам і ратавальнай крыніцаю сапраўднай духоўнасці. «Вялікі нямы» сёння прачнуўся, загаварыў. Паслухайце толькі, як хараша загучала апошнім часам сакавітае народнае слова па радыё і на тэлебачанні. І нельга не заўважаць, што гучыць яно не толькі з вуснаў механізатараў, даярак, цялятніц, але і гарадскіх рабочых, кіраўнікоў самых розных узроўняў. Няпраўда, што народ адцураўся роднай мовы. Але і з народам трэба гаварыць на жывой, ягонай роднай мове, а не на мове інструкцый і загадаў.

Доўгі час сапраўдны інтэрнацыяналізм падмяняўся ў нас балбатнёю, паказухаю, заздраўнымі тостамі на ўрадавых банкетах. Нацыянальныя праблемы не вырашаліся, а заганяліся адміністратыўна-каманднаю сістэмаю ўглыб. Усё гэта рабілася пад прыкрыццём і ў імя ідэй савецкага інтэрнацыяналізму, са спасылкай на ўказанне зверху. Перыферыйным чыноўнікам хацелася выслужыцца перад начальствам, падняцца на вышэйшую прыступку службовай лесвіцы, свой ко-

жны пралік, бяздумнасць і невуцтва ў нацыянальных пытаннях спісаць на Маскву, на рускі народ: «Там не поймут!»

А рускі народ усё выдатна разумее. Ён бачыць, што знікненне нацыянальных моў прыносіць рускай мове вялікія страты. Замест узаемнага ўзбагачэння моў адбываецца нівеліроўка рускай мовы.

Тую рускую мову, на якой зараз размаўляе пераважная большасць карэннага насельніцтва нацыянальных рэспублік на рабоце, у транспарце, у магазінных чэргах, нельга назваць сапраўднай мовао. Гэта пэўны моўны сленг, каб паразумецца. Вось чаму ў абарону нацыянальных моў у друку і вусна выступаюць не толькі пісьменнікі Расіі, але і калгаснікі, рабочыя, усе, хто разумее іх каштоўнасць, унікальнасць і неабходнасць. Гавораць з болем яны і пра тое, што трэба ўжо ратаваць і рускую мову, якая таксама падверглася дэфармацыі.

Рускі народ хацеў бы чытаць лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў, знаёміцца з нашым фальклорам у кваліфікаваным, добрым перакладзе, але кіраўнікі Дзяржкамвыда БССР, якія часта папракаюць літаратараў у нацыянальнай абмежаванасці, а сябе лічаць сапраўднымі інтэрнацыяналістамі, увесь тыраж кніг на рускай мове, які меркавалася паставіць па кнігаабмену на саюзны рынак, рашылі рэалізаваць дома, бо свая кішэнь важней. Пра гэта расказала газета «Книжное обозрение» (№ 32 за 5 жніўня 1988 г.).

Не такая практыка павінна існаваць у міжнацыянальных адносінах. Клапоцячыся пра развіццё роднай мовы, культуры, трэба заўсёды з увагай і павагай адносіцца да духоўнага вопыту братніх народаў.

Сёння многае неабходна пераглядаць, мяняць у нашым жыцці. Паўсядзённыя клопаты не павінны засланяць самае важнае, тое, што можна зрабіць толькі разам, усёй народнаю сям'ёю. Хлеба, малака, каўбасы, розных рэчаў на дзесяцігоддзі не нарыхтуеш, не назапасіш. Кожны чалавек, як гэта было і будзе, клапоціцца пра свой дабрабыт сам. Нашчадкі ўспомняць нас добрым словам, калі мы станем разумнейшымі, больш гаспадарлівымі, ашчаднымі, зберажэм для іх жыццядайнай прыроду, пакінем ім сваю культурную — і матэрыяльную, і духоўную — спадчыну.

Без мовы — асновы культуры — гэтай спадчыны не будзе. У складанай сітуацыі, якая склалася ў Беларусі, абаронай мовы, яе адраджэннем павінны займацца не асобныя энтузіясты, а дзяржава. Добра, што ўрад рэспублікі прымае пэўныя захады ў такім кірунку. Але гэта яшчэ толькі першыя крокі. Аб'ём работы ў далейшым вырасце. Многае зараз залежыць ад непасрэдных выканаўцаў распрацаванай праграмы. Вельмі важна, каб гэтай надзвычай тонкай, далі-

катнай, нестандартнай працай займаліся кампетэнтныя, перакананыя людзі, каб жыццёва неабходнае пачынанне не ператварылася ў чарговую кампанію.

Напрыклад, як у некаторых месцах адносяцца да адкрыцця беларускіх класаў у школах з рускай мовай навучання. Для асобных кіраўнікоў галоўнае — адрапартаваць, што ў іх такія класы адкрыты. Але ж яшчэ патрэбен настаўнік, які выдатна валодае сам роднай мовай, які зможа па-сапраўднаму захапіць вучняў, патрэбны змястоўныя, з густам афармленыя падручнікі і дапаможнікі, нарэшце, вакол беларускіх класаў павінна быць атмасфера ўсеагульнай падтрымкі і добразычлівасці. Бо дзеці ёсць дзеці, і не выключана, што ў рускамоўным асяроддзі вучні адзінага беларускага класа могуць стаць аб'ектам насмешак, кпінаў, што будзе наносіць ім душэўныя траўмы. Такія выпадкі ўжо ёсць, пра гэта таксама трэба думаць, каб не адвярнуць ад важнай справы ні дзяцей, ні бацькоў.

Адкрыццё беларускіх класаў, груп у дзіцячых садках — наша сённяшняя рэальнасць, але гэта не вырашэнне праблемы. Патрэба хадзіць па кватэрах і агітаваць бацькоў адпадзе тады, калі беларускай мове будуць дадзены сацыяльныя гаранты!: адкрыюцца дзіцячыя сады і школы з роднай мовай навучання, яна спатрэбіцца пры паступленні ў вучылішчы, тэхнікумы і ВНУ і будзе там вывучацца, стане рабочай у дзяржаўных і грамадскіх установах і арганізацыях, знойдзе шырокі ўжытак у рабоце транспарту, прадпрыемстваў грамадскага харчавання, службы быту, гандлю, у афармленні гарадоў і населеных пунктаў, у выпуску самых розных тавараў і г. д.

Памылкі, несправядлівасць, дапушчаныя ў часы культу, валюнтарызму і застою, належыць выправіць, ліквідаваць усе перакосы ў нацыянальнай палітыцы, а таксама актыўна імкнуцца да максімальнага задавальнення духоўных патрэб людзей усіх іншых нацыянальнасцей, якія жывуць у рэспубліцы. Іншага шляху ў нас няма.

*Жнівень 1988 года*

## ГОД АБУДЖЭННЯ

***(Адказ на экспрэс-анкету газеты «Літаратура і мастацтва»)***

Жыццё чалавека саткана з розных нітак-падзей. Ёсць тут чырвоныя, але хапае і чорных. Якраз гэтыя колеры спрадвеку былі традыцыйныя на Беларусі, варта толькі паглядзець на нашы ручнікі, вышыванкі, посцілкі, дываны. Такім бачыцца мне адыходзячы высакосны год, які ўскалыхваў душу зрэдку радасцю, а найбольш болем. Пад змрочным крылом чарнобыльскай бяды, якое вісіць над нашаю

зямлёю, раёнамі Украіны, Расіі і засціць людзям белы дзень, жыць нялёгка. Як жахліва ўсведамляць, што ад лейкозу, лейкеміі паміраюць маленькія дзеці — наша надзея, наша нітачка неўміручасці, працягнутая ў будучыню! І яшчэ назаўсёдная стрэмка ў сэрцы — заўчасны адлёт у незваротны вырай таленавітай руплівіцы нашай паэзіі — светлай, узнёслай і мужнай Жэні Янішчыц. Як усё сплятаецца, сціскаецца ў адзін вузел! І не развязаць яго, і не рассячы...

Кожнай сваёй крывінкаю жыццё чалавечае крычыць, што яно надта крохкае, безабароннае, што людзі прыходзяць у гэты свет, каб сцвярджаць праўду і справядлівасць, каб думаць, любіць, ствараць. Але многія не чуюць той пранізлівы крык, абцяжарваюць падазрэннем, варожасцю, канфрантацыяй і без таго складанае сваё быццё. Пра гэта засведчылі і сумныя, і радасныя падзеі, якія адбыліся ў рэспубліцы. Галоўны іх урок у тым, што людзі перастаюць быць «вінцікамі» і «гайкамі», пачынаюць, хоць і марудна, але ўсведамляць сваю ролю ў пабудове новага жыцця. І гэта саграває надзеяй на лепшае.

Гады культу, валюнтарызму і застою нанеслі не толькі фізічныя, матэрыяльныя страты, але і падарвалі наша духоўнае, маральнае здароўе, што бачыцца сёння асабліва выразна. Але мы мусім знайсці сілы для Адраджэння. Вялікая праца павінна быць зроблена розумам і рукамі ўсенароднае сям'і, каб падняць эканоміку, вырашыць набалелыя нацыянальныя і сацыяльныя пытанні, перамагчы апатыю, абыякавасць, паказуху, бюракратыю, вярнуць чысціню зямлі, рэкам, лясам, адрадзіць родную мову, абудзіць у кожным чалавеку разуменне важнасці зберажэння і актыўнага засваення багатых культурных традыцый, духоўнай спадчыны Беларусі.

У гэтую працу ўносіць сваю, няхай сабе і сціплую, лепту рэдакцыя часопіса «Полымя». Радасна, што многія публікацыі года выклікалі чытацкую пошту, сталі прадметам абмеркавання, што вырас тыраж часопіса. Адбылося шмат чытацкіх канферэнцый, сустрэч супрацоўнікаў рэдакцыі і членаў рэдкалегіі з працоўнымі калектывамі, з настаўнікамі, студэнтамі, школьнікамі, якія праходзілі шчыра і зацікаўлена. Спадзяемся, што і ў новым годзе чытачы не будуць абыякавымі да твораў прозы, паэзіі, драматургіі, публіцыстыкі, крытыкі, якія мяркуе надрукаваць «Полымя».

Для мяне асабіста год, які падыходзіць да фінішу, быў багаты на падзеі і сустрэчы з цікавымі людзьмі, як у сваёй рэспубліцы, так і за яе межамі. Стварэнне «Мартыралогу Беларусі», гутаркі з працаўнікамі Віцебшчыны і Міншчыны, удзел у Шаўчэнкаўскім свяце ў Харкаве, у днях памяці Лесі Украінкі на Валыні, у «Варшаўскай паэтычнай восені» і літаратурных сустрэчах на Беласточчыне, паездка ў ФРГ, дзе

ішлі вострыя, але надзвычай карысныя дыскусіі, мацавалася супрацоўніцтва Беларускага камітэта абароны міру з актывістамі Хрысціянскай службы міру, якія пачулі з нашых вуснаў праўду пра чарнобыльскую катастрофу і зараз аказваюць дапамогу нашым людзям, далі мне шмат уражанняў, жыццёвага матэрыялу для асэнсавання. Думаю, што ўсё гэта не пройдзе бясследна, адгукнецца ў тых радках, якія просяцца на паперу.

*Снежань 1988 года*

## ДЭФІЦЫТ ПРАЎДЫ
### *(Чытаючы пошту «Чорнай былі»)*

Скажу шчыра, што не адразу згадзіўся на прапанову рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» падзяліцца сваімі развагамі пасля прачытання водгукаў чытачоў на маю паэму «Чорная быль», якая была сёлетняй вясною надрукавана ў штотыднёвіку. Стрымлівала тое, што ў кожным лісце выказваецца ўдзячнасць, прысутнічае ацэнка паэмы, дадзеная, як мне здаецца, з вялікім авансам, ёсць адрасаваныя асабіста мне такія спавядальныя, шчымлівыя і балючыя словы, якія не маю права выносіць на шырокую аўдыторыю. Я сардэчна дзякую ўсім, хто адгукнуўся, за сяброўскую падтрымку, за суперажыванне. У наш прагматычны і жорсткі час, калі пісьменніцкія трывога і боль у лепшым выпадку разбіваюцца аб глухую сцяну неразумення, а ў горшым, як часта адбывалася на працягу апошніх трох гадоў, асуджаюцца прадстаўнікамі афіцыйных колаў (крытыканства і ачарніцельства!), гэтая падтрымка вельмі важная і неабходная. Добрыя словы сумленных, неабыякавых да лёсу Беларусі людзей буду заўсёды берагчы ў сваёй душы.

Аднак у лістах, водгуках ёсць роздум, прапановы, меркаванні, якія заслугоўваюць таго, каб быць пачутымі многімі. Пра гэта і пойдзе гаворка.

Спачатку адкажу на пытанне: як пісалася паэма і чаму яна з'явілася толькі праз тры гады пасля трагічных падзей красавіка 1986 года? Яно паўтараецца ў многіх лістах.

Як і ўсе, у першыя дні пасля аварыі я валодаў той жа скупой інфармацыяй, з якой немагчыма было зразумець: што ж усё-такі здарылася? Толькі ў глыбіні душы расло шчымлівае адчуванне, што адбылося нешта надзвычай жахлівае і непапраўнае для ўсіх нас. І ў гэтым мяне пераканалі не наступныя звесткі, а найболей слёзы на вачах дырэктара Інстытута ядзерных даследаванняў АН БССР (зараз ужо былога — сумленнасць не праходзіць бясследна!) Васіля Барыса-

віча Несцярэнкі, як і ішоў з нарады ў ЦК КПБ. Гэты шчыры, добры чалавек і таленавіты вучоны, лепш за іншых разумеючы памеры і будучыя вынікі аварыі, папярэджваў, пераконваў, прасіў... Канешне ж, цяжка напачатку ва ўсім разабрацца, усё прадугледзець, але да голасу вучоных і некаторых вайскоўцаў, якія думалі пра бяспеку людзей і лічылі, што закрытую зону неабходна пашырыць, трэба было прыслухацца. Ход падзей пацвердзіў гэта. За першым адсяленнем было другое, трэцяе. І сёння зноў паўстала пытанне аб новым адсяленні тысяч людзей з небяспечных месцаў.

Сваё адчуванне цяжару, які лёг на плечы беларусаў, я выказаў адразу, яшчэ ў маі 1986 года, у адным з раздзелаў паэмы «Кульмінацыя». Але гэта быў толькі пачатак.

Потым, у першае чарнобыльскае лета, мне давялося быць у Хойніцкім раёне, сачыць за тым, як ідзе дэзактывадыя будынкаў школ, дзіцячых садкоў, бальніц і іх тэрыторый. Набліжаўся новы навучальны год, а многія дзеці засталіся ў забруджанай мясцовасці, і трэба было ў тых надзвычай цяжкіх умовах, хоць крыху, зменшыць рызыку, якой яны падвяргаліся.

У час паездак па раёне давялося ўбачыць тое, што скаланула, перавярнула ўсю маю душу. Вось толькі некалькі эпізодаў. На адхоне гасцінца пастаўлены сінія шыльды: «Не сыходзіць! Небяспечна!», а побач у стаўку купаюцца, качаюцца па цёплым пяску дзеці... Звярнулі на лясную дарогу. Ідуць малыя, у руках кошыкі з грыбамі, вусны ў чарнічным соку. Спыніліся, пачалі гаварыць: «Што ж вы робіце, дзеткі? Няўжо вы не ведаеце, што нельга збіраць грыбы і ягады?» Смяюцца: «А нічога!» Паказваюць сваё грыбное багацце. А баравікі і сапраўды такія крамяныя, прыгожыя...

У вёсцы стаіць калона нагружаных машын. Плач, галашэнне жанчын такія, што зараз, здаецца, абваліцца неба. А мужчыны маўчаць, кураць, толькі вочы і ў іх чырвоныя, не стрымаць слязы. І ніяк калона не можа выправіцца ў шлях...

У тыя дні, як гэта і бывае ў трагічны час, было рознае. Была сапраўдная самаадданасць, нават самаахвярнасць, і радавых працаўнікоў, і многіх партыйных, савецкіх, гаспадарчых кіраўнікоў. Але хапала абыякавасці і безадказнасці. Прывяду адзін прыклад. Дазіметрысты зрабілі замеры ў Глінішчах. Толькі ўчора правялі салдаты дэзактывацыю, а прыборы паказваюць, што радыяцыйны фон у 3-4 разы вышэйшы за нармальны. Пачалі высвятляць. Аказваецца, вайскоўцы, каб не абцяжарваць сябе вывазкаю забруджанага грунту, узялі плуг, упрэгліся ў яго, перааралі і забаранавалі прышкольны

ўчастак, праклалі танюсенькія асфальтавыя дарожкі да будынка школы і паехалі. А ўся радыеактыўная пошасць засталася.

Няёмка адчуваў я сябе і на пасяджэннях рэспубліканскага штаба па ліквідацыі вынікаў аварыі. Прадстаўнікі міністэрстваў, ведамстваў спрачаліся да хрыпаты, перакідвалі адказнасць са сваіх плячэй на чужыя, не саромеліся займацца падтасоўкаю і падманам, замест таго, каб зладжана, эфектыўна працаваць. Да сённяшняга дня ў мяне засталося непрыемнае ўражанне ад тых спрэчак.

Пабачыў і перажыў многае, а вось пісаць адразу не змог. Настолькі ўсё гэта было жахлівае, недарэчнае, недзе за межамі чалавечага ўяўлення пра бяду. З тым і жыў. А потым душа не вытрывала, выбухнула.

Магчыма, апошнім штуршком стала сустрэча ў красавіку 1988 года ў час вучобы на курсах у Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС з міністрам аховы здароўя СССР Я. І. Чазавым. Паслаў яму пісьмовае запытанне: «Што будзе з нашымі дзецьмі, якія жывуць у забруджанай мясцовасці Гомельскай і Магілёўскай абласцей, і якія меры прымаюцца для таго, каб захаваць іх здароўе?» Міністр спакойна адказаў: «Вось тут рэдактар беларускага часопіса турбуецца пра здароўе дзяцей Гомельскай і Магілёўскай абласцей. Хачу яму адказаць так: вашы дзеці развіваюцца нармальна, іх здароўе нават лепшае, чым у дзяцей іншых рэгіёнаў краіны». Я не задаволіўся такім адказам і паслаў новую запіску, дзе папрасіў Яўгена Іванавіча не адмахвацца ад пытання і адказаць сур'ёзна і грунтоўна. Было бачна, што міністр заззлаваў, але зноў без усялякага сумнення паўтарыў тое ж самае. А міністэрства ж валодала інфармацыяй!

Нават акадэмік Ільін, які не вельмі спагадае беларусам, вымушаны быў прызнаць, што 30 тысяч нашых дзяцей могуць апынуцца ў надзвычай цяжкім стане. А міністр аховы здароўя быў спакойны на гэты конт.

Аркадзь Віктаравіч Плотнікаў з г. Ласіна-Пятроўскага Маскоўскай вобласці піша: «Вы напамінаеце чытачам, што кожны чалавек адказны за свой лёс, за свае ўчынкі». Справядлівыя словы. Было б добра, калі б імі заўсёды кіраваліся тыя, хто ў адказе не толькі за сябе, але і за лёс мільёнаў людзей. Ды жыццё паказвае, што так бывае не заўсёды. Нават у трагічны, вырашальны час знаходзяцца людзі, для якіх лёс цэлага народа, у тым ліку жыццё сваіх дзяцей і ўнукаў, менш важныя, чым кар'ера, уладкаванасць і асабісты спакой. Патурбаваць начальства для такіх людзей — страшней, чым Чарнобыль з яго радыёактыўнымі ёдам, цэзіем, стронцыем, плутоніем, ліцием і г. д.

Вось чаму дакладная інфармацыя не магла прабіцца праз афіцыйныя заслоны. Тры гады ва ўсесаюзным і рэспубліканскім друку, па тэлебачанні і радыё не гаварылася праўдзіва аб становішчы ў раёнах Беларусі, якія пацярпелі ад аварыі, працягваліся шапказакідальніцтва і лакіроўка. Нават Валянцін Распуцін, актыўны змагар за экалагічную чысціню, ды і многія іншыя рускія літаратары, з якімі мне давялося сустрэцца ў Маскве на з'ездзе пісьменнікаў РСФСР, пасля майго аповеду пра чарнобыльскую бяду былі збянтэжаны: «Няўжо гэта настолькі жахліва? Чаму ж мы не ведаем праўды?»

Так, нягледзячы на перабудову, галоснасць і дэмакратызацыю нашага грамадства, мы ўсё яшчэ адчуваем дэфіцыт праўды. Гэта датычыцца самых розных сфер жыцця, у тым ліку і чарнобыльскай трагедыі.

Нават самая маленькая мана — з'ява амаральная, яна можа абярнуцца вялікай бядою. Гэтай ісціне нас з малых гадоў вучаць у сям'і, у школе. А як быць з той манаю, цана якой — жыццё і здароўе людзей?

А такой маны апошнім часам хапала. На сустрэчы з партыйнымі, савецкімі кіраўнікамі рэспублікі, якая адбылася паўтара года назад у ЦК КПБ, дзе мне давялося быць, пісьменнікі спыталі: «Ці трапляе забруджанае мяса на стол людзям? Ці ёсць нейкі кантроль, праверка прадуктаў?» Прагучала клятвеннае запэўніванне, што быць не можа, каб забруджанае мяса спажывалася. Нават так было сказана: «Ніводнага грама! Даю галаву на адсячэнне!» А праз тры дні, відаць, каб поўнасцю супакоіць літаратурную грамадскасць, у СП Беларусі была наладжана спецыяльная сустрэча па чарнобыльскіх праблемах з прадстаўнікамі міністэрстваў, ведамстваў, вучонымі, гаспадарнікамі. І на ёй, загадзя не праінструктаваны, адзін з кіраўнікоў рэспубліканскага аграпрома на наша аналагічнае пытанне адказаў так: «Было. Некаторы час змешваліся чыстае і забруджанае мяса пры вырабе кілбас. Але вытрымліваўся дапушчальны ўзровень. Зараз гэта спынена». Вось табе і на!

Або сітуацыя з будаўніцтвам Беларускай АЭС. Ішлі пошукавыя работы, перакідка яе з месца на месца. Грамадскасць рэспублікі, улічваючы надзвычай складаную экалагічную сітуацыю ў Беларусі, палічыла амаральным, кашчунным і недапушчальным такое будаўніцтва. Беларускія пісьменнікі, у тым ліку і я, выступілі з трывожным пісьмом у «Литературной газете». І адразу ж пачаліся ў іх адрас папрокі, сцвярджалася, што зноў крыкуны ўносяць смуту, бударажаць народ, а ніякай атамнай станцыі і не мяркуецца будаваць. А потым рэспубліканская прэса друкуе ўрадавую пастанову, дзе

чорным па белым пішацца аб спыненні пошукавых работ на месцы будаўніцтва АЭС.

Пералік гэты можна доўжыць. Замест таго, каб па-чалавечы, праўдзіва і разумна павесці гаворку з людзьмі, расказаць ім пра аб'ектыўныя цяжкасці, пра немагчымасць адразу вырашыць складаныя праблемы, часта на сустрэчах зачытваліся шпаргалкі з лічбамі. Нашы людзі спагадлівыя і надзвычай цярплівыя. Яны многае разумеюць і трываюць. Але маны яны не могуць даравань. Вось чаму ў свой час падняліся Ельск і Нароўля.

Чытаю пісьмо Я. А. Кудраўцава з Быхава і разумею яго перажыванні: «Што б ні паказвалі аналізы і ні гаварылі ўрачы, а дзесьці там, углыбіні сябе, ёсць нехта мудры і ўсёведаючы. І калі добра прыслухацца да сябе, можна атрымаць адказ на многія пытанні. І я задаю гэта пытанне таму мудраму, усёведаючаму пра мінулае, цяперашняе і будучае: колькі часу засталося нам? Што будзе з намі і з нашымі дзецьмі? Можа, гэта радыяфобія, боязь і ніякай небяспекі няма? Пытанне зададзена, я ўключаю «Лунную сонату» (пад музыку металістаў нічога не ўчуеш), і мне здаецца, што я чую ціхі адказ: «Гадзіннік пушчаны». Я зноў прыслухоўваюся і зноў хачу пачуць адказ. Мне хочацца жыць спакойна, не хваляваццa, хадзіць у грыбы, на паляванне, мець яшчэ двух дзяцей, жыць шчасліва, так, як мы жылі да мая 1986 года. Але зноў з глыбіні самога сябе прыходзіць бязлітасны і жорсткі адказ.

Сёння трэба зрабіць усё, што можна, каб праз дзесяць, дваццаць, трыдцаць, пяцьдзесят гадоў нашы нашчадкі не клялі нас, нашу бязмозгласць і тупасць.

Чаму я павінен верыць афіцыйным, запозненым на гады адказам, калі столькі разоў нас ашуквалі і зневажалі?»

Адно пісьмо непадобнае на другое, але ва ўсіх боль і неспакой. Таццяна Іванаўна Гурэцкая з Мінска прапануе: «Я лічу, што трэба кожны год адзначаць жахлівую трагедыю ў жыцці нашага народа. Дарэмна чакаць, што з гэтай ідэяй выйдзе да народа ўрад. Трэба беларускаму народу патрабаваць, каб 26 красавіка было днём смутку і жальбы нацыі». Пісьмо Таццяна Іванаўна прыслала мне менавіта ў гэты самы дзень. Прайшло колькі часу, і яе словы знайшлі падтрымку ў выступленні Ніла Гілевіча на сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

У пісьмах думка аўтараў перакідваецца на іншыя, але таксама важныя праблемы. Прашу не палічыць гэта за нейкую самарэкламу, але хочацца працытаваць словы аўтамеханіка Віктара Трусевіча з Нясвіжскага раёна: «У лістападзе 1986 года мне давялося пабываць у некаторых раёнах, пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі. Многае там

убачыў, многага тады яшчэ не разумеў. Але нават за тыя два тыдні, якія там знаходзіўся, я столькі не перажыў, не перахваляваўся, колькі чытаючы вашую паэму. «Чорная быль». Думаю той, хто чытаў гэтую рэч, не застаўся абыякавым ці раўнадушным. Вось бы паболей такіх твораў. Тады б, можа, у нашых кнігарнях і не стаялі б так самотна на паліцах кнігі беларускіх аўтараў, не пыліліся б».

І мне, і ўвогуле ўсім нам, літаратарам, ёсць тут над чым задумацца.

Чарнобыльская бяда закранула сваім чорным крылом усіх нас. Зараз насельніцтва рэспублікі ўважліва сочыць за тым, якія прымаюцца захады, каб ўратаваць тых людзей, што знаходзяцца на забруджанай тэрыторыі. Многае ўжо зроблена, але наперадзе шмат вялікае працы. Мы верым, што ўсё-ткі ў самы бліжэйшы час Вярхоўны Савет СССР разгледзіць і зацвердзіць прынятую Вярхоўным Саветам БССР Дзяржаўную праграму па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на 1990-1995 гады. Чытачы паэмы ў сваіх лістах справядліва абураюцца: «Чаму Беларусь павінна несці страты? Саюзны ўрад, Міністэрства атамнай энергетыкі павінны кампенсаваць увесь урон, нанесены беларускаму народу. Але падлікаў гэтага ўрону дагэтуль няма, нават самых прыблізных. Ды і ці падлічыш, які ўрон нанесены генафонду народа?»

А ў гэты час Міністэрства атамнай энергетыкі забірае на свае патрэбы мільёны ад той сумы грошай, якія збіраліся, як кажуць, па капейцы ў фонд пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі ўсімі людзьмі — і тымі, хто працуе, і пенсіянерамі, школьнікамі. Што можа быць больш амаральнае, чым гэта?

У многіх пісьмах гаворыцца пра неабходнасць паляпшэння медыцынскага абслугоўвання, пра магчымасць мець асабістыя дазіметры, пра тое, што людзі ў кантралюемых зонах, ды і па ўсёй рэспубліцы, павінны валодаць штодзённа інфармацыяй пра радыяцыйную сітуацыю.

Я разумею ўсёй душою трывогу і заклапочанасць чытачоў. Марудзіць нельга, кожны лішні дзень для людзей, якія больш трох гадоў жылі і працавалі на забруджанай зямлі, можа стаць крытычным. І ў першую чаргу гэта датычыць здароўя дзяцей. На 1 студзеня 1989 года ў раёнах Гомельскай і Магілёўскай абласцей у зоне жорсткага санітарнага кантролю знаходзілася 112 школ з 16258 вучнямі, 89 дзіцячых садкоў з 6021 выхаванцам, 2 школы-інтэрнаты, 2 вучылішчы. Усяго больш чым 23 тысячы дзяцей.

Трэба сказаць людзям праўду да канца, без усялякіх агаворак. Тады яны змогуць зрабіць правільны выбар. У рэшце рэшт усю хворую зямлю давядзецца рана ці позна пакінуць.

Наш жорсткі час патрабуе выключнай шчырасці, сумленнасці ў словах і ўчынках. Самы небяспечны дэфіцыт у грамадстве — гэта дэфіцыт праўды. Пакуль ён застаецца, ні з якімі іншымі — прадуктовымі, прамтаварнымі і г. д. — дэфіцытамі нам не саўладаць.

Трагедыя наша мае пачатак, але канца яе не відаць. Вучонымі зроблены і апублікаваны падлікі, што толькі па цэзію колькасць радыяцыі, якой падвергліся мільёны людзей, вымяраецца, як уздзеянне ад 150 да 300 атамных бомбаў, такіх, што была скінута на Хірасіму. Ніхто не можа пранікнуць у наступнае, сказаць, што будзе.

Бяда, якая абрынулася на беларускую зямлю і народ, жахлівая, зацяжная і няўмольная. Яна будзе доўгі час падточваць і фізічнае, і маральнае здароўе людзей. З ёю давядзецца жыць сённяшнім пакаленням беларусаў, нашым дзецям, унукам, праўнукам... Бяда гэтая вымагае не толькі вялікіх матэрыяльных выдаткаў (і ўсе мы павінны не шкадаваць спагады і міласэрнасці, унесці сваю лепту), але і неймавернай унутранай сабранасці, мужнасці і трываласці, духоўнага яднання ўсяго народа, каб выстаяць, выжыць, не згінуць як нацыя назаўсёды. Веру, што такому яднанню дапаможа абуджэнне нацыянальнай свядомасці, актыўная праца па адраджэнню роднай мовы, культуры, традыцый, зберажэнню і памнажэнню нашай унікальнай спадчыны. Ніхто за нас гэта не зробіць, толькі мы — ад малога да старога, усёй народнай сям'ёю.

На заканчэнне хачу прывесці словы з ліста дарагога і мілага майму сэрцу чалавека, светлай, пяшчотнай і мужнай нашай паэткі Ніны Мацяш: «Што ж, мусім жыць, і пакутваць, і выстойваць, і верыць у лепшае. І як умеем, і чым можам набліжаць гэтае лепшае. Будзь! Будзьма!»

Дык будзьма ж, беларусы!

*Лістапад 1989 года*

## НЕЛЬГА ЖЫЦЬ ДУШОЮ КВОЛЫМІ

Размову пра тое, якім убачаць часопіс «Полымя» нашы чытачы ў новым годзе, хачу пачаць нетрадыцыйна. Спачатку прапаную для роздуму дзве лічбы. У 1986 годзе тыраж часопіса быў сем тысяч экземпляраў (на такім узроўні ён трымаўся доўгі час), а зараз — 9500. Павялічваецца колькасць чытачоў за межамі рэспублікі. Пра гэта

сведчаць лісты з прапановамі, меркаваннямі, водгукі на публікацыі часопіса. Гэты, хай сабе і не такі ўжо значны, зрух паказвае, што часопіс выходзіць на вострыя праблемы нашага часу, друкуе мастацкія творы, якія прыцягваюць увагу, хвалююць людзей.

Можна было б радавацца, калі б не адна сумная акалічнасць. Цікавасць да часопіса за межамі Беларусі расце хутчэй, чым у сябе дома. Нягледзячы на вялікую прапагандысцкую, папулярызатарскую работу, якую супрацоўнікі часопіса і наш аўтарскі актыў праводзяць праз тэлебачанне і радыё, праз масавы друк, у час рэгулярных сустрэч на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, у маладзёжных клубах, студэнцкіх і вучнёўскіх аўдыторыях, колькасць падпісчыкаў павялічваецца вельмі марудна.

Асноўнае, што стрымлівае рост падпіскі, — гэта моўная сітуацыя ў Беларусі. Многія людзі на сустрэчах са шкадаваннем прызнаюцца, што ні гаварыць, ні нават чытаць на роднай мове не ўмеюць, а таму не могуць знаёміцца з новымі літаратурнымі творамі ў арыгінале, чакаюць іх публікацыі на рускай мове. Можна было б папракнуць у гэтым іх саміх, ды трэба ўлічваць тыя неспрыяльныя моўныя ўмовы, у якіх вырастала не адно пакаленне беларусаў. У допісах, напоўненых болем і трывогаю, нашы чытачы сцвярджаюць, што трэба неадкладна вырашаць гэтую праблему, што беларуская мова ў рэспубліцы павінна стаць дзяржаўнаю і клопат пра яе адраджэнне — справа дзяржавы. Нельга не пагадзіцца з такімі думкамі. Намаганні энтузіястаў і захады касметычнага парадку не змогуць змяніць сітуацыю. Усім беларусам трэба зразумець, што адраджэнне роднай мовы, культуры — гэта не прыхамаць пісьменнікаў, прадстаўнікоў БНФ, а кроўная справа кожнага, пытанне жыцця або смерці нацыі.

Сёння нельга жыць душою кволымі. Два Чарнобылі — моўны, духоўны і экалагічны, радыяцыйны, якія прыгнятаюць Беларусь, зліваюцца ў адно цэлае. Каб выстаяць, трэба ўбачыць незашоранымі вачыма гісторыю нашага гераічнага, самаахвярнага і працавітага народа, адчуць усім сэрцам, што ён заслугоўвае лепшае долі, каб жыць паўнакроўна, справядліва, разумна і шчасліва.

Калектыву рэдакцыі часопіса працаваць зараз няпроста. Мы разумеем, што чытач стаў іншым. Ен не будзе губляць свой час на нешта агульнае, трафарэтнае, далёкае ад сённяшніх, надзвычай складаных праблем жыцця. Таму рэдакцыя часопіса займае прынцыповую, цвёрдую пазіцыю да тых рукапісаў, дзе пануе другаснасць, шэрасць, вяласць мыслення і пяра, мастацкая недасканаласць, бо брак у літаратуры, як і ў Любой іншай сферы чалавечай дзейнасці, дорага ўсім нам абыходзіцца. А з другога боку — поўны давер да

таленавітых аўтараў, актыўная падтрымка твораў вострых, палемічных, нязвыклых у пастаноўцы і мастацкім вырашэнні праблем і тэм шлях якасных твораў да чытача павінен стаць як мага карацейшым, бо таленавітыя пісьменнікі ў працэсе напісання растрачваюць столькі энергіі і сілы, што іх ужо не хапае на «прабіванне» перастрахоўшчыкаў.

З улікам чытацкай зацікаўленасці плануем сваю працу ў новым годзе. Аматараў прозы чакае сустрэча з новымі раманамі, аповесцямі і апавяданнямі Васіля Быкава, Янкі Брыля, Вячаслава Адамчыка, Анатоля Кудраўца, Віктара Казько, Віктара Карамазава і іншых.

Пад рубрыкай «З літаратурнай спадчыны» мяркуем надрукаваць раздзелы з трэцяй кнігі рамана Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», неапублікаваныя творы Кузьмы Чорнага, Лукаша Калюгі, Уладзіміра Хадыкі, Сяргея Астрэйкі.

У раздзеле паэзіі выступяць Максім Танк, Пімен Панчанка, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Васіль Зуёнак, Анатоль Грачанікаў, Анатоль Вярцінскі, Алесь Звонак, а таксама маладыя паэты.

Будуць надрукаваны артыкулы Пётры Садоўскага «Мова ў нашым тэатры», Міколы Ермаловіча «Слова пра «Нашу ніву», матэрыялы іншых аўтараў у дапамогу настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, выкладчыкам ВНУ.

Пад рубрыкай «Вяртанне» змесцім творчыя партрэты рэпрэсіраваных пісьменнікаў, а таксама іх творы. Думаю, што з вялікім душэўным хваляваннем будуць прачытаны спавядальная аповесць Сяргея Грахоўскага «Зона маўчання» успаміны былых вязняў сталінскіх лагераў Віктара Касперскага і Ядвігі Бяганскай.

У раздзеле «Публіцыстыка» мы павядзем гаворку пра тое, што ўсе нашы эканамічныя, сацыяльныя, маральныя праблемы знітаваны з нацыянальнымі, духоўнымі, сціснуты ў адзін вузел. І вырашаць іх трэба адначасова. Без абуджэння нацыянальнай годнасці, без уздыму духоўнай культуры мы не зможам дамагчыся сапраўднай культуры працы, быту, узаемаадносін паміж людзьмі.

Словам, пошукі працягваюцца, усе нашы намаганні скіраваны на тое, каб часопіс быў патрэбным людзям, будзіў думку, грамадзянскую і працоўную актыўнасць чытачоў.

*Кастрычнік 1989 года*

## СЦЕЖКА ПРАЗ ЖЫТА

Так здарылася, што ў вёсцы Слабада, у хаце, дзе я нарадзіўся, не давялося пажыць мне нават года. Ды і хата была не свая. Доўгі час пасля вайны настаўніцкая доля (бо перш чым працаваць у школе, трэба было яе пабудаваць!) перакідала маіх бацькоў з месца на месца, і туліцца ім з дзецьмі даводзілася то ў адных гаспадароў, то ў другіх, або ў цесных прыбудовах і пакойчыках пры школах. Былі тыя школы не такія, як сённяшнія цагляныя светлыя гмахі, а драўляныя, злепленыя з бярвення ацалелых даваенных свірнаў, пунь, хлявоў, толькі дзенідзе з большага ў подрубе падноўленыя свежым дрэвам.

Пазамінулым летам разам з мамаю, якая даўно ўжо хацела паказаць месца, дзе пачулася маё першае кугаканне, і з маім швагрусём Віктарам завіталі мы ў Слабаду, пастаялі на яе адзінай вуліцы ля сціплай хаціны. Мы з Віктарам моўчкі курылі, а мама ўсё ўглядалася, абмацвала вачыма кожную драбніцу гэтай будыніны, пакуль у яе на вачах не з'явіліся слёзы. Праз нейкі час мы паехалі далей. Я разумеў пачуцці мамы. У гэтых мясцінах, у вёсцы Хоціна, прайшло яе маленства, дзявоцтва, тут у час фашысцкай акупацыі ў маі 1942 года ў тыфусе, у непрытомнасці нарадзіла яна — партызанская сувязная — свайго першынца — майго старэйшага брата Міхася, а ў Галях услед за мною з'явіліся на свет Алёна і Валерый. І канешне ж, для мамы хата ў Слабадзе, няхай сабе і чужая, засталася дарагою часцінкаю жыцця. А я, скажу шчыра, не адчуў у душы нейкай асаблівай узрушанасці, смутку альбо радасці ад гэтых адведак. Калі нічога сам не помніш, то чым зачэпіць сэрца нават такі куток. Была простая чалавечая цікаўнасць, і не болей таго.

А вось Галі, невялічкая вёсачка, якая стаіць пры бальшаку з Вулы на Сокарава, дзе маці працавала настаўніцай пачатковых класаў, а бацька — дырэктарам сямігодкі, запомнілася добра. Тут жыццё, неабдымны, вялікі свет абрынулі на мяне безліч пахаў, гукаў, фарбаў, падарылі мноства прыгод. Вясна — гэта сакавіцкія раўчукі, па якіх мы пускалі папяровыя і робленыя з кары караблікі, а затым вялізныя воблакі бухматага, духмянага бэзу ля школы, якія, як мне здавалася, апускаліся на зямлю проста з высокага майскага неба; лета — купанне ў варонках ад авіяцыйных бомбаў, бо ні рэчкі, ні возера, ні стаўка блізка не было, адкуль вылазілі мы, малыя, страшныя, як чарцяняты, яшчэ больш брудныя, чым раней; восень — першыя, такія цудоўныя кніжкі, прыладжваешся на падваконні, дзе святлей, і чытаеш пад пошум дажджу; зіма — расчырванелыя, як снегіры, заліваем горку,

будуем крэпасці, хады пад сумётамі, і дзівішся зараз — колькі ў тыя гады было снегу, а дзе снег, там і смех, і весялосць, і здароўе.

А самы патаемны і зацішны, самы непадуладны часу, неазмрочаны наступнымі клопатамі, будзённаю сумятнёю куточак у маёй душы знайшла і займае сцяжына з Галяў у Хоціна. Я добра помню яе босымі нагамі, шырока адкрытымі вачамі, наіўным, шчырым дзіцячым сэрцам і спадзяюся, што яна таксама помніць мяне. Пачыналася гэтая сцяжына адразу за пыльнай шасэйкаю, злева ад яе ў густой траве ляжаў агромністы валун — дарунак завітаўшага сюды ў далёкія часы ледавіка, а за ім — сцяною стаяла жыта. Не ведаю чаму, але заўсёды сцяжына згадваецца мне жнівеньскаю парою, у пачатку прыемнае хлебаробскае працы. Вось старэйшы брат Міхась, які бяжыць паперадзе, а затым і я ныраем у тунель, пракладзены між высокіх сцяблін, і нясемся, нясемся, што ёсць моцы, звонка галёкаючы ад нейкае невядомае радасці. Штанцы ў нас падкасаныя, каб не заміналі калошы, кашулі наросхрыст, каб грудзі халадзіў сустрэчны вей-ветрык. За полем з высокага пагорка сцяжына апускаецца да ручая. І хоць нам даручана важная справа — мы пасланы да бабулі па хлеб, бо ў нас скончыўся, а яна павінна сёння спячы, ды як не прыпыніцца ля саржавелых фашысцкіх танкетак, якія ўціснуліся ў дол, звесілі свае дзюбы-ствалы ў густую крапіву. Залазім у люкі, кратаем розныя жалезкі, уяўляем сябе танкістамі, якія захапілі непрыяцельскую зброю і вядуць па іх жа — фашыстах — знішчальны агонь. Уволю нагуляўшыся, бяжым далей. За лагчынаю, густа зарослай хмызам, бачны ўжо могілкі, далей свеціцца блакітам возера, а там і Хоціна.

У бабулінай хаце хораша пахне свежым хлебам, прывялым аерам. Яна аж свеціцца ад боханаў, якія радком «усселіся» на шырокай лаве. Бабуля пры нас пакрапіла іх вадою, каб скарынка была мяккаю, пагладзіла кожны, як малога па галоўцы, ласкаваю даланёю, накрыла ручніком. «Пагадзіце крыху. Хутка дойдуць. А я вам, унучкі, наллю малачка з тваражком, ды і пагукаю», — кажа яна. Мы ўвішна сёрбаем і адказваем на бабульчын роспыт пра наша жыццё-быццё. А потым просім яе расказаць што-небудзь. Найбольш любілі мы слухаць пра земляка, славутага конніка, героя вайны Льва Міхайлавіча Даватара. Пра ягоныя баявыя подзвігі чулі ў школе. А бабуля жыла па суседству з ім і добра помніць героя яшчэ Лёўкам-свавольнікам, атаманам вясковых хлапчукоў. Дзед у яго быў суровы, не любіў розных штукарстваў і за правіну запіраў Лёўку нанач у аўчарню разам з баранамі і авечкамі. «Характар у Лёўкі быў ужо і тады. Хоць баіцца,

але трывае, не папросіцца, каб выпусцілі», — з усмешкаю распавядае бабуля.

Мы б слухалі і далей, але яна падымаецца з услона, кладзе хлеб у торбу і кажа: «Бяжыце, унучкі, дахаты. Зачакаліся вас. І ў мяне клопату вунь яшчэ колькі...»

І зноў сцяжына. Там, дзе ўтаптаная гліна, яна халодзіць, а там, дзе сыпучы пясочак, цалуе ласкавым цяплом нашыя босыя ногі...

Помняцца і сур'ёзныя засмучэнні, якія, аказваецца, здараюцца нават у пяць гадоў. Мама, калі ўбачыла маю цікавасць да кніг, да вучобы, а магчыма, найперш таму, што не было на каго пакінуць мяне, дазволіла быць на ўроках. У журнал не запісвала, да дошкі не выклікала, ацэнак не ставіла. Але ў мяне былі свае кніжкі, сшыткі. Сядзеў я ціха, не перашкаджаў, рабіў тое, што рабілі сапраўдныя вучні, і ўсё было б добра, калі б аднойчы не завітаў з праверкаю ў школу загадчык аблана. У той дзень мама не пусціла мяне ў клас, загадала сядзець дома. Але дзе ж вытрываеш, і я ўцёк, пачаў сноўдаць пад вокнамі, горка плачучы. Гняла страшэнная крыўда. Я разумею зараз, што адбывалася і ў мамінай душы, як цяжка было ёй весці той паказальны ўрок. Ды на яе і маю радасць, загадчык аблана быў добры, спагадлівы чалавек. Ён папытаў, хто гэта скуголіць пад вокнамі, а потым, дазнаўшыся, доўга рагатаў і, ад'язджаючы, пры развітанні сказаў маме: «Запісвайце яго ў журнал, не бойцеся. Хай хлопец вучыцца!»

Можа, мне здаецца, але тады было яшчэ нейкае недзіцячае адчуванне безабароннасці людзей прад страшнай цёмнай сілаю. З таго жыцця, якое пахла папялішчамі, апякала слязамі ўдоў і сірот, якое было галоднае і халоднае, населенае страхам, злавесным начным гудам «чорных воранаў», але ўдзень агучанае бадзёрымі песнямі і маршамі, многае стала зразумелым мне значна пазней. Ды нешта засталося і ў маленькім сэрцы.

Шпіёнаманія, падазронасць, якія надоўга атруцілі розум многіх людзей, падштурхнулі аднойчы дарослых мужчын на поўным сур'ёзе лавіць старую, якая хадзіла па вёсках і жабравала. Бедная жанчына, не разумеючы чаго ад яе хочуць, чаму за ёй ганяюцца, узлезла па драбінах на гарышча школы, схавалася там у куток і не хацела злазіць. Мужчыны, якімі кіраваў сельсавецкі начальнік, звалаклі яе з гарышча і пад аховаю павезлі ў Вулу. Усё гэта рабілася на вачах дзяцей, і мы ніяк не маглі ўцяміць, чаму гэтая, апранутая ў рыззё старая — шпіёнка, нам так было яе шкада...

Успамінаецца і сакавіцкая раніца 1953 года, калі па радыё паведамілі пра смерць Сталіна. Мы, малыя, сядзім на ложку, яшчэ не зусім

ачомаўшыся ад сну, а ў нашым цесным пакойчыку сабралася амаль усё школьнае настаўніцтва. Плачуць, галосяць жанчыны: «Што ж цяпер будзе? Што з намі будзе?» Адзін толькі бацька не плакаў. Ён глядзеў у вакно і маўчаў. Ягонае маўчанне, той спакойны выраз твару ў кантрасце з усеагульнай разгубленасцю я зразумею пасля. У другой палове пяцідзесятых гадоў быў поўнасцю рэабілітаваны старэйшы брат бацькі — беларускі паэт Сяргей Ракіта (Сяргей Васілевіч Законнікаў), і тады тата змог расказаць пра жахлівыя падзеі, пра пакуты ўсёй іхняй сям'і, змог звярнуцца з просьбаю даць афіцыйнае заключэнне аб смерці Сяргея Ракіты, аб'явіць усесаюзны росшук братавага маленькага сына Валерыя, які згубіўся ў час бамбёжкі Мінска ў першыя дні вайны. Але пошукі нічога не далі, і зараз невядома, як і калі загінуў, дзе пахаваны мой дзядзька, у памяць якога бацька назваў мяне Сяргеем, што сталася з Валеркам...

Так жыццё звязвае ў вузел і светлае, і трагічнае. А час бяжыць. Больш паловы жыцця ўжо за плячыма. Мне давялося прайсці многімі сцежкамі-дарогамі і па Беларусі, і па далёкіх землях. Але тая сцяжына з Галяў у Хоціна ў мяне — адзіная. Згадаеш яе, і радасцю адгукаецца душа. Спакойнае і добрае, як мамін твар, жнівеньскае сонца, цёплыя каласы, якія сваімі вусамі казычуць шчокі, сінія вочы васількоў, а пад босымі нагамі здаровая, надзейная зямля... І так часам захочацца забыцца на ўсё, адкінуць прэч сумятню, непрадбачанасць будучыні, чарнобыльскі цяжар, які ўзваліўся на плечы, і вярнуцца туды, дзе бяжыць рыжы, у вяснушках хлапчук сваёй сцежкаю праз высокае, вечнае жыта.

*Красавік 1990 года*

## НАШ ПАРАТУНАК — АДРАДЖЭННЕ

***(Выступленне на стадыёне «Дынама» ў Мінску на мітынгу, прысвечаным чацвёртай гадавіне чарнобыльскай трагедыі)***

Шаноўныя сябры!

Сваё выступленне я пачну з радкоў, якімі адкрываецца мая апошняя кніга паэзіі:

Дзе ўзяць той мёртвай і жывой вады,
Каб імі пакрапіць маю зямлю?
І мушу,
як замову ад бяды,
Шаптаць адно-адзінае: «Люблю...»

Так, усе мы, каго сёння тут сабралі глыбокі боль і святая памяць, любім родную Беларусь, жадаем ёй і свайму народу дабра і шчасця. Мы любім сваю прыгожую і шчодрую, але такую здратаваную, знявечаную зямлю яшчэ мацней цяпер — пад знакам новай жахлівай бяды. З гэтай бядою давядзецца жыць усім нам, нашым дзецям, унукам, праўнукам і многім-многім пакаленням беларусаў. Такі цяжкі крыж выпаў на нашую долю. І невыпадкова.

Злавеснае святло, якое ўспыхнула ў красавіку 1986 года над Чарнобылем, высвеціла ў нашым грамадстве многае: шматгадовыя абыякавасць і нядбальства, татальныя хлусню і дэмагогію, разумовыя ляноту і шэрасць — усё гэта, на вялікі жаль, стала нормаю жыцця. Страшэнная катастрофа, што абрынулася на нас усім сваім неймаверным цяжарам, — гэта таксама вынік масавай бездухоўнасці, нізкага ўзроўню агульнай культуры людзей, якая ўключае ў сябе і культуру працы.

Расплата за грахі прыходзіць заўсёды знянацку. Учадзелыя ад фіміяму фальшывых пераможных рапартаў і рэляцый, асляплыя ад бляску незаслужаных узнагарод на грудзях нашых вялікіх і малых правадыроў, нарэшце мы ўздрыгнулі душою і жахнуліся: куды нас прывялі, што ж гэта робіцца з намі?

У экстрэмальнай сітуацыі правяраецца кожны чалавек. Усе справы і ўчынкі, якія яны ні былі б — сумленныя і добрыя або гнюсныя і подлыя — не праходзяць бясследна. Яны навідавоку. Іх заўсёды судзіць народная памяць.

У нашай памяці і ў памяці нашчадкаў, якія прыйдуць за намі, застануцца і будуць згадвацца з глыбокім душэўным смуткам і сардэчнай удзячнасцю чарнобыльскія пажарнікі, што пайшлі ў пекла і загінулі, ратуючы нас і еўрапейскія народы ад яшчэ большай бяды, якая магла здарыцца; застануцца маладзенькія салдаты, якія голымі рукамі збіралі кавалкі смертаноснага графіту вакол чацвёртага блока, а цяпер паціху канаюць ад няўмольнай хваробы; застануцца ўрачы, медсестры, якія без сну і адпачынку неслі і сёння нясуць сваю вахту міласэрнасці, ратуючы людзей у складаных умовах, калі няма патрэбных лекаў, прыбораў, абсталявання; застануцца беларускія вучоныя, якія шукалі і шукаюць хоць нейкае выйсце з бяды; застануцца пісьменнікі, журналісты, усе, хто прабіваў, чаго б гэта ні каштавала, у Маскве і тут, у рэспубліцы, сцяну бязмозглага маўчання, заслон злачыннай хлусні.

Але ў памяці народа застануцца імёны і тых, хто хаваў ад яго праўду, займаўся той жа абрыдлаю за сталінска-брэжнеўскія гады лакіроўкаю-маною, хто думаў толькі пра свой дабрабыт, хто коштам

здароўя і жыцця мільёнаў рабіў кар'еру, хто выкідаў на вецер сродкі, якія — ад піянера да пенсіянера — збіраліся па капейцы для ахвяраў Чарнобыля. Ад гэтай памяці-праклёну ім нідзе не будзе спакою: ні ва ўтульных кіраўнічых крэслах, ні на пенсіі, ні нават у труне.

Чарнобыльская бяда ўскалыхнула ўсіх сумленных людзей на планеце. Грамадскія арганізацыі рэспублікі, у тым ліку і Беларускі камітэт абароны міру, ад імя якога я выступаю, наладзілі плённыя кантакты з многімі замежнымі дабрачыннымі фондамі і арганізацыямі. Імі ў Беларусь ужо дастаўлены неабходныя лекі, вітаміны, дзіцячае харчаванне, апаратура, медыцынскае абсталяванне на многія мільёны долараў. Мы ўдзячны добрым людзям з самых розных краін, якія адгукнуліся на наш заклік душою і сэрцам.

Але нельга ўвесь час жыць з працягнутаю рукою. І мы сёння павінны спытаць ва ўрада рэспублікі: чаму за паслячарнобыльскія гады не пабудаваны фармацэўтычныя прадпрыемствы, чаму на дзеючых заводах не вядзецца перапрафіліроўка, не ставяцца новыя тэхналагічныя лініі па выпуску востра неабходных лекаў, вітамінаў, чаму не створаны агульнарэспубліканскі валютны фонд для цэнтралізаванай закупкі іх у заходніх краінах? Няўжо здароўе і жыццё нашых людзей менш важныя, чымся розныя сумніцельныя закупачныя аперацыі альбо паказушныя, бязмэтныя чыноўніцкія ваяжы за мяжу, на якія марнуецца дэфіцытная валюта?

Ва ўсе часы чалавечае быццё было, ёсць і будзе няспыннаю барацьбою дабра са злом. Шмат зла назапасілася за гады дыктату імперскага цэнтра на нашай роднай зямлі. Не абышло яно і душы беларусаў, зрабіла многіх з іх манкуртамі, духоўнымі калекамі. Нацыянальны нігілізм, моўны Чарнобыль, які пануе доўга на Беларусі, дашчэнту знясіліў народны арганізм, а цяпер дадаўся і радыяцыйны.

Самае святое, што ёсць на гэтай зямлі, — жыццё чалавека. Жыццё свабоднае, заможнае, паўнакроўнае, духоўна напоўненае. Дык няўжо і цяпер, на краі бездані, не прагучыць наша слова ў абарону нацыянальнай годнасці?

Мы, беларусы, выжывем фізічна толькі тады, калі паднімемся з каленяў, адродзім родную мову, культуру, свае спаконвечныя мудрыя традыцыі, калі зразумеем, што мы — не насельніцтва, не рабсіла, а народ, у якога за плячыма вялікая і слаўная гісторыя. Наш паратунак — нацыянальнае Адраджэнне!

*Красавік 1990 года*

## ВЫБАРЫ ПА-ВІЦЕБСКУ, АБО ЯК Я «СПРАБАВАЎ ЗАХАПІЦЬ УЛАДУ»

...Тэлефонны званок з Віцебска быў нечаканы. Намеснік старшыні абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры Ларыса Міхневіч паведаміла, што я аднагалосна вылучаны іхняй арганізацыяй кандыдатам у народныя дэпутаты БССР. Канешне ж, пачуць такую навіну ад землякоў было прыемна. Але навучаны «вопытам» свайго вылучэння Барысаўскай гарадской радай ТБМ, калі вельмі салідныя людзі, прадстаўнікі Цэнтральнай выбарчай камісіі, увялі ў зман і мяне, і тых, хто вылучаў, і сарвалі пасяджэнне рады (праўда, не зусім — мы правялі цікавую літаратурную сустрэчу), быў я на гэты раз асцярожны, спытаў: «А ці ўсё ў вас правільна аформлена? Ці ёсць згода акруговай выбарчай камісіі? Ставіцца ж столькі бар'ераў, што ўсе і не пераскочыш». Ларыса Віктараўна запэўніла, што ніякіх непаразуменняў не будзе, і назвала акругу: Віцдебская — Першамайская № 184.

З гэтага дня і пачаўся мой выбарчы марафон. Спачатку — клопаты з афармленнем дакументаў, затым — званкі, перамовы па розных пытаннях. Нарэшце рэгістрацыя скончылася, усё ўтрэслася. Можна было пачаць больш-менш спакойна разбірацца ў сітуацыі.

Акруга вялікая як па тэрыторыі, так і па колькасці выбаршчыкаў — каля 27 тысяч (скажу для параўнання, што ў некаторых безальтэрнатыўных кандыдатаў, кіруючых партыйных і савецкіх работнікаў, у сельскіх акругах было па 17-18 тысяч выбаршчыкаў). Знаходзіцца акруга на ўскраіне Віцебска, убірае ў сябе некалькі параўнаўча нядаўна пабудаваных мікрараёнаў. Асноўныя выбаршчыкі — рабочыя, інжынеры вытворчага аб'яднання «Віцязь», ВРТЗ, трэста № 28, камбіната шаўковых тканін і яшчэ некалькіх прадпрыемстваў, астатнія — студэнты педагагічнага і медыцынскага інстытутаў, настаўнікі, пенсіянеры.

На мандат дэпутата прэтэндуюць чацвёра: начальнік сектара канструктарскага бюро «Дысплей» вытворчага аб'яднання «Віцязь» К. Карнілаў, прараб трэста № 28, былы «афганец» А. Стэльмах, першы намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі БССР Э. Шыркоўскі і я — галоўны рэдактар часопіса «Полымя».

Прыкінуў і вырашыў, што ў першым туры выбараў не пераможа ніхто. Чатыры кандыдаты, у кожнага ёсць нейкія перавагі, у кожнага будуць свае прыхільнікі, а таму набраць больш за 50 працэнтаў галасоў — немагчыма.

Пасля патоку маны ў афіцыйнай прэсе, шматгадовага цкавання творчай інтэлігенцыі, пасля арыенціровак, спушчаных зверху для ідэалагічнага актыву (што толькі не плялі мясцовыя лектары пра сваіх землякоў Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна і мяне), свой шанц я ацэньваў вельмі сціпла — працэнтаў дзесяць. На выхад у другі тур не разлічваў. Гэтую магчымасць пакінуў усім тром сваім супернікам.

З такой рэальнай ацэнкай сітуацыі, але з добрым настроем у прадчуванні цікавых сустрэч з землякамі я і ўключыўся ў перадвыбарчую барацьбу. А пачалася яна нечакана. Калі з Ларысаю Міхневіч і пісьменнікам Віктарам Карамазавым — маімі даверанымі асобамі — зайшлі ў акруговую выбарчую камісію, якая знаходзілася ў школе № 12, у пакой забегла дырэктарка і сказала: «Вось я і дапільнавала вас. Мы даўно ўжо чакалі. Просім выступіць спачатку перад старшакласнікамі, а затым збяруцца яшчэ і настаўнікі». За двое сутак свайго падарожжа на аўтобусах па Віцебшчыне (правялі ўрок беларускай літаратуры ва Ушацкім музеі народнай славы для вучняў і студэнтаў Віцебскага педінстытута, якія спецыяльна прыехалі сюды, сустрэліся з сястрою Васіля Уладзіміравіча Быкава, адведалі маіх бацькоў) мы былі і закалыханыя, і запыленыя, і стомленыя. Самы час пабыць у гасцініцы, адпачыць. Але што зробіш. Мусілі паслухацца.

Сустрэча была цікавая, асабліва з настаўнікамі, якая цягнулася больш як дзве гадзіны. Натуральна, што настаўнікаў хвалявалі праблемы школы, адукацыі, але не толькі яны. Заклапочана гаварылі пра сацыяльную неабароненасць людзей разумовай працы, пра рост злачыннасці, пра падзеі ў Азербайджане і Арменіі, пра тое, што і ў Віцебску нейкімі невядомымі сіламі запускаюцца чуткі аб будучых яўрэйскіх пагромах, нагнятаецца атмасфера падазронасці і варожасці, асабліва злосныя нападкі вядуцца на прадстаўнікоў БНФ. Зноў прадстаўнікі апарату стараюцца стварыць вобраз ворага, а зараз — перад выбарамі — здань «захопу ўлады»... (Далей я раскажу, як гэтыя назіранні знайшлі сваё яскравае пацвярджэнне.)

Увечары мае мясцовыя давераныя асобы абмалявалі сітуацыю. Плакаты, якія заказвала акруговая выбарчая камісія, яшчэ не надрукаваны, і калі будуць — невядома. Забягаючы наперад, скажу, што патрэбнай інфармацыі (хоць тэкст праграмы быў мной перададзены своечасова), акрамя партрэта і некалькіх радкоў біяграфіі, выбаршчыкі з тых плакатаў не атрымалі. Ды і распаўсюджана была толькі частка іх, прытым за некалькі дзён да галасавання. У адным з клубаў выбаршчыкаў мы натыкнуліся на цэлыя стосы гэтай прадукцыі, якая ляжала мёртвым грузам. Заставаліся сустрэчы, якіх акруговая камісія для ўсіх чатырох кандыдатаў мелася арганізаваць аж... тры. Ну, што

ж, падумалася, будуць вялікія аўдыторыі, глядзіш, і нешта дойдзе да людзей. Але гэтыя спадзяванні былі марныя.

Назаўтра на сустрэчу ў педінстытуце прыйшло, відаць, каля 200 чалавек. Усе чатыры кандыдаты прадставілі свае праграмы, а затым адказвалі на запіскі і пытанні. Іх на гэтай сустрэчы, як і на наступнай, больш за ўсё было «чужым» — мне і Э. Шыркоўскаму. Гаворка ішла вострая, напружаная. Прывяду толькі некалькі запісак, адрасаваных мне: «Ці лічыце вы магчымым правядзенне сапраўды дэмакратычных выбараў ва ўмовах аднапартыйнай сістэмы?», «Платформа КПСС прадугледжвае арганізацыю новых партый, саюзаў і г. д. А ці будзе магчымасць арганізаваць іх без перашкод (на прыкладзе БНФ)?», «Ваша меркаванне, ці прадаставіць КПСС праз сваю разгалінаваную сетку сродкаў масавай інфармацыі магчымасць праводзіць свае ідэі грамадскім арганізацыям і партыям, якія будуць створаны з цягам часу?», «Як вы лічыце, наколькі кампетэнтнае цяперашняе кіраўніцтва рэспублікі? Ці правамерна Беларусь называюць «Вандэяй» перабудовы?», «Як вы ацэньваеце работу Саўміна БССР і яго кіруючых кадраў. асобныя з якіх пенсіённага ўзросту?», «Ці з'яўляецеся вы членам БНФ? Калі так, то які ваш удзел?», «Ваша ацэнка З. Пазняка?», «Ваш бацька займаў адказныя пасады ў выдавецтве ЦК КПБ, а вы пайшлі па шляху пратэкцыянізму. Ці сціпла вылучаць сябе кандыдатам у дэпутаты?», «Якімі льготамі і прывілеямі карысталіся асабіста, калі былі на адказных пасадах у ЦК рэспублікі?», «Як рэдактар часопіса і выхаванец ЦК ці часта вы ўзгадняеце сваю дзейнасць з апаратам?», «Ваша меркаванне, ці ёсць у часопіса «Полымя» ўласнае палітычнае крэда і якія рэдакцыі знаходзяцца ў апазіцыі да вас? У чым прычына?», «Якім шляхам вы будзеце прышчапляць любоў да беларускай мовы? Законам і сілай?», «Растлумачце, як вы будзеце, як дэпутат, практычна ствараць умовы, якія аблегчаць працу жанчын?», «Кім вы вылучаны ў кандыдаты? У шасці акругах Віцебскай вобласці няма альтэрнатыўных кандыдатаў. Чаму вы не пажадалі балаціравацца па такой акрузе?»

Трэба аддаць належнае прысутным, амаль пад кожнай запіскай стаяла прозвішча. Людзі не баяліся, як кажуць, «засвяціцца», уставалі з месца, удакладнялі свае пытанні. І гэта было прыемна.

Даводзілася адказваць на ўсе, часам надуманыя, а часам і яўна правакацыйныя, з кручком пытанні. Растлумачыў людзям, што мой бацька ніколі не быў на адказных пасадах у выдавецтве ЦК КПБ, а больш за сорак гадоў адпрацаваў настаўнікам вясковай школы, што ніякага пратэкцыянізму ў маім вылучэнні няма і г. д. Гаварыў і пра тое, што за сваю працу ў ЦК КПБ на пасадзе загадчыка сектара

мастацкай літаратуры аддзела культуры мне не сорамна, бо заўсёды меў асабістую пазіцыю, стараўся ў меру сваіх магчымасцей падтрымліваць таленавітых творцаў, абараняць іхнія кнігі ад ідэалагічных цэнзараў-цэрбераў, спрыяў развіццю беларускага кнігавыдання, энцыклапедычнай справы, цвёрда стаяў за адраджэнне роднай мовы і культуры, а таму часта ад высокага партыйнага начальства перападала, як кажуць, «на арэхі». Дзеля гумару сказаў, што пра гэта сведчыць мая зарана пасівелая чупрына. Рэакцыя залы была ўхвальная, насцярожанасць да мяне з большага развеялася, і далей я ўжо мог спакойна давесці прысутным сваю праграму, свой погляд на праблемы эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага і культурнага жыцця рэспублікі, якія іх цікавілі.

Увогуле, можна было б радавацца актыўнасці выбаршчыкаў, калі б не канфуз, які здарыўся ў самы разгар гаворкі. Раптам з задніх радоў пачалі падымацца і прабірацца да выхаду людзі. Вядучы сустрэчы супыняў іх, але марна. Аказалася, каб запоўніць аўдыторыю, для масавасці ўгаварылі застацца тут пасля лекцый студэнтаў. Прытым тых, якія да выбарчай акругі № 184 ніякага дачынення не мелі. Галодныя, незадаволеныя студэнты, канешне ж, не схацелі выседзець да канца ўсю сустрэчу. Што ж, давялося паспачуваць ім і пажадаць прыемнага апетыту. Яшчэ больш цікава стала, калі мы даведаліся, што і з тых людзей, якія засталіся, многія не будуць удзельнічаць у галасаванні, бо жывуць не ў гэтай акрузе, а прыйшлі на сустрэчу дзеля цікаўнасці. Непрыемнае ўражанне ад усяго гэтага крышку змякчыла наступная запіска: «Паважаны Сяргей Іванавіч! Ваша платформа ясная. Адношуся да вас з павагай і свой голас аддам толькі за вас. Гэта зробіць і мая сям'я. Прашу вас зразумець нашу горыч і бяду, прымаць захады з Чарнобылем хутка, таму што фон там не змяняецца, выродлівасці становіцца ўсё больш, і дзеянні павінны быць больш рашучыя. Я была там у верасні-кастрычніку. Толькі гаварыльня, а дзеянняў няма. Жадаю вам удачы». Пасля сустрэчы мяне абступіла чалавек дваццаць, яны выказвалі канкрэтныя просьбы, раіліся па самых розных пытаннях.

Назаўтра ў сустрэчы на тэлезаводзе прыняло ўдзел каля 150 чалавек, але гэта былі сапраўдныя выбаршчыкі. Акрамя таго, наша размова трансліравалася па радыё, і людзі на рабочых месцах маглі, хоць краем вуха, нешта ўлавіць. Гаворка была не менш вострая і карысная для абодвух бакоў. Але, як я заўважыў, у дачыненні да мяне пытанні мелі свой накірунак. Нехта дасканала азнаёміў з маёй біяграфіяй групу «актывістаў», і «штыкавыя» ўдары наносіліся па такіх

пазіцыях: работа сакратаром райкама камсамола, у ЦК КПБ. Усё астатняе іх не цікавіла.

Дарэчы, «актывісты», якія, нібыта цень, сноўдалі за мною з сустрэчы на сустрэчу, мелі сваю, бяспройгрышную тактыку. У маладзёжных аўдыторыях, дзе нават такі адказ: «Так, я член КПСС» выклікаў гул, яны мусіравалі ў сваіх запісках прывілеі і льготы, якімі як быццам, працуючы ў ЦК КПБ, я быў абсыпаны з галавы да ног. А там, дзе было шмат пажылых людзей, адстаўнікоў, ветэранаў, пенсіянераў, самаю вялікаю заганаю падавалася тое, што мяне падтрымлівае БНФ. Асабліва стараліся два круглявыя, чырванашчокія мацачкі ў аднолькавых імпартных цёмных плашчах, якія, па ўсім было відаць, атаварваліся на адной базе. Калі мне абрыдзелі іхнія хлуслівыя выпады і празмерная надакучлівасць, я адрасаваў ім не такую ўжо і вострую, але з'едлівую рэпліку. Гэта выклікала рогат аўдыторыі, а ў іх спалох, яны хуценька рэціраваліся з залы.

На апошняй, арганізаванай акруговай выбарчай камісіяй сустрэчы пабыць мне не давялося. Моцна застудзіўся, магчымасці трапіць у паліклініку ў Віцебску не было, таму паехаў лячыцца дахаты. На развітанне Уладзімір Пятровіч Ганчароў — даверанная асоба і мой самы актыўны і шчыры памочнік — параіў: «Лячыся, але не спі ў шапку. Усе друкуюць лістоўкі. Падумай і ты, як данесці да людзей сваю праграму».

Я і сам ужо зразумеў, што безаблічныя плакаты, нешматлюдныя сустрэчы нічога не дадуць. Выбаршчыкі будуць галасаваць уцёмную, каму якое прозвішча спадабаецца. Дык што ж гэта за выбары?

З вялікімі цяжкасцямі (няма паперы, дзе размясціць заказ і г. д.) усё ж праграма была надрукавана. І зноў праблема — як давезці пакункі? Але на гэты раз пашанцавала. Званок з Літаратурнага музея Я. Коласа, просяць прыняць удзел у адкрыцці выставы «Па Неману песня плыве», прысвечанай народнаму песняру. «А дзе ж вы думаеце яе адкрываць?» — папытаў я. Пачуў адказ: «У Віцебску, у коласаўскім тэатры», і ўзрадаваўся. Тое, што трэба. І дапамагу музейным работнікам, і сам дабяруся без лішніх клопатаў.

Перад самым ад'ездам у Віцебск мне перадалі шматтыражку тэлезавода «Рабочее слово», дзе была апублікавана справаздача аб сустрэчы з выбаршчыкамі чатырох кандыдатаў, Чытаў яе і вачам не верыў. Орган парткама завода не пасаромеўся займацца інсінуацыямі, адкрытымі нападкамі не толькі на мяне, але і на ўсю творчую інтэлігенцыю. У канцы публікацыі быў заклік байкатаваць маю кандыдатуру на выбарах: «...на жаль, красамоўны кандыдат амаль заўсёды — не практык, не ўмелец у рашэнні канкрэтных і надзённых

нашых праблем. Не прымаю «славесы», якія чамусьці атрымалі сёння званне дзелавых якасцей. З цяжкасцю веру ў магчымасці дэпутатаў творчай прафесіі зразумець беды рабочага чалавека. Аддаю перавагу тым, якія ідуць да канца, валодаюць прабіўной сілай». Сярод чатырох кандыдатаў, на думку аўтара справаздачы Г. Воцінцавай, адзін я не заслугоўваў падтрымкі выбаршчыкаў.

Але гэта быў толькі пачатак. Тое, што пачуў ад даверанай асобы Рыгора Барадуліна — выкладчыка Віцебскага педінстытута, паэта Анатоля Канапелькі,— перавярнула ўсю душу. Барадулін быў вылучаны кандыдатам у народныя дэпутаты таксама ў Віцебску. І вось на адной з сустрэч у час выступлення А. Канапелькі, які расказваў на роднай мове пра кандыдата, адзін з брыгады партыйных «актывістаў», тых, што рэгулярна хадзілі па пятах і настройвалі супраць аўдыторыю, злосна крыкнуў: «Адстрэльваць трэба такіх, як ты і твой Барадулін!» Нападкам падвяргаўся і нядаўна прыняты Закон «Аб мовах у Беларускай ССР», дзе беларуская мова аб'яўлена дзяржаўнаю. Некаторыя кандыдаты ў народныя дэпутаты адкрыта заяўлялі на сустрэчах: «Першае, што я зраблю, калі стану дэпутатам, гэта пастаўлю пытанне аб адмене дзяржаўнасці беларускай мовы».

Такая ж сітуацыя была і ў Полацку, дзе балаціраваўся яшчэ адзін зямляк, паэт Генадзь Бураўкін. Яго супернік — Валянцін Нагорны, рэжысёр народнага (!) тэатра — заявіў, што ён сам беларус, але супраць дзяржаўнасці беларускай мовы. На яго думку, прыняты закон — гэта ўсё роўна як выпускаць чорнага ката сабакам. У лістоўках, якія хадзілі па Полацку, былі такія словы: «Не аддавайце ўладу ў мінскія рукі. Яны ўжо нават свята Скарыны хочуць правесці ў Мінску». Ішла фальсіфікацыя, хлуслівыя нагаворы на таго чалавека, які сумленна, усё жыццё адстойвае праўду, які столькі зрабіў для адраджэння роднае мовы, культуры. І прытым — гэта ўжо гатовы, падрыхтаваны, прафесіянальны парламентарый, што даказана Генадзем Бураўкіным за час яго дэпутацтва.

Аналізаваў усё гэта і думаў: «Як жа актыўна нагнятаецца ў вобласці артадаксальным партыйным чыноўніцтвам атмасфера падазронасці, варожасці да дэмакратычных сіл, да пісьменнікаў, атмасфера не толькі непрымання, але і нянавісці да сваёй роднае мовы, культуры». Далейшы ход падзей пацвердзіў гэта яшчэ неаднойчы.

Той тыдзень у Віцебску быў вельмі напружаны. Пабыў у рабочых інтэрнатах, сустракаўся з настаўнікамі, студэнтамі. Група падтрымкі дапамагла распаўсюдзіць праграму.

Перад самым галасаваннем паехаў у Мінск. Былі неадкладныя справы ў рэдакцыі, ды і не хацелася спецыяльна чакаць вынікаў. І

вось начны званок з Віцебска. Нястомны Уладзімір Пятровіч Ганчароў прадыктаваў: С. Законнікаў — 6731, К. Карнілаў — 3663, А. Стэльмах — 3074, Э. Шыркоўскі — 3536 галасоў. «Бачыш, — гаварыў ён радасна, — а ты сумняваўся. На ўчастках, дзе галасавалі прадстаўнікі тэлезавода, — твая перавага, як і ў цэлым па акрузе». Прызнаюся шчыра, і ў мяне было пачуццё радасці, удзячнасці людзям, якія не вераць хлусні, самі робяць асэнсаваны выбар.

Вынікі першага тура выбараў у Віцебску напалохалі партыйных апаратчыкаў. А таму з яшчэ большым імпэтам яны пачалі «дзейнічаць». Рэгулярна ішлі нарады, інструктажы, разборы. Выбарчая кампанія ператварылася іх намаганнямі ў арэну баявых дзеянняў. Да выпуску «кампрамата» на дэмакратычна настроеных кандыдатаў былі прыцягнуты парткамы многіх буйнейшых прадпрыемстваў, розных арганізацый горада. Тым больш, што ў іх праблем з паперай і паліграфічнай базай не было. Звароты, лістоўкі з адкрытай хлуснёю сыпаліся на галовы выбаршчыкаў, як з вялізнага меха, дзесяткамі тысяч.

Мая асоба прыцягнула ўвагу «актывістаў» не толькі з той акругі, дзе баладзіраваўся. Але самы моцны наступ ішоў тут. Пад кіраўніцтвам парткама савет працоўнага калектыву тэлезавода надрукаваў і паўсюдна расклеіў і разаслаў зварот да працоўных калектываў акругі, дзе не толькі падтрымліваўся як кандыдат «свой» К. Карнілаў, але і зноў вяліся напады на «чужынца», які не зможа абараняць інтарэсы горада, завода, рабочага класа. І ў лістоўках у падтрымку К. Карнілава, якія былі расклеены не толькі па ўсёй акрузе, але і ў грамадскім транспарце, кожны раз не забываліся «пэцнуць» і мяне. (Хачу аддаць належнае майму суперніку — Канстанцін Фёдаравіч Карнілаў публічна на адной з сустрэч з выбаршчыкамі адмежаваўся ад гэтых нападак і сказаў, што ўсё гэта робіцца без яго, што яму сорамна за такую нахабную хлусню, і папрасіў у мяне прабачэння. Але на гэтай сустрэчы прысутнічала толькі 60-70 чалавек, а выбаршчыкаў, нагадаю, — 27 тысяч...).

Адчуваючы надзейную падтрымку з самага верху партыйнай іерархіі, мясцовыя сілы «прагрэсіўнага кансерватызму» (выраз Я. Сакалова) дзейнічалі несумленнымі, забароненымі прыёмамі, не зважаючы на маральныя, ды і прававыя нормы. Апафеозам масіраванай атакі стала чарговая лістоўка, якая была расклеена ў акрузе ледзь не ў кожным пад'ездзе. Яе тэкст заслугоўвае таго, каб быць прыведзеным поўнасцю:

«Задумайцеся, людзі! Сёння да ўлады актыўна рвуцца прадстаўнікі так званага «Беларускага народнага фронту». Кіраўніцтва БНФ — гэта група людзей, якія, спекулюючы на праблемах беларускага на-

рода, прыкрываючыся прыгожымі і безадказнымі лозунгамі, імкнуцца любымі шляхамі захапіць уладу. Пра гэта некалькі дзён назад афіцыйна заявіў іхні па-экстрэмісцку настроены лідэр З. Пазняк. Так пачыналася і ў рэспубліках Прыбалтыкі.

Зараз іх лозунг, хоць і старанна завуаліраваны, — «Чым горш, тым лепш». Гэта меў на ўвазе М. С. Гарбачоў, калі гаварыў пра сілы, якія «раскалыхваюць наш карабель». Іх асноўная мэта — аддзяленне Беларусі ад СССР і рэстаўрацыя капіталізму.

У студзені гэтага года рукамі «баевікоў» Народнага фронту Азербайджана забіты наш зямляк — Аляксандр Канаплёў. Сёння ліецца кроў у Арменіі і Азербайджане. Там экстрэмісты з народных франтоў забіваюць людзей за тое, што яны належаць да іншай нацыянальнасці. Першы крок да гэтага зрабіў БНФ, які абвясціў у сваёй праграме цэнз аседласці.

Галасуючы за народных кандыдатаў, памятайце, што СТАЎЛЕНІКІ БНФ — гэта не тыя людзі, якія забяспечаць вам дастатак і спакой у доме». (Тэкст, канешне ж, быў напісаны па-расейску.)

Вось так. Ва ўсіх бедах рэспублікі вінаваты БНФ, а не тыя, хто кіраваў ёю і кіруе сёння, хто свае правалы ў рабоце і на выбарах хоча спісаць на падрыўную дзейнасць нефармалаў. Калі верыць гэтай лістоўцы, якая вытрымана ў духу многіх выступленняў на пленумах, актывах, публікацый партыйнай прэсы, то ў недасведчанага чалавека можа скласціся ўражанне, што ў Беларусі пачалася грамадзянская вайна. Нашы людзі і так даведзены ўжо да апошняй мяжы духоўнай і сацыяльнай галечаю, няпэўнасцю заўтрашняга дня, а тут яшчэ нагнятаюцца такія страсці, жахі, драматызуецца сітуацыя, атручваецца і без таго трывожнае, жабрачае жыццё.

У лістоўцы было канкрэтнае азначэнне — стаўленікі БНФ. А хто ж у акрузе № 184 гэты стаўленік? Вядома ж, паэт, галоўны рэдактар часопіса «Полымя», той, хто размаўляе на роднай мове і ў кожным выступленні гаворыць пра нацыянальную годнасць беларусаў, пра адраджэнне нацыі. І самае цікавае, што лістоўкі з правакацыйным зместам не толькі расклейвалі, іх разносіў па выбарчых клубах і іншых людных месцах... сам сакратар парткама тэлезавода В. Макараў. Далей ужо, як кажуць, ісці няма куды.

Але пасля тэндэндыйных, непісьменных у гістарычным і навуковым плане публікацый у абласной газеце «Віцебскі рабочы», якія з'явіліся якраз напярэдадні паўторнага галасавання, зразумеў, што ніякія законы для «агітатараў» не пісаны, ва ўсіх іх ёсць надзейнае прыкрыццё. Не, нездарма на сустрэчах выбаршчыкі згадвалі «Вандэю». У Віцебску паўсюдна ішло шальмаванне непажаданых канды-

датаў (я чытаў дзесяткі лістовак з паклёпамі на іх), парушаўся закон аб выбарах пры галасаванні, а таму і звярталіся яны ў пракуратуру, КДБ, хоць справядлівасці так і не дачакаліся.

Але вярнуся да напружаных дзён перад паўторным галасаваннем. Насуперак усяму сустракаўся з ранку да цямна з выбаршчыкамі ў рабочых і студэнцкіх інтэрнатах, у дварах вялікіх дамоў, у самых людных месцах акругі. Людзі падыходзілі, дзяліліся сваімі малымі і вялікімі клопатамі, трывогай, бядой. Яны былі розныя: гаваркія і маўклівыя, эмацыянальныя і разважлівыя, злосныя і памяркоўныя, знявераныя і з пэўным запасам аптымізму, са слязамі на вачах і ўсмешлівыя, абыякавыя і дапытлівыя, неінфармаваныя і дасведчаныя... Але гэта былі людзі, той народ, з якім трэба весці гутарку не толькі ў час выбарчых кампаній, а штодня, і прытым не з трыбуны па паперцы, а твар у твар, вочы ў вочы. За апошнія гады ў мяне такіх сустрэч было многа. Без гэтага не змог бы напісаць свае публіцыстычныя артыкулы, новую кнігу паэзіі, паэму «Чорная быль», якія выклікалі адваротную сувязь — шматлікія пісьмы чытачоў.

Развярэдзілі душу і віцебскія выбаршчыкі. Будаўнікі расказвалі, як іх прымушаюць узводзіць жыллё і будынкі сацыяльна-культурнага прызначэння побач з забруджанай зонай на Магілёўшчыне, дзе ўсё роўна ніхто не зможа жыць і працаваць, як выкідваюцца такія патрэбныя сёння сродкі на вецер, іншыя людзі — пра злоўжыванні, махлярства і хамства ў гандлі, у сферы бытавога абслугоўвання. Разам з былым дэсантнікам пабыў у доме № 6 па праспекце Перамогі, дзе жыве шмат інвалідаў, наслухаўся, як мясцовыя ўлады адносяцца да гэтых людзей. Выбаршчыкі ўспомнілі і тое, як пускаўся пыл у вочы, як цягалі прадукты з крамы ў краму па шляху высокага начальства ў час наведвання горада і вобласці Я. К. Лігачовым, як падманвалі людзей у сувязі з будаўніцтвам атамнай электрастанцыі, як завозіцца з забруджаных раёнаў у вобласць жывёла для адкорму, як прадаюцца прадукты, непрыгодныя для харчавання, як доўгія гады не рэагуюць на просьбы перанесці бензакалонку, пабудаваную галавацяпамі ў густанаселеным мікрараёне, і г. д.

Мне могуць сказаць: «Гэтым нікога не здзівіш. Такое стала нормай жыцця».

У тым і наша трагедыя, што рэспублікй жыве па старым, каланіяльным раскладзе. Дагэтуль усе мы яшчэ да канца не ўсвядомілі, што трапілі ў эпіцэнтр жахлівай бяды, раны ад якой давядзецца лячыць не адно стагоддзе. І да гэтага сітуацыя была складаная: знясіленая, атручаная зямля, забруджаныя рэкі і азёры, захімізаванае паветра, знявераныя, адлучаныя ад народных традыцый, роднае мо-

вы і культуры людзі, разгул злачыннасці, ценявой эканомікі, мафій усіх масцей, карупцыі і г. д. А зараз на ўсё гэта легла смяротная чарнобыльская хмара. Здавалася б, у такіх абставінах трэба зрабіць усё, каб сказаць народу праўду, кансалідаваць, падняць людзей на неймаверна цяжкую працу, ратаваць дзяцей і ўсіх, хто трапіў у бяду. Але прадстаўнікі кіруючых органаў вырашылі, што можна абысціся паўпраўдаю, паўмерамі, як гэта было заўсёды ў нашым таталітарным грамадстве. Тры гады праўда пра чарнобыльскую трагедыю замоўчвалася. Не, не абышлося. Страчаны давер, аўтарытэт. Людзі не вераць, што сённяшняе кіраўніцтва рэспублікі здольнае кампетэнтна, смела і энергічна рашаць звышскладаныя задачы экалагічнага, сацыяльнага і духоўнага выжывання нацыі, выкарыстаць увесь свой беларускі эканамічны, навуковы, працоўны патэнцыял, дамагчыся канкрэтнай дапамогі ад урада краіны.

Ведаючы гэты настрой людзей, апаратчыкі і стараліся пераключыць увагу на іншае: БНФ, нефармалаў, «экстрэмістаў», прыхільнікаў «Дэмакратычнай платформы». Метады, якімі яны дзейнічалі, далёкія ад палітычнай культуры. Ды і не трэба забывацца, што палітычнай культуры не можа быць без пэўнага ўзроўню адукацыі, элементарнай чалавечай культуры — духоўнай, эстэтычнай. Але адкуль яна возьмецца, калі ў рэспубліцы на развіццё культуры затрачваецца толькі 0,78 працэнта (!!!), а па краіне — 1,4 працэнта бюджэту. Тое ж самае з адукацыяй, пра што я гаварыў на сустрэчы з кіруючымі работнікамі рэспублікі перад XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыяй. Паглядзіце, у якіх умовах працуюць нашы школы. У многіх з іх вучняў больш за норму ў два разы. А ВНУ? Дальбог, парасяты і цяляты, размешчаныя ў шыкоўных прасторных комплексах і фермах, звысоку паглядаюць на вучняў і студэнтаў. Для ацэнкі гэтай сітуацыі ёсць біблейскае выслоўе: «Свінні з'елі людзей».

У такой атмасферы выхоўваліся і выхоўваюцца многія пакаленні беларусаў. І таму не дзіўна, што яны не ведаюць сваёй гісторыі, традыцый, роднае мовы, культуры. У гэтым вінаваты не толькі тыя, хто за беларускае слова катаваў, ссылаў у сталінскія канцлагеры, расстрэльваў, але і той, хто ў хрушчоўскі і брэжнеўскі час выракся сваёй спадчыны, знішчаў нацыянальныя школы, ВНУ дзеля кар'еры, каб дарвацца да начальніцкіх вышыняў, да поўнага карыта, у імя абсурднай ідэі зліцця моў і нацый, якая ў Беларусі атрымала найбольшую чыноўніцкую падтрымку, выпаліла душы людзей.

Гэтая атмасфера страху, рабства, бездухоўнасці, прыгнечанасці, немагчымасці паверыць у тое, што можна жыць інакш, задаволенасці сціплым кавалкам хлеба, а ў лепшым выпадку (калі здабудзеш) каўба-

сы — застаецца. І такой затаптанай, даведзенай да маразму грамадзе проста ўдзябсці, што дэмакраты — ворагі, тут свабода таму, хто мае манаполію на ўладу.

Дзеля атрымання дэпутацкага мандата, каб больш надзейна ўмацавацца ў апаратным крэсле, можна пайсці на ўсё. Можна закідаць на дні выбараў магазіны сваёй акругі дэфіцытнымі таварамі, паслаць падручных «карабейнікаў» з апельсінамі, сасіскамі, каўбасою па далёкіх вёсках (гэта рабілася па ўсёй рэспубліцы), запрасіць польскі ансамбль на свае сустрэчы з выбаршчыкамі, звярнуцца па дапамогу нават да ненавіснага «Саюдзіса», паабяцаць вернікам перадачу касцёла або царквы (Гродзеншчына, Міншчына), накіраваць выбаршчыцам віншавальныя паштоўкі да свята 8 сакавіка, якія падпісваў (трэба ж падпісаць імя і імя па бацьку кожнай!) мабілізаваны апарат (Мінск), залатаць перад выбарамі яміну ў асфальце, якую гадамі не бачыў (паўсюдна). Што ж, многія людзі купіліся на такія «акцыі». Але не ўсе. Нельга купіць сумленне тых, хто разумее апаратныя гульні, становіцца вышэй гэтай, да падзеі прымеркаванай купецкай падачкі. Працэнт галасоў, які набралі безальтэрнатыўныя кандыдаты пасля такой стараннай апрацоўкі выбаршчыкаў, якраз і сведчыць пра гэта.

Людзі хочуць, каб у кіраўніцтве, у парламенце былі сумленныя, прафесіянальна падрыхтаваныя, адукаваныя, кампетэнтныя прадстаўнікі народа, сапраўдныя патрыёты Беларусі, якія думаюць пра захаванне нацыі, пра яе духоўны і матэрыяльны дабрабыт, а не дачаснікі, не тыя, хто жыве адным днём, каб толькі ўтрымацца ў крэсле ці перасесці ў вышэйшае, а потым спакойна пайсці на пенсію.

Усё ў жыцці ўзаемазвязана. Духоўны пачатак, культура заўсёды дапамагаюць якаснаму развіццю эканомікі, рашэнню экалагічных, сацыяльных праблем і, у рэшце рэшт, прыняццю разумных і справядлівых законаў...

А цяпер — пра вынікі выбарчага марафона: С. Законнікаў — 49,8 працэнта, К. Карнілаў — 39 працэнтаў галасоў. Мне б вельмі не хацелася, каб тое, што я пішу, было ўспрынята, як голас пакрыўджанага. Такім сябе не лічу. Наадварот, адчуваю вялікую маральную перамогу. Нягледзячы на жорсткі прэсінг, на махінацыі пры галасаванні, за паэта, рэдактара часопіса, «залётную птушку», «чужынца», кандыдата, які на ўсіх сустрэчах з людзьмі, а Віцебск надзвычай зрусіфікаваны горад, гаварыў на роднай мове, праводзіў ідэі нацыянальнага адраджэння, аддалі свае галасы 8 тысяч 871 чалавек (не хапіла 35 галасоў). І ў асноўным гэта былі прадстаўнікі рабочага класа. Тыя, інтарэсамі каго, як сцвярджае орган парткама тэлезавода газета «Рабочее слово», ніколі не жывуць пісьменнікі. Не, людзі

пачынаюць разумець, хто ёсць хто, каму неабыякавы лёс народа, адгукаюцца на шчырасць, на вострую, часам не вельмі прыемную, але сумленную размову пра наша жыццё, пра тое, як зрабіць яго лепшым, ацэньваюць прынцыповую пазіцыю, рэальны ўклад у пабудову цывілізаванага грамадства дэмакратычна настроеных пісьменнікаў, журналістаў. Ёсць спадзяванне, што праз некалькі гадоў на выбарчыя ўчасткі ўсе мы прыйдзем іншымі.

Радасна, што людзі,ператвораныя таталітарнай сістэмай, кіруючай арміяй мясцовых «суперінтэрнацыяналістаў» у безаблічнае насельніцтва, у нямую рабочую сілу, пачынаюць станавіцца сапраўдным народам. Народам, які думае, выбірае, рашае і стварае сваё жыццё.

Шкада толькі, што, як на Віцебшчыне, так і па ўсёй Беларусі, гэты працэс ідзе надта марудна.

*Май 1990 года*

## ПАЧУЕМ ПРОДКАЎ ГАЛАСЫ
**(*Выступление на мітынгу ў гонар Свята славянскага пісьменства і культуры на плошчы Перамогі ў Мінску*)**

У нашых сэрцах вялікая радасць. На беларускую зямлю прыйшло і цяпер ужо стане штогадовым, традыцыйным Свята славянскага пісьменства і культуры. Гэтая ўрачыстасць надзвычай значная, выдатная сваім высокім гуманістычным сэнсам, яна блізкая і дарагая сэрцу кожнага беларуса, сэрцам людзей усіх іншых нацыянальнасцей, якія жывуць і працуюць дружнаю сям'ёю ў рэспубліцы.

Дата і сам змест свята звязаны з імёнамі стваральнікаў славянскай азбукі, вялікіх славянскіх асветнікаў, раўнаапосталаў Кірылы і Мяфодзія. У Балгарыі традыцыя правядзення такой урачыстасці налічвае больш 130 гадоў, і свята адзначаецца шырока, усенародна.

З 1986 года Свята славянскага пісьменства і культуры праводзіцца і ў нашай краіне. Яно адбылося ў Мурманску, Волагдзе, Варашылаўградзе, Ноўгарадзе, Кіеве. Зараз эстафету прыняла Беларусь.

У кожнага народа ёсць жывая крыніца, адкуль ён заўсёды чэрпае сілу, гістарычны аптымізм, надзею і веру. Гэта яго культура. Яна ствараецца вялікімі намаганнямі многіх таленавітых людзей на працягу стагоддзяў, акумуліруе ў сабе магутную разумовую, духоўную і маральную энергію. З цягам часу мяняецца ўсё: і клімат, і ландшафт, і аблічча вёсак і гарадоў, і побыт чалавека. Застаецца мова, культура, духоўнае багацце народа, якое перадаецца ў спадчыну, памнажаецца новымі пакаленнямі.

Нам, беларусам, у гэты святочны дзень трэба да зямлі пакланіцца невымернай мудрасці, прарочаму прадбачанню і асветніцкай настойлівасці Францішка Скарыны, рэвалюцыйнай мужнасці і нацыянальнай апантанасці Кастуся Каліноўскага, духоўнага подзвігу Францішка Багушэвіча, Цёткі, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага і яшчэ тысячам і тысячам слаўных людзей Беларусі, шчырым працаўнікам на ніве навукі, асветы і культуры.

Усе яны былі з кагорты нязломных духам, любілі свой народ, сваю зямлю, думалі пра іх будучыню, рыхтавалі наш дзень.

Многае зроблена і новымі пакаленнямі. Але гэта не павінна засланяць тых вострых праблем нашага жыцця, якія засталіся нам у спадчыну ад часоў сталінскіх рэпрэсій, валюнтарызму і застою і якія неабходна актыўна і настойліва вырашаць. Гэта датычыцца ўсіх сфер: палітыкі, эканомікі, навукі, культуры. І, відаць, у першую чаргу культуры.

Надаючы вялікую ўвагу матэрыяльнаму пачатку ў жыцці, мы часта забывалі, што эканамічны ўздым напрамую звязаны з узроўнем духоўнасці народа, з культурай у самым шырокім сэнсе гэтага слова і ўнутранай душэўнай культурай кожнага чалавека. Толькі зараз, на крутым павароце свайго развіцця, мы пачынаем многае пераасэнсоўваць, пераглядаць, разумець, што без культуры далей рухацца нельга. Нас радуе тое, што заканадаўча замацаваны дзяржаўны статус беларускай мовы, што пачынае адраджацца нацыянальная самасвядомасць, годнасць нашага таленавітага, мудрага і мужнага народа.

Культура — не толькі аснова духоўнага здароўя нацыі. Яна мае унікальную здольнасць наводзіць трывалыя масты ўзаемаразумення і дружбы, аб'ядноўваць народы. Зараз у славянскім свеце праяўляецца вялікая цікавасць да культур суседзяў, побач з актыўным самаразвіццём назіраецца жаданне абменьвацца духоўнымі каштоўнасцямі, узаемаўзбагачацца. Такой высакароднай мэце служыць і Свята славянскага пісьменства і культуры.

Духоўнае развіццё — гэта не нейкая кампанія, а пастаянны, бесперапынны працэс. Будзем спадзявацца, што і гэтае нашае славянскае веча дапаможа наладзіць плённыя кантакты паміж творчай, навуковай інтэлігенцыяй славянскіх краін, паслужыць ідэі духоўнага яднання.

А мы, дарагія госці, у гэтыя дні па спаконвечнай славянскай і беларускай традыцыі гасціннасці і сардэчнасці пакажам вам усе лепшыя здабыткі культуры, навукі, падзелімся ласкай і душэўным цяплом.

Наша жыццё падточана шашалем бездухоўнасці і абыякавасці, апалена злавесным выдыхам Чарнобыля. І тут, каля святога агню, перад памяццю тых, хто аддаў сваё жыццё за тое, каб захаваліся наш дух, наша культура, маральныя асновы, нам трэба ў поўнай меры ўсвядоміць свой абавязак перад будучыняй, тую адказнасць, якая легла на нас у гэты суровы, трагічны час.

Дарагія беларусы! Давайце на імгненне ўявім, што ва ўсіх нас на далоні ляжыць «Біблія» Скарыны, які «избрал оставити в науце и в книгах вечную славу и память свою...», і паклянёмся на ёй, што зробім усё, каб адрадзіць родную мову і культуру, захаваць духоўнае і фізічнае здароўе нацыі, каб не згубіць у сэрцах даўнюю павагу і любоў да сваіх славянскіх братоў і сясцёр, да ўсіх добрых людзей на зямлі, каб з годнасцю несці праз вякі сваё імя ў вялікай слаўнай сям'і славянскіх народаў.

Жадаю ўсім вам дабра і шчасця!

*Май 1990 года*

## БЕЛАРУСКАЕ СЭРЦА

Калі спытаць чалавека пра тое, да каго, да чаго ў хвіліны маўклівага роздуму імкнецца, горнецца ягонае, вызваленае ад мітусні і драбязы сэрца, што застаецца для яго назаўсёды самым значным і дарагім, ён згадае родны кут, успомніць бацькоў, дзядоў і, канешне ж, павядзе гаворку пра дзяцей, унукаў, якія надточваюць нітачку нашае існасці ў гэтым адзіным, непаўторным белым свеце і цягнуць яе ў далёкую будучыню.

Роднае, роднасць... Якой неспасцігальнаю таямніцаю людской трываласці, якім глыбокім і высокім сэнсам жыцця поўняцца такія звыклыя словы! Вось чаму незатаптанае, нездратаванае нацыянальным нігілізмам і манкурцтвам беларускае сэрца абдымае сваёю любоўю і, як сказаў, волат айчыннае духоўнасці, геніяльны Францішак Скарына, «вялікаю ласкаю» ўсё блізкае, крэўнае. Высокія пачуцці прымушаюць сэрца сапраўднага беларуса біцца часцей, калі ён успамінае пра сваю далучанасць да нашай шматпакутнай, сціплай і такой прыгожай, шчодрай зямлі, да ўзгадаванага на ёй самаахвярнага, цярплівага, трывушчага, працавітага, таленавітага і мужнага народа — сваёй вялікае радні, да роднае мовы, культуры.

У паўстанцаў Кастуся Каліноўскага, аднаго з самых палымяных і шчырых змагароў за волю і лепшую долю беларусаў, быў пароль: «Каго любіш?» — «Люблю Беларусь!» — «Дык узаемна!» Заўважым: «каго?».

Гэтым самым адважныя дзецюкі сцвярджалі, што Беларусь для іх не проста нейкі сімвал, а жывая плоць і жывы дух. Кім уяўлялася яна змагарам: маці, сястрою, каханаю, дачкою? Ды ўсімі імі і ўсім! Бо нельга ў такім разуменні Айчыны адасобіць, раскласці на паліцы зямлю, народ, мову. Беларусь была іхняю існасцю.

Але, на жаль, выхаваць такое пачуццё ва ўсёй грамадзе беларусаў не ўдалося. Гісторыя ад мінуўшчыны, схаванай у тумане часу, і да сёння сведчыць, што не было ў нас ніколі спакойнага, нармальнага чалавечага развіцця, пастаянна ішло знясільваючае змаганне за права «людзьмі звацца». З Усходу і Захаду цягнулі да Беларусі свае прагныя рукі, разрывалі яе на часткі «дабрадзеі»-шавіністы, зброяй, страхам і маною прышчапляючы сваю мову, культуру, усталёўваючы свае парадкі.

Праўда, быў нядоўгі перыяд, калі заглянула сонца і ў наша аконца. Беларускае адраджэнне ў канцы XIX і на пачатку XX стагоддзя ішло бурна, актыўна. На той час русіфікацыя і паланізацыя, якімі б моцнымі яны ні былі, яшчэ не закранулі вёску, глыбінныя пласты народа. На хвалі адраджэння ён вынес да жыцця вялікую творчую сілу — мастацкую, навуковую, тэхнічную інтэлігенцыю, якая самааддана змагалася за нацыянальную годнасць і незалежнасць, за будучыню Беларусі. Але ўсё лепшае, што зазелянела сакавітаю рунню, было затым пад корань вынішчана грамадзянскай вайною, сталіншчынаю, фашыстоўскай навалаю, гадамі казарменнага сацыялізму, партыйнага манапалізму і дыктату, паслужлівай дзейнасцю мясцовых «суперінтэрнацыяналістаў», якія віталі нацыянальны рух усюды: у Афрыцы, Азіі, Лацінскай Амерыцы, толькі не ў сябе дома.

Сем дзесяцігоддзяў інтэрнацыянал-імперская палітыка панавала ў нашым краі. Цяпер, калі крыху сціўшылася бравурная медзь парадных маршаў, прапагандысцкая траскатня, абмялела бурлівая плынь бяздумных пачынаў і пераможных рапартаў, рэляцый у цэнтр, можна спакойна агледзецца і канстатаваць. Дык што ж мы, беларусы, маем сёння?

Так, ёсць параўнаўча развітая прамысловасць, якая працуе ў асноўным на карысць цэнтра, саюзных міністэрстваў і ведамстваў, але няма тавараў, ушчэнт забруджана, зАхімізавана навакольнае асяроддзе.

Так, маем калектыўную сельскую гаспадарку, велізарныя жывёлагадоўчыя комплексы-монстры, ды разам з імі нашпігаваную атрутай зямлю, залітыя гноем рэкі і азёры, студні, а ў магазінах — непрыдатныя для харчавання прадукты або наогул пустыя паліцы.

Так, праведзена ў глабальных маштабах меліярацыя, укладзены мільярды народных рублёў, але, па прычыне нізкай якасці вядзення работ, а потым безгаспадарчасці, вялікая частка гэтых зямель так і застанецца пустэчаю, нічога не дасць людзям.

Так, у нашых хатах і кватэрах яшчэ гарацъ лямпачкі і люстры, працуюць электрапрыборы, але нябачна свецяцца і гарачыя часцінкі, радыенукліды Чарнобыля, якімі засыпана беларуская зямля, якія разам з ежаю трапляюць у нутро чалавека, і таму такім неверагодным, незямным сумам і болем працінаюць навылет душу позіркі дзяцей, што паміраюць ад лейкеміі, лейкозу.

Так, ёсць у нас сваё Міністэрства народнай адукацыі, але няма беларускіх школ у гарадах, ды і ў вёсках засталася іх жменька, няма нацыянальных вышэйшых навучальных устаноў.

Так, у рэспубліцы праводзяцца пампезныя ўрадавыя канцэрты, святы, конкурсы, агляды мастацкай самадзейнасці, прафесійныя ансамблі і спевакі раз'язджаюць па ўсім свеце, але, на жаль, як часта не чуваць з іхніх вуснаў сапраўднае роднае мовы, як патыхае ад многіх выступленняў ненатуральнасцю, лубковасцю, хоць недасведчаны чалавек у далёкім краі можа паверыць, што гэта і ёсць беларуская культура.

Так, у нас ёсць беларускамоўныя газеты і часопісы, багатая мастацкая літаратура, якой мог бы ганарыцца любы еўрапейскі народ, ёсць выдатныя энцыклапедычныя выданні, унікальны збор фальклору, таленавітыя кнігі па гісторыі, краязнаўству, але як азнаёмяцца з гэтым духоўным скарбам мільёны беларусаў, калі многія з іх ужо не толькі гаварыць — нават чытаць на сваёй мове развучыліся, калі ў кнігарні малога, які цягнецца да прыгожа аформленай, цікавай народнай казкі, маці хапае за рукаво: «Зачэм ана цібе? Эта на біларускім языцэ».

Вось і дажыліся: прыродныя рэсурсы бяздарна спажыты, зямля, лясы, рэкі і азёры знявечаны, агульны прафесійны ўзровень і выканаўцаў, і кіраўнікоў нізкі, у грамадстве пануюць спажывецтва, абыякавасць, дачасніцтва, фізічная, разумовая і маральная лянота, не спыняецца разгул хамства, нецэнзуршчыны, бескультур'я, расце масавая злачыннасць, спраўляюць баль карумпіраваныя элементы, мафія савецкага ўзору з дэвізам «ты — мне, я — табе», якая ўтульна размясцілася па гарызанталі і па вертыкалі: ад маленькага магазінчыка і да верхніх эшалонаў улады.

Адкуль жа гэта ўсё? Канешне ж, вінавата таталітарная сістэма, казарменны сацыялізм, стваральнікі і правадыры якіх і іхнія верныя служкі вялі бязлітасную вайну з уласным народам, перамолваючы ў

пачварных жорнах ГУЛАГа сумленных, таленавітых людзей у пыл або ператвараючы іх пад прэсам страху і маны ў статак пакорлівых і маўклівых рабоў. Вінавата таксама і абсурдная палітыка зліцця ўсіх народаў у адну безаблічную масу без нацыянальных асаблівасцей і адзнак, вывядзення ў кабінетах партыйных тэарэтыкаў новага гатунку чалавека з гучнаю назваю — homo sowetikus. Аднак у нашай рэспубліцы былі і спецыфічныя абставіны, якія паўплывалі на паскарэнне працэсу дэнацыяналізацыі Беларусі. Асабліва маштабна гэта адбывалася ў пасляваенны час.

Мы ўдзячныя рускім людзям, якія дапамагалі ўзнімаць Беларусь з руінаў і папялішчаў, разам з беларусамі прымалі на свае плечы цяжар катаржнае працы, дзяліліся кавалкам хлеба. Але накіраванне з Расіі ў Беларусь цэлай арміі спецыялістаў, якія займалі кіруючыя пасады ў партыйных і савецкіх органах, ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі, адукацыі і культуры, непазбежна вяло да русіфікацыі.

У параўнанні з дваццатымі гадамі сітуацыя карэнным чынам змянілася. Калі тады спецыялісты з Ленінграда, Масквы лічылі для сябе неабходным вывучыць гісторыю, традыцыі нашага краю, авалодвалі беларускаю моваю і арганічна ўключаліся ў працэс гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, то цяпер гэта было рэдкім выключэннем. Услед за прыезджымі ўсё кіраўніцтва загаварыла па-расейску, пачало ўводзіць новыя парадкі, і мясцовы люд, прывучаны слухацца начальства, браць з яго прыклад, актыўна пераймаў гэтыя звычкі, цураўся свайго, роднага.

Беларуская мова выцяснялася адусюль. І самае страшнае, што працэс гэты асабліва закрануў школу. Спачатку як выключэнне, а затым масава школы пераводзіліся на расейскую мову навучання, вучні вызваляліся ад вывучэння роднай мовы і літаратуры. Можна назваць і канкрэтных натхняльнікаў гэтага працэсу. Асабліва шчыравала нехта Уралава, якая з 1945 года займала пасаду намесніка міністра народнай асветы. Разгар гэтай кампаніі прыпадае на шасцідзесятыя гады, калі ніхто ўжо не пытаў ні ў каго згоды. Любы начальнік — загадчык аблана, районa, дырэктар школы, старшыня сельсавета або нават старшыня калгаса ці дырэктар саўгаса, якому трэба было прыстроіць сваю жонку-настаўніцу, — мог прыняць рашэнне аб пераводзе школы на расейскую мову навучання. ВНУ спынілі падрыхтоўку нацыянальных педагагічных кадраў. У школы накіроўваліся настаўнікі, якія не валодалі роднаю моваю, і вучням даводзілася слухаць на ўроках тлумачэнне на расейскай мове, а дома рыхтавацца па беларускіх падручніках. Добра ведаю гэта са свайго

вопыту, бо скончыў сярэднюю школу ў 1964 годзе. А пазней дырэктары школ і настаўнікі прымушалі бацькоў набываць дзецям падручнікі, выпушчаныя ў РСФСР. Усё гэта прывяло да таго, што і сёння ў многіх вясковых школах, якія лічацца нацыянальнымі, застаўся толькі расклад урокаў у настаўніцкай, напісаны па-беларуску, праўда, не без памылак.

Надышоў час сказаць праўду і пра ролю лідэраў рэспублікі ў правядзенні нацыянальнай палітыкі. Успамінаецца прыпавесць, якую любіў расказваць выдатны наш пісьменнік, мой добры сябра, незабыўны Уладзімір Караткевіч. Яна гучала прыкладна так. Бог, калі ствараў Беларусь, быў у добрым гуморы, а таму надта шчодры. Ён падарыў людзям многае: бары, лясы, пералескі, гаі, азёры, рэкі і маленькія рачулкі, крыніцы, узгоркі, палі, лугі, балаціны. А потым паглядзеў на працу свайго розуму і рук і падумаў: «Эге, глядзі ты, як я размахнуўся! Ды назад не забярэш». Ён пачухаў патыліцу і прамовіў: «Нічога, усё можна паправіць. Каб беларусам жыццё не здавалася мёдам, дам я ім кепскае начальства». І сапраўды, на начальства нам ніколі не шанцавала. Былі, праўда, К. Т. Мазураў і П. М. Машэраў, якія, несумненна, унеслі асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі, неаднойчы ратавалі народную гаспадарку рэспублікі ад валюнтарысцкіх загадаў, грабежніцкіх памкненняў і Хрушчова, і Брэжнева. Ды было б несумленна закрыць вочы на тое, што гэта пры іх нашы невялікія, унікальныя вёскі, якія на працягу стагоддзяў былі захавальнікамі мудрых традыцый народа, аб'яўляліся неперспектыўнымі, пры іх памірала мова, знікалі беларускія школы, тэхнікумы, ВНУ, бяднела культура. Тут яны пайшлі па шляху тэорыі «зліцця», не здолелі супраціўляцца, а часам і самі станавіліся ініцыятарамі сумніцельных пачынаў, хоць мелі рэальную магчымасць абараніць нашую нацыянальную годнасць. Што ж, яны былі таксама людзі паднявольныя, над імі вісела сякера партыйнага дыктату, але, як сказаў выдатны рускі паэт А. Т. Твардоўскі, «все же, все же...».

Я ўважліва сачу за дыскусіяй па нацыянальных, моўных праблемах, якая вядзецца на старонках друку, па радыё і тэлебачанні. Некаторыя вучоныя і дагэтуль вынікі рэпрэсіўнага, валюнтарысцкага самавольства ў нацыянальнай палітыцы, якія мы напоўніцу спажываем сёння, лічаць гістарычнай заканамернасцю, аб'ектыўным працэсам. Што зробіш, на абсурднай тэорыі зліцця моў і народаў у адзін чыгун імі абаронены кандыдацкія, доктарскія дысертацыі, з гэтага яны ядуць свой хлеб з маслам. Яе вялікасць кан'юнктура, арыентацыя на «указующий перст» прымушалі іх вельмі пільна сачыць, куды вецер падзьме. А калі яшчэ дадаць да гэтага прымітывізм мыслення, то

становіцца ясна, хто нас столькі гадоў павучае. Адзін такі вучоны калісьці пісаў дысертацыю на тэму: «Крылатыя выразы і прымаўкі ў дакладах і выступленнях І. В. Сталіна», як быццам важнейшага нічога не было. Але абараніць не паспеў, Сталін памёр. Давялося чакаць, пакуль крылатых выразаў і прымавак нагаворыць Хрушчоў. Усё было добра, прамовы Мікіты Сяргеевіча нашпігоўваліся імі (ды яшчэ якімі!) вельмі шчодра. Ды зноў асечка. Пакуль дысертацыя рыхтавалася, Хрушчоў быў скінуты з пасады. Вучоны пераключыўся на даклады і выступленні Брэжнева. Але абараніць дысертацыю так і не змог, бо на гэты раз сам сканаў.

Не думаю, што такія «тэарэтыкі» могуць дапамагчы сёння ў выпрацоўцы разумнай праграмы нацыянальнага адраджэння. Радуе тое, што ў нас ёсць сапраўдныя вучоныя, такія, як М. Ермаловіч, У. Конан, Л. Лыч, А. Грыцкевіч, У. Калеснік, М. Ткачоў і іншыя, якія не маўчалі і ў застойныя гады і зараз выступаюць з грунтоўнымі, дасведчанымі даследваннямі па гісторыі Беларусі, па моўных праблемах, дапамагаюць людзям зразумець сённяшнюю сітуацыю, вызначыць сваю пазіцыю.

Дзякуючы гераічным намаганням лепшых прадстаўнікоў творчай, мастацкай і навуковай інтэлігенцыі, а ў апошнія гады Беларускага народнага фронту, моладзі, беларускае адраджэнне (які ўжо раз!) пачало рабіць першыя крокі. Яны даюцца вельмі цяжка. Але многія людзі, у тым ліку рабочыя і працаўнікі вёскі, падаюць голас у абарону сваёй нацыянальнае годнасці, разумеюць, што далей так жыць, як мы жылі, немагчыма.

І пэўны зрух ужо ёсць. Працуюць беларускамоўныя групы ў 764 дзіцячых садках, у рускамоўных школах рэспублікі ёсць 843 беларускія класы, у 20 школах г. Мінска адкрыты беларускія класы, з тым каб у далейшым перайсці поўнасцю на беларускамоўнае навучанне, адбываюцца станоўчыя змены і ў вышэйшых навучальных установах. Можна, канешне ж, сказаць, што гэта яшчэ кропля ў моры. Але пачатак пакладзены, трэба настойліва пашыраць і паглыбляць працэс вяртання роднай мовы да жыцця.

Заўжды, думаючы пра нялёгкую, пакутніцкую долю свайго краю, я хачу да зямлі пакланіцца настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, сярод якіх пераважная большасць жанчын. Калі яшчэ і засталося ў Беларусі нешта нацыянальнае, дык гэта дзякуючы ім. Людзям сціплым, самаахвярным і мужным, якія ўвесь час былі абдзелены ўвагаю, разуменнем, матэрыяльнаю падтрымкаю, якія штодзённа адчувалі дыскрымінацыю, выслухвалі здзеклівыя заўвагі і кпіны з боку сваіх рускамоўных калег і нават вучняў, але ўпарта

працавалі, спальвалі сваё здароўе, сілы дзеля высакароднае мэты. Гэта яны не далі змялець крыніцам айчыннага слова, падтрымлівалі першыя паэтычныя ці празаічныя, мастакоўскія ці акцёрскія спробы таленавітых юнакоў і дзяўчат, гэта ад іх цепліцца яшчэ ў душах многіх беларусаў іскрынка свайго, роднага. Дзякуй вам, дарагія людзі!

Але нацыянальнае адраджэнне нельга перакладаць на плечы толькі настаўнікаў. Яно — тая справа, якая робіцца ўсёй народнай сям'ёю.

Бяспамяцтва і грэблівасць, абыякавасць і ленасць, якія пануюць у Беларусі ў дачыненні да сваёй гісторыі, мовы, культуры, — гэта не толькі самазнішчэнне. Трэба памятаць і пра дапытлівы назірк нашых суайчыннікаў, якія жывуць і па суседству, і ў далёкіх землях, раскіданыя па свеце, адлучаныя войнамі і рознымі жыццёвымі варункамі ад роднага краю. Можа, той, хто лічыць сябе беларусам, але выракся роднай мовы, стаў абыякавым да ўсяго крэўнага, усё ж адчуе сваю віну і адказнасць за анямелую, безаблічную, знявечаную Айчыну, за лёс сваіх нашчадкаў, і ўрэшце за тых, хто цягнецца да Беларусі, глядзіць на нас з глыбокім смуткам, але і з вялікаю надзеяю.

Канкрэтныя прыклады заўсёды лепей, чымся голыя павучанні і заклікі. І недарэчнасць нашага нацыянальнага жыцця, моўнае сітуацыі яны высвечваюць праўдзіва і бязлітасна.

Не так даўно разам з Рыгорам Барадуліным мне давялося пабыць на Беласточчыне. На душы было і светла, і горка. Светла, таму што сустракаліся з сімпатычнымі, разумнымі людзьмі, чулі родную мову, песні, бачылі, як дбайна зберагаюцца беларускія традыцыі, звычкі. Асабліва радасны настрой у нас быў пасля наведання ліцэяў, школ. Раскажу падрабязна толькі пра адну з іх — Пашкоўшчынскую пачатковую школу, што ў гміне Орля. Яна невялікая — крыху больш як 60 вучняў, якія ходзяць з чатырох вёсак (Кошкі, Грэдэлі, Топчыкалы, Пашкоўшчына). Вучаць дзяцей восем настаўнікаў, сярод якіх дзве беларускія філалагіні — вынускніцы Варшаўскага універсітэта. Роднае слова ў школе гучыць не толькі на ўроках. Тут існуе гурток беларускай мовы, які вядзе дырэктар Янка Добаш. Усе дзеці выпісваюць «Ніву», чытаюць газету «Літаратура і мастацтва», часопісы «Полымя», «Беларусь», «Бярозка», знаёмяцца з мастацкай літаратураю, з творчасцю пісьменнікаў Беларусі (дарэчы, іх гасцямі былі ўжо Анатоль Вярцінскі, Данута Бічэль-Загнетава, Аляксей Карпюк, Юрка Голуб), ставяць спектаклі па беларускіх п'есах, паказваюць іх у навакольных вёсках. А яшчэ ў школе ёсць вакальна-інструментальны калектыў «Зярняткі». Разам з вучнямі, якія спяваюць, іграюць на розных музычных інструментах, гітарысты — дырэктар школы Янка

Добаш і настаўнік матэматыкі мастацкі кіраўнік калектыву Юрка Жменька. Рэпертуар у асноўным беларускі, але ёсць у ім і польскія, і рускія, і ўкраінскія песні. І самі школьнікі ствараюць песні на роднай мове. Нядаўна «Зярняткі» хораша выступалі на Беларусі.

Што ўражвае ў беларускіх вёсках, у школах, ліцэях на Беласточчыне, дык гэта душэўная, сардэчная еднасць дзяцей, настаўнікаў і бацькоў. Яны — сапраўды адна сям'я. Скажам, у Пашкоўшчыне, у той дзень, калі мы гасцявалі, у школе адбылося выдатнае свята беларускага слова і музыкі, у якім актыўна ўдзельнічалі старшыня бацькоўскага камітэта Яўген Сушч, солтыс вёскі Грэдэлі Уладзіслаў Залеўскі, крамнік і пажарнік з гэтай жа вёскі Ян Ігнацюк, славуты на ўсё наваколле пчаляр з Пашкоўшчыны Мікола Куптэль (аж 100 вулляў мае!), іхнія гасцінныя, мілыя жонкі і яшчэ шмат людзей. Бачна было, адкуль у дзяцей такая павага і любоў да ўсяго крэўнага, роднага. Умеюць беластоцкія беларусы працаваць і жыць па-чалавечы, разумна і культурна. Люба глянуць на хаты, двары, гароды, палеткі. Калі паселі за сталы, цешылі вока прысмакі, якіх даўно ўжо не бачна ў нашых хатах і кватэрах (кожная гаспадыня прынесла нешта сваё, адметнае), — гусь, начыненая грэчкаю і яблыкамі, смажаная бараніна, сялянскія каўбасы, вантрабянка з бабкаю, вяндліна, кіндзюк, мёд у сотах і бог ведае, што яшчэ. І срэбная чарачка абышла нашу сябрыну. Але найболей парадавала гэтая бяседа сардэчнаю, зацікаўленаю гаворкаю, незабытымі народнымі песнямі, якія так хораша гучалі з вуснаў беластоцкіх сяброў.

І ўсё ж часта ў вандроўцы ціснула сэрца гарката. Напрыклад, у Бельску настаўнікі расказвалі, як праводзіўся конкурс сярод дзяцей на лепшае выкананне беларускай песні, дэкламацыю верша. Рыхтаваліся старанна, кожнаму школьніку хацелася перамагчы, бо толькі лепшыя з лепшых прэміраваліся паездкаю на Гарадзеншчыну. Дзецям думалася, што там яны ўсмак нагаворацца са сваімі аднагодкамі на роднай мове, развучаць новыя песні, вершы. А вярталіся яны з г. Свіслачы разгубленыя, з вачыма, поўнымі слёз і суму. За час іхняе паездкі ніводзін вучань або настаўнік так і не загаварыў з імі па-беларуску. «Што ж гэта робіцца?» — пыталіся дзеці. А што маглі сказаць ім беластоцкія настаўнікі, якія цаною такіх вялікіх намаганняў стараюцца захаваць беларускасць моладзі ў польскім асяроддзі?

Ды што тут казаць. У Гайнаўцы мы з Рыгорам Барадуліным сталі сведкамі надта паказальнае, каларытнае сцэнкі. Раніцой зайшлі ў кавярню. Бачым, што суседні столік накрыты, прытым сняданак на ім адмысловы. Падумалася, што, відаць, некага важнага тут чакаюць. І вось гэтыя асобы з'явіліся: мажны, круглатвары мужчына і такая ж

дзябёлая, з вайсковаю выпраўкаю кабета. На пінжаках у іх красаваліся дэпутацкія значкі знаёмага колеру. Як высветлілася пазней, гэта былі прадстаўнікі кіраўніцтва аднаго з нашых прымежных раёнаў. Гаспадары сустрэлі, пасадзілі гасцей і павялі гаворку на роднай мове. І тут пачулася: «Давайце разгаварываць на языку межнацыянальнаго абшчэння. На рускім языку». Ну і дзівосы! Беларусы прыехалі да беларусаў у госці і не могуць паразумецца на сваёй мове, шукаюць нейкую іншую. Далей ужо ісці няма куды.

Шмат справядлівых папрокаў пачулі мы ў час вандроўкі. Катастрафічная сітуацыя, якая склалася ў нашай рэспубліцы з роднай моваю, культураю, вельмі балюча адгукаецца ў душах беластоцкіх беларусаў. Яны, не маючы падтрымкі, занядбаныя намі, цвёрда трымаліся доўгія гады на самасвядомасці, на павазе да духоўнае спадчыны продкаў, захоўвалі мову, традыцыі, беларускія школы. Не мы — рэспубліка маштабаў сярэдняй еўрапейскай дзяржавы, з міністэрствамі адукацыі, культуры, з камітэтамі па друку, радыё і тэлебачанні, са статусам паўнамоцнага члена Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а яны — беластоцкія беларусы — падавалі прыклад, як трэба любіць Айчыну, шанаваць і дбаць пра яе мову, культуру. І падумалася (толькі зразумейце мяне правільна, людзі, у гэтым горкім роздуме): а, можа, і добра, што некалі «бацька ўсіх народаў» сваім тоўстым чырвоным алоўкам на карце, як нажом, адпаласаваў Беласточчыну ад Беларусі? Да гэтага часу і тут была б такая ж нацыянальная пустэча, як і ў нас — «на мацерыку».

А так нясуць яшчэ роднае слова і песню па свеце таленавітыя «Зярняткі» і «Васілёчкі», ёсць мілыя, слаўныя беларускія дзеткі, якія прагна лавілі кожнае нашае слова. Але як было сорамна, хоць ты праваліся скрозь зямлю, глядзець у іхнія ясныя, чыстыя вочы!

На Беласточчыне шмат праблем. Няма належнай паліграфічнай базы, сродкаў, каб выдаваць на роднай мове кнігі, газеты, часопісы. Не хапае падручнікаў па беларускай мове і літаратуры, дапаможнікаў, спеўнікаў, зборнікаў аднаактовых п'ес для школьных і ліцэйскіх драматычных гурткоў, грампласцінак з запісамі народных і сучасных песень, музыкі і шмат чаго яшчэ. Выпускнікі беларускіх школ і ліцэяў хацелі б паступаць у сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі, але такой магчымасці не маюць. І не толькі мяжа або палітычная сітуацыя таму віною. Дзе ж яны ў нас, беларускія навучальныя ўстановы? У выніку таленавітая беларуская моладзь з Беласточчыны едзе вучыцца не толькі ў Варшаву, але і ў Амерыку, Канаду, Англію.

Цісне і само асяроддзе. У сямідзесятых гадах са ста дваццаці беларускіх школ засталося каля сарака. З 12 тысяч вучняў — каля трох тысяч. Гэты працэс працягваецца. Апошнім часам з Беласточчыны ідуць і яшчэ больш трывожныя навіны: нішчацца, спальваюцца праваслаўныя храмы, ля якіх гуртуюцца беларусы. А газета «Правда» абвінавачвае беластоцкіх беларусаў у... нацыяналізме!

Магчыма, усё было б інакш, калі б у нашай рэспубліцы вялася разумная нацыянальная палітыка, улічваліся інтарэсы беларусаў і нацыянальных меншасцей. Успомнім, што да вайны ў Беларусі былі не толькі беларускія і рускія, але і польскія, яўрэйскія школы, тэатры, выходзілі газеты, часопісы. Беларусь ніколі не была месцам міжнацыянальнае варожасці, тут заўсёды панаваў дух талерантнасці, павагі да прадстаўнікоў усіх нацыянальных меншасцей: рускіх, палякаў, украінцаў, яўрэяў, літоўцаў, латышоў, татараў і многіх іншых. З вуснаў свядомых беларусаў ніколі не гучаў заклік: «Беларусь толькі для беларусаў!» Таталітарная сістэма давяла нацыянальную палітыку да абсурду, аднолькава вынішчыла моўныя, культурныя традыцыі ўсіх людзей, якія жывуць і працуюць на нашай зямлі. Беларусь на працягу дзесяцігоддзяў стала палігонам для самых розных пачынаў і эксперыментаў. Усё гэта рабілася на вачах кожнага жыхара рэспублікі, і таму многія прадстаўнікі нацыянальных меншасцей горача падтрымліваюць суверэнітэт, незалежнасць Беларусі, наданне беларускай мове статуса дзяржаўнай. А беларусы са свайго боку вітаюць стварэнне грамадска-культурных таварыстваў нацыянальных меншасцей, прадастаўленне ім магчымасці адрадзіць свае культурныя традыцыі.

Але, як бачым, не ўсім падабаецца такое развіццё падзей. Некаторыя мясцовыя палітыканы з ліку партыйнага чыноўніцтва, выпешчанага казарменным сацыялізмам, спрабуюць зноў разыграць старыя карты: то расійскую вялікадзяржаўніцкую з мэтай вярнуць Беларусь у рамкі «Северо-Западного края», то польскую шавіністычную, якая грунтуецца на вызначэнні «Усходнія Крэсы», і тым самым стараюцца стварыць на нашай зямлі новую, гарачую кропку. За ўсім гэтым, як сведчыць ход падзей, стаяць не толькі гістарычнае і культурнае невуцтва, палітычны авантурызм, але і звычайныя карыслівыя памкненні любым спосабам дамагчыся дэпутацкіх мандатаў, пакінуць за сабою кіраўнічыя крэслы, застацца пры ўладзе.

Чаму беларускія чыноўнікі так паталагічна ненавідзяць родную мову, культуру, народныя традыцыі? Адкуль гэта ідзе? Як паказвае гісторыя, самыя небяспечныя, самыя зацятыя ў варожасці да сваёй мовы, культуры тыя, хто аднойчы ім здрадзіў, іх выракся. Прызнаць свае памылкі здольны не кожны. І яшчэ — знішчаць заўсёды легка, а

будаваць, адраджаць складана. Колькі трэба цяпер прыкласці намаганняў, каб вярнуць роднаму слову ягонае належнае месца! А працаваць не хочацца. Прасцей захаваць усё, як ёсць, а тых, хто хоча бачыць свой народ сапраўдным народам, абвінаваціць у нацыяналізме.

Пастаяннае вытраўліванне з жыцця людзей роднай мовы не прайшло бясследна. Моўны нігілізм беларусаў прыводзіць у шокавы стан кожнага, хто завітае ў рэспубліку з іншых краёў. Госці здзіўляюцца не толькі таму, што на вуліцах гарадоў не чутно ніводнага беларускага слова, але і той агрэсіўнасці, з якой асобныя «беларусы» нападаюць на родную мову: «Плохой у нас язык. Какой-то он корявый, грубый. Потому и не говорим на нем». Так, вельмі сорамна, але трэба прызнаць, што на Беларусі шмат развялося «Нікіцієў Зносіловых» і «Нікіціушаў Зносіловскіх», якіх геніяльны Янка Купала вывеў у п'есе «Тутэйшыя». Сённяшняя сітуацыя ў рэспубліцы паказвае, што гэты твор яшчэ доўга будзе актуальны і невядома калі чытачы і гледачы, якія будуць жыць у адроджанай Беларусі, пасмяюцца з галоўнага героя п'есы Мікіты Зносака без шчымлівага пачуцця безвыходнасці.

Дык вось, строгія «крытыкі» роднай мовы, з вашай ацэнкаю не пагодзіцца ніводзін адукаваны чалавек у свеце! Беларускай мове трэба дзякуй сказаць за тое, што яна, знаходзячыся ў неймаверна цяжкіх умовах, не толькі выжыла, але і данесла ў наш дзень са старажытнасці агромністае лексічнае багацце, захавала столькі цудоўных унікальных праславянскіх слоў, што, як сведчыць філалагічная навука, з'яўляецца адной з самых цікавейшых моў у славянскім коле. У Рыме, ва універсітэце, мне давялося сустракацца і гутарыць з аспірантамі-філолагамі, якія займаюцца славістыкаю, даследуюць рускую, украінскую і... беларускую мовы. Сярод іх італьянцы, шведы, іспанцы, французы. Але ўразіла не столькі гэта (хоць і было надзвычай прыемна!), як тое, што сярод аспірантаў убачыў я двух прадстаўнікоў афрыканскіх краін. Уяўляеце, на вуліцах Мінска яшчэ паспрабуй адшукаць чалавека, з якім можна было б пагаварыць на роднай мове, а тут, у Рыме, афрыканцы вядуць з табою гаворку пабеларуску! Можа, хоць гэта кране вашы душы, ваша сумленне, землякі-нігілісты?

Нацыянальнае адраджэнне, самасцвярджэнне — гэта не нацыяналізм або сепаратызм. Для нас, беларусаў, яны — адзіны сродак, каб уратавацца. Без штодзённага рабочага ўжытку роднай мовы, без пастаяннага скарыстання нацыянальных духоўных каштоўнасцей нельга ўявіць народ як паўнакроўны, жывы, здаровы арганізм. Усё ў жыцці народа ўзаемазвязана. Духоўны пачатак заўсёды дапамагае не толькі

ўсталяванню маралі, нармальных чалавечых узаемаадносін, але і спрыяе якаснаму развіццю матэрыяльнага побыту. Разам з роднай мовою, культурнымі традыцыямі чалавек страчвае вельмі многае, мяняецца нават ягоны характар, натура, прытупляюцца пачуцці самапавагі, адказнасці за сваю зямлю, яе будучыню, за лёс нашчадкаў у гэтым неспакойным і жорсткім свеце.

Для беларусаў надышоў гістарычна вырашальны час, які, відаць, ніколі больш не паўторыцца. І не выкарыстаць яго было б найцяжэйшым злачынствам. А таму кожнае беларускае сэрца павінна біцца не так, як раней. Гэтае біццё сёння чуваць. Ёсць яшчэ людзі, якія не забываюцца, памятаюць, якога яны роду-племя, якія захоўваюць і аберагаюць, перадаюць дзецям родную мову, не даюць ёй згаснуць, як полымю свечкі пад павевам сцюдзёнага ветру забыцця. Беларускае сэрца чутно не толькі ў Беларусі, але і ў Сібіры і на Далёкім Усходзе, на Валдаі і на Алтаі, у Казахстане і на Украіне, у Літве і ў Латвіі, у Ленінградзе і ў Маскве, а таксама за мяжою — на Беласточчыне, у ЗША, Канадзе, Англіі, ФРГ, Францыі, Аргенціне, Мексіцы і нават у такой далёкай Аўстраліі. Успомнім хоць бы нашага амерыканскага беларуса, выдатнага спевака Данчыка. Ягоны прыезд, сустрэчы з нашымі людзьмі і асабліва з моладдзю, бліскучыя канцэртныя выступленні, шчырае, усхваляванае слова пра сваё жыццё, пра любоў да матчынай зямлі, яе непаўторных песень ускалыхнулі ўсю Беларусь, зрабілі так шмат для адраджэння мовы, нацыянальнае свядомасці.

Беларускае сэрца паклікала падпісацца на беларускамоўныя выданні многіх суайчыннікаў у розных кутках свету, хоць іх і пазбаўлялі гэтай магчымасці ў час падпісной кампаніі. Чыноўнікі-шавіністы расейскае арыентацыі спрабавалі сарваць падпіску і ў рэспубліцы, але ўсё ж выданні на роднай мове будуць жыць.

Прадстаўнікі партыйна-дзяржаўна-ваенна-гаспадарчай наменклатуры, якая кіравала сем дзесяцігоддзяў і прывяла нас да катастрофы, якая ўжо ў час перабудовы аддала краіну на разрабаванне розным дзялкам, спрабуюць сёння перакласці адказнасць і цяжар эканамічных, сацыяльных, нацыянальных праблем на плечы дэмакратаў. Пасля пярэпалаху і разгубленасці яны «выйшлі з акопаў» і робяць усё для таго, каб спыніць дэмакратычны рух, каб падарваць аўтарытэт людзей ініцыятыўных, не зашораных ідэалагічнымі догмамі, якія хочуць дапамагчы народу будаваць сапраўднае жыццё. Напружанне нарастае, і трэба ўсім нам зрабіць свой выбар: або зноў мы будзем будаўнікамі апаратнага сацыялізму, або станем жыць нармальна, пачалавечы, як усе цывілізаваныя людзі.

Сёння пры злавесным святле двух Чарнобыляў — духоўнага і радыяцыйнага — выразна бачна, хто ёсць хто. Ні сумленныя, добрыя, ні подлыя, гнюсныя ўчынкі не пройдуць бясследна. Усё залічыцца спаўна. У памяці нашчадкаў застануцца людзі, якія ратавалі, нават цаною свайю жыцця, будучыню Беларусі. Але народная памяць захавае імёны і тых, хто, як шашаль, падточваў нашу духоўную і фізічную існасць, хто нават такую бяду, як чернобыльская, сувымяраў з уласным дабрабытам і спакоем, на пакутах і здароўі людзей рабіў кар'еру. Іх таксама будуць помніць, толькі той памяццю, ад якой не будзе ім спакою ні на гэтым свеце, ні на тым.

Мы, беларусы, на працягу сваёй неймаверна трагічнай гісторыі ўжо неаднойчы былі на мяжы згубы: і духоўнай, і фізічнай. Дагэтуль у народа яшчэ знаходзіліся сілы, каб выжыць. Ці зможам цяпер? Магчыма, гэтыя словы прагучаць і бязлітасна, і жорстка, але, часам, мне здаецца, што жахлівая чарнобыльская бяда, якая расцягнецца на стагоддзі і невядома чым скончыцца, паслана нам невыпадкова. Той, хто здрадзіў запаветам сваіх продкаў, выракся роднай мовы, культуры, традыцый, глумліва растаптаў духоўныя і матэрыяльныя набыткі папярэднікаў, абмяняў любоў да сваёй зямлі, спаконвечную мудрасць, вальнадумнасць і нацыянальную годнасць на пустадомства, лізаблюдства і ўгодніцтва перад дачаснікамі і цемрашаламі, заслугоўвае суровай кары. Толькі заўсёды думаеш: як гэта страшэнна несправядліва, як балюча і горка, што за здраду, тупасць і бязмозгласць соцень або нават тысяч павінен адказваць, несці цяжкі крыж пакутаў, знявагі і сораму ўвесь народ!

Людцы родныя, што ж гэта дзееецца з намі? Да чаго ж мы дажылі! Няўжо і цяпер — на краі бездані — не ўскалыхнуцца нашы душы, не заб'юцца ўстрывожана нашы сэрцы?

Пасля прыняцця парламентам Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі, Закона аб мовах, знаходзячыся ў стане папяровай эйфарыі, мы шмат гаворым і пішам пра дзяржаўнасць нашае мовы. Але адкуль ёй — гэтай дзяржаўнасці — быць, калі няма самой дзяржавы?

Пакуль не будзе ў Беларусі сапраўднай незалежнасці, рэальнага суверэнітэту — ніколі не вырашацца нацыянальныя, моўныя пытанні, як не вырашацца і эканамічныя, сацыяльныя, экалагічныя праблемы, якія знясільваюць людзей. Без свабоды, без пачуцця чалавечае годнасці, без адчування, што ты — гаспадар сваёй зямлі, свайго прадпрыемства, свайго жыцця, не будзе і хлеба, аб чым яскрава сведчаць рэаліі нашага сённяшняга побыту.

Беларусы! Давайце ўсёй народнай сям'ёю пераадолеем сваю спрадвечную пакорлівасць, рахманасць і даўні страх перад «сільны-

ми мира сего». Нам няма каго і няма чаго баяцца. Мы — на сваёй зямлі, пад сваім небам. Нам трэба выжыць. І ўрэшце, што такое нашы ўласныя нягоды ў параўнанні з вялікай мэтай, якая сілкуе веру і ўпэўненасць, — святая справа не згінула, жыве Беларусь!

Дык абудзіся ж, беларускае сэрца, не маўчы, не маўчы, не маўчы!

*Красавік 1991 года*

## ВЕРУ Ў РОЗУМ НАРОДА

Сёння ўсім сумленным людзям вельмі цяжка: і ў маральным, і ў матэрыяльным плане. І ўсё ж наш час незвычайны. Дзіву даешся — колькі важных для нас падзей умясціў у сябе ўсяго адзін тыдзень жыцця. У пачатку яго мы перажылі страшный дні прыніжэння, сораму і ганьбы, калі цынічная, нахабная хунта, выпеставаная самай артадаксальнай, рэакцыйнай часткай КПСС, КДБ, МУС, арміі і ваеннапрамысловага комплексу, паспрабавала задушыць не толькі свабоду і дэмакратыю, растаптаць не толькі суверэнітэт рэспублік, але і нашу асабістую чалавечую годнасць. У сярэдзіне, пасля гэтых трох чорных дзён і начэй, уздыхнулі з незвычайнай палёгкаю і вялікай радасцю, бо з нас зняты пакуль што новенькія наручнікі дыктатуры, якія вось-вось павінны былі зашчоўкнуцца не толькі на руках, але і на нашых душах. А ў канцы тыдня мы зноў трапілі ў стрэсавую сітуацыю — з трывогай, справядлівым абурэннем і пэўнай доляй радасці сачылі за работай беларускага парламента, дзе на нечарговай сесіі, скліканай па патрабаванні апазіцыі, дэмакратычныя сілы Вярхоўнага Савета рэспублікі вялі гераічнае змаганне за праўду і справядлівасць з кансерватыўнай, рэакцыйнай пераважнай большасцю. Гэтая барацьба дала свае вынікі: прыняты пастановы аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ — КПСС на тэрыторыі рэспублікі, аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларусі.

Аднак на душы трывожна. Жахае бездапаможнасць простага сумленнага чалавека перад пачварнай сістэмай, якая пайшла на яго з танкамі, кулямётамі і аўтаматамі. І гэта ў краіне, якая лічыла сябе самай дэмакратычнай у свеце, і гэта ў канцы XX стагоддзя!

Успамінаецца, як пасля загаду партыйных органаў не даваць мне магчымасці выступаць у масавых аўдыторыях перапалоханы дырэктар педвучылішча, навучэнцы якога запрасілі мяне на сустрэчу, званіў у Саюз пісьменнікаў і гаварыў, што ў іхняй актавай зале прарвала трубы, а таму прыняць пісьменніка яны не могуць. Выступ-

ленне ўсё ж адбылося, праўда, не ў актавай зале, а ў адной з аўдыторый. Выкладчыкі і навучэнцы сказалі мне пасля сустрэчы, што пра трубы дырэктар схлусіў. Я толькі пасмяяўся з гэтага. Колькі такога падману было ў нашым жыцці! Але і гэтая маленькая хлусня была часцінкай той вялікай партыйна-дзяржаўнай хлусні, якая аблытвала наша грамадства, людзей больш за семдзесят гадоў.

І ўсё ж трубы прарвала! Прарвала трубы ў з'едзенай іржой дыктату, фальшу, кар'ерызму і ўгодніцтва грамадскай сістэме, і ўвесь яе бруд выплюхнуўся на нашыя вочы. Пройдзе час, і тыя, хто быў у хунце, хто натхняў, а таксама падтрымліваў яе, у тым ліку і ў нашай рэспубліцы, атрымаюць па заслугах. Канешне ж, не надта прыемна атрымліваць замест ордэнаў ордэры, але, што зробіш, кожная ўзнагарода павінна знайсці свайго героя.

Аднак не гэта галоўнае. Справа ў тым, што сістэма выгадавала цэлую армію кіруючых крыкуноў, якія нічога карыснага грамадству не прыносяць, але зубамі і рукамі трымаюцца за ўладу і за размеркавальнік. Гэта тыя, хто наверсе. А што, унізе усё добра? Не! Маецца безліч людзей сквапных і зайздросных, пасіўных, якія задавальняюцца чарговай падачкай, якім напляваць на ўсё і на ўсіх. Гэтыя сілы — наменклатурная і люмпенская — аснова новых пераваротаў і путчаў.

Але цешыць тое, што сітуацыя паступова мяняецца. На першы план выходзяць людзі іншага складу: шчырыя працаўнікі, у якіх адкрыліся вочы на ўсё, што робіцца вакол іх. Пераварот закрануў іх за жывое, ускалыхнуў душу.

Суботу і нядзелю я правёў на вуліцах і галоўнай плошчы сталіцы, гутарыў з людзьмі. Многія з іх пачынаюць разумець сваю асабістую адказнасць за будучыню рэспублікі. Простым людзям — сівым бабулькам, ветэранам, маладым маці з немаўлятамі на руках, юнакам і дзяўчатам — неабыякава, які іх чакае лёс. І гаворка ішла без істэрыкі, разумна і спакойна. Я радуюся, што ёсць сярод нас столькі мудрых, разважлівых суайчыннікаў.

Былі і іншыя суразмоўнікі: злосныя, крыклівыя, з вачыма, поўнымі нянавісці.

Так, усе мы розныя, але ўсім нам наканавана жыць тут, на беларускай зямлі. Рэспубліка аб'явіла палітычную і эканамічную незалежнасць. Наперадзе вялікая і цяжкая праца па стварэнню такога грамадства, якое не будзе рабаваць людзей, а стане служыць ім, адстойваць правы кожнага чалавека. І будаваць яго нам трэба ўсёй народнай сям'ёю, дзе ёсць правыя і левыя, кансерватары і дэмакраты, цэнтрысты. Будаваць на той зямлі, якая гібее пад чарнобыльскай навалай.

Так, наводзіць парадак і дысцыпліну трэба. Але ж якімі захадамі і метадамі? Да кожнага рабочага, селяніна, прадстаўніка інтэлігенцыі нельга прыставіць па аўтаматчыку. Ды і якая будзе праца пад руляю аўтамата?! Усе складаныя праблемы нашага палітычнага і эканамічнага жыцця неабходна вырашаць цывілізаваным шляхам.

Самае важнае, каб у будаўніцтве новай, незалежнай Беларусі ўзяў верх здаровы, разважны сэнс, каб усім нам потым не было сорамна перад нашчадкамі.

*Жнівень 1991 года*

## СВЯТКАВАЦЬ ПЕРАМОГУ ЯШЧЭ РАНА

Няхай прабачыць мне шаноўны чытач, што свае нататкі пачынаю з асабістага. Але інакш нельга. Сёння асабістае настолькі цесна пераплялося з агульналюдскім, што аддзяліць яго немагчыма.

Вось яно, гэтае асабістае: «Партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі ад Законнікава С. І.

Заява

*Я быў членам КПСС васемнаццаць гадоў. Не перакрэсліваю ўсё добрае, што здзейснена за гэты час у краіне і нашай рэспубліцы сумленнымі, працавітымі людзьмі, у тым ліку і многімі членамі партыі. Аднак атмасфера дыктату, фальшу, хлусні, дэмагогіі, угодніцтва і кар'ерызму, якая ў першую чаргу стваралася і падтрымлівалася партыйнымі органамі, прывяла наша грамадства да крызісу ў палітычным, эканамічным, сацыяльным і духоўным жыцці.*

*Нічога не змянілася ў лепшы бок і з прыходам перабудовы. Наадварот, пачалося і працягваецца шальмаванне ў партыйным друку прадстаўнікоў інтэлігенцыі, усіх дэмакратычных сіл, даходзіла і да прымянення фізічнай расправы. Непрыглядная, двурушная пазіцыя многіх вышэйшых партыйных кіраўнікоў яскрава праявілася ў іх адносінах да вырашэння чарнобыльскіх праблем, да праграмы нацыянальнага адраджэння, развіцця роднай мовы і культуры, у час перадвыбарчай і выбарчай кампаній. На шматлікія звароты інтэлігенцыі ў ЦК КПБ не было нават адказу. Спадзевы, што будзе нейкі паварот да шчырасці, прынцыповай і разумнай ацэнкі становішча на XXXI з'ездзе КПБ, аказаліся марнымі. Верх узялі кансерватыўныя, рэакцыйныя сілы, якія ўмела выкарысталі апаратныя гульні для навязвання сваей волі.*

*Крывавыя падзеі ў розных рэгіёнах краіны і асабліва ў Прыбалтыцы сведчаць пра нязменнасць курсу КПСС на дыктат,*

*прымяненне ваеннай сілы, пра нежаданне прыслухацца да думкі і голасу народаў, якія не хочуць болей жыць ва ўмовах нацыянальнага прыніжэння, рэпрэсій, страху, жабрацтва і разрухі. Кволыя парасткі дэмакратыі могуць быць растаптанымі дыктатурай. Як пісьменнік і грамадзянін я ў гэты трывожны час павінен зрабіць выбар, адстойваць, што б ні здарылася, дэмакратычныя прынцыпы, праўду і справядлівасць, незалежнасць і годнасць свайго народа,*

*Лічу для сябе амаральным падтрымліваць тую партыю, дзе галасы радавых яе членаў нічога не вырашаюць, а велізарная армія партыйных функцыянераў старой закалкі, якая па-ранейшаму узурпіруе ўладу, працягвае праводзіць таталітарысцкую, антыдэмакратычную, антынацыянальную, антынародную палітыку.*

*28 студзеня 1991 года».*

Адразу ж паслужлівыя партыйныя клеркі даставілі гэты дакумент у ЦК КПБ...

Але я працытаваў радкі заявы не дзеля таго, каб пакрасавацца, вось, маўляў, які адважны ўчынак зрабіў. Не! Там былі вельмі важныя словы пра дыктатуру, таталітарызм. Не адзін я, мільёны людзей пра гэта трывожна думалі, гэтага баяліся, гледзячы, як імкліва набірае сілу рэакцыя, хоць не ўсе гаварылі адкрыта. І яно адбылося. Па-зладзейску, ноччу групай самазванцаў была зроблена спроба захапіць у краіне ўладу. Тры страшныя дні і ночы цягнуліся, як вечнасць.

І вось усе сумленныя людзі, аглушаныя, шакіраваныя весткай пра пераварот, нарэшце ўздыхнулі з палёгкаю, калі пачулі, што авантура сарвана, што дзяржаўныя злачынцы арыштоўваюцца, што з вуліц Масквы, Ленінграда, Вільнюса, Рыгі і Таліна выведзены баявая тэхніка і войскі.

Мы перажылі разам з гераічнымі масквічамі, расіянамі хвалюючыя хвіліны, гледзячы на ажыўшыя экраны тэлевізараў, з якіх ужо не вяшчалі дыктары з цвердакаменнымі, змрочнымі тварамі і мінорна-ўрачыстымі галасамі, а паказвалася сапраўды грандыёзнае відовішча — мітынг пераможцаў.

Сёння ў нашых сэрцах — радасць і глыбокая ўдзячнасць мужнаму і рашучаму Прэзідэнту Расіі Б. М. Ельцыну і яго надзейным паплечнікам, адважным масквічам, расіянам, якія дапамаглі ім выстаяць.

Цяпер, калі мы крыху ачунялі ад стрэсу, які абрынуўся на нас у гэтыя трагічныя дні, калі аціхае хваля эйфарыі, неабходна сур'ёзна думаць: як жыць далей? Што ж высвеціў, якія ўрокі даў нам пераварот?

Самае галоўнае — дэмакратычныя заваёвы не сталі незваротнымі і ў любы момант могуць быць растаптанымі і знішчанымі. Праявілася і сіла, якая прагне гэтага, — самая артадаксальная частка кіраўніцтва Камуністычнай партыі, КДБ, МУС, арміі і ваенна-прамысловага комплексу. Планы, намеры відавочныя: не дапусціць развіцця дэмакратыі, глыбокіх эканамічных рэформ, захаваць сваё прывілеяванае становішча ў грамадстве, рэаніміраваць і яшчэ больш узмацніць у краіне таталітарызм.

Не менш важнае — народ, які адчуў сябе, хоць і не да канца, але гаспадаром свайго жыцця, які пачаў выпростваць свае плечы, назад у рабства загнаць не па сілах нікому.

Добра, што мы ўбачылі маральнае аблічча людзей, якія намі кіруюць. І на наступных выбарах будзем больш уважлівыя і прынцыповыя ў сваім галасаванні.

З самага пачатку авантуры стала ясна, што пераварот робіцца злачынцамі. І да гэтага асобы, якія ўвайшлі ў так званы дзяржаўны камітэт па надзвычайнаму становішчу, былі непапулярныя ў народзе ў сілу сваёй шэрасці, прыходу на высокія кіруючыя пасады пад націскам, пасля «выкручвання рук» дэпутатам. Зараз яны праявіліся ў поўнай «красе». Зварот «васьмёркі» да народа з папулісцкімі бездапаможнымі дэкларацыямі быў успрыняты як чыстай вады дэмагогія. Мы такога ўжо начыталіся і наслухаліся. Скажам, ад былога саюзнага прэм'ера М. Рыжкова, ад высокапастаўленых партыйных чыноўнікаў В. Ніканава, А. Біруковай, якія амаль кожны месяц раз'язджалі па замежжы, вывучаючы перадавы вопыт, а потым у шматлікіх інтэрв'ю расказвалі, як яны накормяць, апрануць і абуюць народ. Дзе яны зараз? Раскашуюцца на шыкоўных дачах, пабудаваных за народныя грошы, а затым выкупленых імі за бясцэнак. Страшна становіцца, калі падумаеш: колькі ж такіх і меншых рангам персанальнікаў сядзіць на народным карку!

Хто ж ім — былым і сённяшнім адказным кіраўнікам — не даваў рашаць харчовую і жыллёвую праграмы, хто перашкаджаў змагацца з карупцыяй, мафіяй, злачынным светам або даць гарадскому насельніцтву для садова-агародных работ гэтыя злашчасныя 0,15 гектара і г. д.? Тыя, хто разбурыў эканоміку, хто зрабіў народ жабраком, хто ўзвінціў цэны ў 5-6 разоў, зараз абяцаюць іх замарозіць альбо знізіць. Смешна! Ніякай праграмы вывядзення краіны з крызісу ў прадстаўнікоў «надзвычайкі» не было. Затое ў змоўшчыкаў білі праз край выключна цынічнае нахабства, тупое самалюбства, амбіцыі. Але праз усё гэта праступаў страх. Не, недарма на прэсканферэнцыі дрыжалі рукі, шарэлі твары ў авантурыстаў, не дарма неўзабаве хапіў

крыз высокапастаўленага путчыста. Яны добра ведалі, што робяць злачынства, за якое давядзецца адказваць, але спадзяваліся, як і ранейшыя змоўшчыкі, на апатыю, рабскую пакорлівасць народа. Некалькі гадоў назад гэтая авантура, магчыма, і завяршылася б паспяхова. Толькі не сёння. Народ ужо не той. Выйшла асечка.

У час перавароту прайшло праверку шырока дэкларуемае адзінства арміі і народа. Састарэлыя і маладзейшыя генералітэтчыкі кінулі, як рабілі гэта ўжо неаднаразова, у крывавую прорву маладых хлопцаў, салдатаў, ачмураных артадаксальнай камуністычнай армейскай прапагандай. Лампаснікам, якія дзесяцігоддзямі сядзяць пры поўным карыце, ёсць што губляць: асабістыя самалёты, якія абслугоўваюць не толькі іх, але і дамачадцаў, агромністыя кватэры, шматгектарныя дачы, машыны, прыслугу і г. д. А за што ж павінны ісці супраць свайго народа салдаты, якія заўтра здымуць пагоны і стануць тым жа народам? Але ж, хоць і не па сваёй віне, пад прымусам загадаў і ў сілу свайго няведання сітуацыі (ім спецыяльна не ставілі адразу задачу), пайшлі. Добра, што яны не адкрылі масіраваны агонь па безабаронных людзях. Ды ўсё вісела на валаску. Магла праліцца вялікая кроў.

Падзеі перавароту паказалі, што неабходны тэрміновыя дэпартызацыя і рэарганізацыя арміі. Яна павінна ачысціцца ад састарэлых «палкаводцаў», быць прафесіянальнай і выконваць толькі свае задачы, не станавіцца які ўжо раз марыянеткай у руках змоўшчыкаў, палітыканаў любой афарбоўкі. Гэта тычыцца таксама КДБ і МУС.

Пераварот высвеціў сапраўдны твар дзвюх сіл: і кансерватараў, і дэмакратаў. Увесь час кансерватыўная кіруючая вярхушка палохала народ грамадзянскай вайною, да якой нібыта падштурхоўваюць наша грамадства дэмакраты. А цяпер мы ведаем, хто спрабаваў развязаць вайну са сваім народам, працягваючы крыважэрныя сталінскія традыцыі.

Беларусь была на перыферыі падзей, але і для яе пераварот стаў экзаменам, праверкай: хто ёсць хто. У той час, калі многія рэгіёны Расійскай Федэрацыі (пераважная большасць!) аказалі актыўнае супраціўленне хунце, наша нібыта суверэнная рэспубліка паказала сваю поўную бездапаможнасць перад чорнаю сілаю, якая ўзнікла на даляглядзе з боку цэнтра. Яна, нібы вайсковае падраздзяленне пад камандай партыйных «генералаў», узяла пад казырок і паспяшалася паперад бацькі ў пекла, каб выканаць загады дзяржаўных злачынцаў.

Канешне ж, у падтрымцы хунты з боку Бюро ЦК КПБ нічога дзіўнага няма. Гэтага можна было чакаць. А вось нерашучую, сарамяжлівую рэакцыю Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР на ўвядзенне ў краіне дыктатуры зразумець нельга. Наш вышэйшы орган

улады не адгукнуўся на патрабаванне парламенцкай апазіцыі даць праўдзівую ацэнку падзеям, не выказаў рашучы пратэст супраць хунты, якая пераступіла праз волю беларускага народа, якая растаптала дэклараваны суверэнітэт Беларусі, якая, урэшце, хацела адабраць уладу ў яго самога, у абраных народам парламентарыяў.

У апошніх падзеях трэба яшчэ сур'ёзна разбірацца. Хунта прытупнула, і на некалькі дзён суверэнная рэспубліка анямела, аглухла і аслепла. Чаму замоўкла наша радыё і тэлебачанне? Хто заціснуў рот дэмакратычнай прэсе? На гэтыя і многія іншыя пытанні мы павінны атрымаць адказ.

Мы, беларусы, убачылі, што папяровым суверэнітэтам, як фігавай лісцінкай, ад агрэсіі, ад дыктатуры з цэнтра не прыкрыешся, не абаронішся. Нам патрэбны сапраўдныя незалежнасць і суверэнітэт.

Нечарговая сесія парламента, скліканая па патрабаванні апазіцыі, пасля сапраўды гераічных намаганняў усіх дэмакратычных сіл прыняла пастановы аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ — КПСС на тэрыторыі рэспублікі, аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларусі. Гэта вялікая перамога!

Аднак у час работы сесіі выявілася і выключная агрэсіўнасць, ваяўнічае непрыняцце разумных прапаноў так званай пераважаючай большасцю, парламенцкім «партыйна-гаспадарчым актывам». Гэтыя людзі ўжо не кляліся ў вернасці камуністычным ідэалам, пад імі, як і раней, яны мелі на ўвазе сваю неабмежаваную ўладу і поўнае карыта. Тыя, хто сядзеў ля экранаў тэлевізараў, убачылі, як адбывалася гэтае «карытнае змаганне»: упартасць, зацятасць, злосць і разам з тым (трэба аддаць ім належнае!) — незвычайная выдумка, уменне лавіраваць, выкручвацца з любой сітуацыі. Вось бы гэтыя якасці ды на добрую справу!

Мінчан, прадстаўнікоў Оршы, Полацка, Наваполацка, Салігорска, Мазыра і іншых гарадоў, якія сабраліся на плошчы перад Домам урада, у сваіх прамовах некаторыя дэпутаты-наменклатуршчыкі грэбліва ахрысцілі «натоўпам». Іх настрой быў усё ж сапсаваны, калі на трыбуну сесіі падняўся прадстаўнік страйкамаў і сказаў сваё важкае, рашучае, рабочае слова.

Шкада, што экраны тэлевізараў не паказалі «ваяўнічых» дэпутатаў у той сітуацыі, калі тысячы людзей на плошчы скандзіравалі: «Хунта!», «Ха-луі!», «Да-лоў!», «За-ба-стоў-ка!», а яны, угнуўшы галовы ў плечы, спалохана беглі да персанальных машын. Не, шаноўныя савецкія паны, вы памыляецеся! Натоўпу на плошчы не было, гэта быў народ!

Сёння стала дыхаць крышку лягчэй, ды не трэба расслабляцца. Яшчэ рана святкаваць перамогу, таму што гарыць кроў бязвінных людзей на тбіліскім, вільнюскім, рыжскім, а зараз і на маскоўскім асфальце. Барані Бог, каб яна не зачырванела на мінскім!

Рана, таму што карані сталінізму надзвычай жывучыя, таму што сярод нас застаюцца рэакцыянеры: старыя і маладыя, яўныя і тайныя. Адны з іх праходжваюцца або сядзяць на лавачках у скверах, другія — засядаюць у саветах ветэранаў, трэція — служаць у рэпрэсіўных органах і арміі, чацвертыя — маюць дэпутацкія мандаты, займаюць адказныя пасады, прытым усюды і на ўсіх узроўнях. Яны ўжо задаволена паціралі рукі, гатовыя павесці масіраваную атаку на дэмакратыю, ды не ўдалося. Зараз сталіністы да пэўнага часу прыціхнуць, але ніколі яны не пераменяцца.

Рана, таму што ў Беларусі ёсць свае янаевы і паўлавы, кручковы і пугі, язавы і бакланавы, цізяковы і старадубцавы. Ёсць жырыноўскія і андрэевы. Яны такія ж шэрыя, але не менш цынічныя, нахабныя і агрэсіўныя. Яны пастараюцца выкарыстаць любую магчымасць, каб пайсці ў наступ, зрабіць Беларусь «бананавай рэспублікай» з усімі яе пачварнымі атрыбутамі.

Рана, таму што ўсё можа паўтарыцца, толькі па больш вытанчаным і дасканалым у сваёй жорсткасці сцэнарыі.

Улічваючы ўрокі перавароту, беларускі народ павінен рашуча асудзіць тых, хто дапамагаў хунце надзець на яго хамут дыктатуры, смела выступіць на абарону дэмакратыі і сваёй незалежнасці. Мы помнім згуртаванасць і рашучасць рабочых Мінска і іншых гарадоў рэспублікі ў красавіку гэтага года. Думаецца, што кавалак каўбасы не стане для нашага народа даражэй свабоды, годнасці і сумлення. Наперадзе цяжкая праца. І перамогу святкаваць яшчэ рана.

*Жнівень 1991 года*

## БЕЗ ЛЮБОВІ СТВАРАЦЬ НЕМАГЧЫМА

Я заўсёды баюся высокіх слоў. Ад частага ўжывання яны губляюць свой глыбінны змест і сэнс, блякнуць. Але надыходзіць такі час, у які гэтыя словы набываюць новае гучанне, а тое, што яны азначаюць, становіцца рэальнай сілаю ў пабудове нармальнага чалавечага жыцця.

І першае з іх — любоў. Прачытаўшы такое, многія з вас могуць толькі пасміхнуцца. Зараз, калі людзей сціснула, раструшчыла ў сваіх злавесных абдымках жабрачае матэрыяльнае і духоўнае існаванне,

калі ў грамадстве згублены маральныя арыенціры, калі разлілося мора варожасці, злосці і нянавісці, ён зноў выносіць на божы свет зацяганае ўсімі хрысціянскае, біблейскае слова.

Так, любоў. Слова, якім чалавецтва назвала ўсёпераможнае пачуццё, скіраванае да святла, прыгажосці, дабра, праўды і справядлівасці. Гледзячы на тое, што адбываецца сёння на Беларусі, кожнай сваёю крывінкаю адчуваю страшэнны дэфіцыт гэтага пачуцця, які трывожыць мяне, гняце душу, плодзіць пакутныя, бяссонныя ночы.

Апосталы савецкай імперыі, таталітарнай, казарменнай сістэмы доўгія гады ўбівалі ў свядомасць народаў, што КПСС — гэта «розум, гонар і сумленне нашай эпохі», а любоў да яе і асабіста да чарговага генсека (прозвішча можна падстаўляць любое) не што іншае, як любоў да Айчыны, што «наш адрас не дом і не вуліца, наш адрас — Савецкі Саюз». Пра гэта яны трубілі па тэлебачанні і радыё, на старонках друку, абвешвалі гарады і вёскі шматлікімі лозунгамі, пано, узводзілі пампезныя манументы, атрымліваючы ўзнагароды «за большую работу по коммунистическому воспитанию трудящихся». І ў той жа час яны пастаянна, метадычна знішчалі, выветрывалі з людскіх душ і сэрцаў сапраўднае пачуццё любові да роднага, блізкага, найдаражэйшага, ператвараючы «трудящихся» ў дачаснікаў, люмпенаў, рабоў, якім абыякава ўсё: гісторыя свайго народа і яго мудрыя традыцыі, мова, крэўная зямля, вёска, горад, вуліца, дом і нават сям'я.

Уяўная калектыўная ўласнасць, а па сутнасці манапольная ўласнасць таталітарнай сістэмы на чале з класам партыйна-дзяржаўна-ваенна-гаспадарчай наменклатуры не выхавала сапраўдных гаспадароў. Усё было аб'яўлена нашым, а ў савецкім разуменні гэта азначае — нічыім. Дабро можна раскрадаць усім: з самага верху (карупцыя і разнастайныя прывілеі) і да нізу (дробны крадзеж, «несуны», прысваенне таго, што кепска ляжыць). І як вінаваціць «нізы»? Калі яны бачаць, што амаль усё паглынаюць савецкая буржуазія і ваеншчына, калі за сваю працу людзі атрымліваюць меней чым 20 працэнтаў ад створанага імі, то пачынаюць самі ўмешвацца дзікім спосабам у працэс размеркавання.

А самае страшнае ва ўсім гэтым — масавая абыякавасць, безгаспадарчасць, марнатраўства. Калі гэта было раней, каб беларускі селянін пакінуў пад снег палетак нявыбранай бульбы або нявырванага льну? Сёння ж такое ў калгасах і саўгасах — звыклая з'ява.

Абсурдная, вар'яцкая ідэя зліцця дзесяткаў народаў, моў, культур у адзін чыгун, у якім на рэвалюцыйным бальшавіцкім агні згатуецца унікальная страва, нябачаны дагэтуль феномен — савецкі народ з адной уніфікаванай рускай моваю — ажыццяўлялася ў нашай рэс-

публіцы пры масіраванай падтрымцы і бурлівай энергіі мясцовых кіраўнікоў-«суперінтэрнацыяналістаў» надзвычай шпаркімі тэмпамі. Беларусь, як і марыў М. Хрушчоў, бліжэй за ўсіх падышла да «камунізму».

Балюча глядзець сёння на дэнацыяналізаваных, бязмоўных, аглухлых беларусаў, на знявечаную зямлю, па якой смерчам прайшлі павальныя, савецкага ўзору меліярацыя і хімізацыя, на вынішчаныя, засмечаныя лясы, на атручаныя, выпрамленыя рэкі, на залітыя гноем азёры, на пакінутыя маўклівыя вёскі з забітымі вокнамі, дзе над комінамі не ўецца ніводзін дымок, на могілкі продкаў, якія зарастаюць быльнягом, па якіх блукаюць свінні, на няўтульныя гарадскія двары, на запляваныя, спісаныя нецэнзуршчынай пад'езды дамоў, дзе вечна стаіць пах мачы, на скалечаныя ліфты, парэнчы лесвіц і г. д.

Пакутліва думаць пра тое, што кожны год тысячы дзяцей становяцца сіротамі пры жывых, але дашчэнту абыдлелых бацьках, якія туляюцца, страціўшы элементарнае чалавечае аблічча, каля гарэлачных крамаў і піўных ларкоў. Не менш жахліва згадваць пра лёс выкінутых з кватэр старых людзей, якія змушаны шукаць ратунак у прытулках, пра забойствы дзецьмі сваіх бацькоў і наадварот — бацькамі дзяцей.

Ва ўсіх цывілізаваных краінах ацэнка і асобнаму чалавеку, і ўсяму грамадству даецца па іх адносінах да дзяцей і старых, да могілак, дзе вечным сном спачываюць продкі. Калі падыходзіць з такою меркаю, то трэба сумленна сказаць, што наша грамадства за гады савецкай улады перарадзілася ў племя дзікуноў.

Што і казаць, незайздросную спадчыну пакінула нам бесчалавечная таталітарная сістэма, а таксама яе эліта — прадстаўнікі партыйнай, дзяржаўнай, ваеннай, гаспадарчай наменклатуры, якія ў дадатак да ўсяго пад прыкрыццём перабудовы не толькі дазволілі на працягу шасці гадоў весці бессаромнае раскраданне народнага дабра розным махлярам, дзялкам, перакупшчыкам, спекулянтам, але і самі нахабна займаліся і займаюцца «начальніцкай прыхватызацыяй», перакачкаю дзяржаўных сродкаўу свае кішэні. Згадаем толькі адзін, але такі паказальны прыклад — прысваенне і ўкладанне ў розныя СП партыйнымі кіраўнікамі рэспублікі сродкаў, якія былі накіраваны ЦК КПСС у Беларусь для ахвяр чарнобыльскай катастрофы. Амаральнасць гэтага ўчынку перайшла ўсе межы.

Цяжка ўсведамляць, што рэспубліка — дом, дзе ты жывеш, — абкрадзена і знявечана, што яна ператварылася ў заштатны вакзал або прахадны двор з усімі іхнімі атрыбутамі, а твой народ страціў

сваю нацыянальную годнасць, мову, традыцыі, адметнасць, стаў безаблічным насельніцтвам.

Аднак ідэя незалежнасці, свабоднага жыцця народа, за якую змагаліся, ішлі на смерць на працягу многіх стагоддзяў лепшыя сыны і дочкі Беларусі, не згінула. Сённяшнія прадаўжальнікі дэмакратычных традыцый зрабілі яшчэ адзін важны крок на гэтым шляху. Рэспубліка Беларусь абвешчана, яе палітычная і эканамічная незалежнасць замацаваны заканадаўча парламентам, дзе нават камуністычная наменклатурная большасць, хоць, магчыма, кіруючыся сваімі, кастава прагматычнымі намерамі, усё ж прагаласавала «за».

Пасля жнівеньскіх падзей 1991 года стала ясна, што СССР распаўся канчаткова і рэанімiраваць яго з тым жа дыктатам Цэнтра, як было раней, не пад сілу нікому. Рэспублікі, якія абвясцілі незалежнасць, паводзяць сябе надзвычай абачліва і асцярожна, што, улічваючы папярэдні вопыт, а таксама выразныя імперскія ноткі апошніх выступленняў палітыкаў з Масквы, і зразумела, і правамерна. Ніхто не хоча надзяваць на шыю хоць і падрамантаваны, але той жа стары хамут.

Як і многія мае суайчыннікі, я застаюся прыхільнікам поўнай незалежнасці Беларусі. І зараз, пасля падпісання пагаднення аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў, не падзяляю новай эйфарыі, бо пытанне: «Ці зможа Беларусь рэалізаваць абвешчаныя незалежнасць, самастойнасць у рамках СНД?» застаецца адкрытым. Канешне ж, як эканамічны саюз СНД можа выканаць сваю станоўчую ролю пры ўмове раўнапраўнага партнёрства. Аднак для Беларусі, нашпігаванай войскам, ядзернаю і звычайнаю зброяй так, як ніводная краіна свету, небяспека стаць зноў заложніцаю імперскіх амбіцый застаецца. Гэта паказала ўсеармейская нарада прадстаўнікоў афіцэрскіх сходаў. Генералітэт і артадаксальная частка афіцэрства ніяк не могуць змірыцца з тым, што няма імперыі. Не могуць яны згадзіцца і з тым, што сёння ясна кожнаму нармальнаму чалавеку: менавіта таталітарызм, шалёная гонка узбраснняў, ідэалагічныя і ваенныя авантуры за межамі СССР, бязмежная прагавітасць ваеннапрамысловага комплексу, маршальскія, генеральскія прывілеі, крадзеж і марнатраўства ў арміі падарвалі эканоміку, разам з дывільнай наменклатурай і яе шматлікімі родзічамі і сябрамі «з'елі вялікую дзяржаву.

У сённяшнім становішчы вайскоўцаў вінаваты не дэмакратычныя змены, не набыццё рэспублікамі незалежнасці, а агрэсіўныя амбіцыі палітыканаў, армейскай і ваенна-прамысловай вярхушкі супердзяржавы, якія ў мірны час давялі армію да абсурднай велічыні, якія

назапасілі столькі зброі, што ёю можна некалькі разоў знішчыць увесь свет. Бясспрэчна, сітуацыя з арміяй складаная, але не трэба бразгаць зброяй, не трэба пакрыкваць на прэзідэнтаў незалежных дзяржаў і з пагардаю гаварыць пра суверэнітэт, а спакойна разабрацца і пачаць вырашаць усе праблемы. Кожная незалежная дзяржава вызначыць, якая ёй патрэбна армія — і па колькасці, і па якасці. Нашай Беларусі, якая абвясціла сябе нейтральнай, бяз'ядзернай дзяржавай, не патрэбна такая вялікая групоўка войск, што знаходзіцца на яе тэрыторыі. Для актыўнай абароны ёй дастаткова мець пагранічныя часці і невялікую высокапрафесійную мабільную армію. А таму многім афіцэрам і прапаршчыкам давядзецца ўключацца ў цывільнае жыццё. Гэта не азначае, што дзяржава пакіне вайскоўцаў на волю лёсу, будзе пераходны перыяд і падтрымка. Але давайце скажам шчыра, нягледзячы на цяжкасці службы (самі выбіралі такую прафесію!), ваенныя заўсёды мелі параўнаўча неблагое матэрыяльнае забеспячэнне. Не самыя бедныя і тыя, хто вяртаецца з Германіі, Польшчы, Чэха-Славакіі. Агульнавядома, што кожны афіцэр або прапаршчык імкнуліся служыць за мяжою, хоць трапіць туды было нялёгка, у ход ішоў хабар. Дык навошта нагнятаць сітуацыю, заяўляць, што армія ў нас самая пакрыўджаная? А сотні тысяч заложнікаў Чарнобыля, якія шэсць гадоў чакаюць вырашэння іх лёсу, а дзеці, якія паміраюць ад лейкеміі, лейкозу, а ўрачы, настаўнікі і іншыя прадстаўнікі інтэлігенцыі, якія ўсё жыццё працуюць за капейкі, а студэнты, а інваліды і пенсіянеры, а бескватэрныя жыхары нашых гарадоў і пасёлкаў, а дзесяткі тысяч рабочых і служачых, якія заўтра стануць беспрацоўнымі і павінны будуць набываць новую прафесію, — няўжо яны не маюць права на ўвагу з боку дзяржавы, урада? Калі народ і армія адзіныя, то армія павінна несці разам з народам увесь цяжар сённяшняга жыцця.

Праблема скарачэння і вываду войска з Беларусі, стварэння нацыянальнай арміі вельмі важная, але не адзіная ў шэрагу першачарговых задач, якія паўсталі сёння. Рэспубліка Беларусь павінна стаць сапраўды суверэннай, дэмакратычнай дзяржавай, якую прызнаюць не толькі народы-суседзі, але і ва ўсім свеце. Зрабіць гэта старымі метадамі немагчыма. Патрэбны абсалютна новыя, нестандартныя рашэнні ў развіцці самастойнай знешняй палітыкі, эканомікі, навукі, адукацыі, культуры, распрацоўка канкрэтных праграм па кожным накірунку з улікам сённяшніх рэалій і на перспектыву.

Наша вялікая бяда, што на ідэю сапраўднай беларускай дзяржаўнасці, стварэння ўмоў для нармальнага жыцця народа сёння не працуе большасць парламента, дзе многія дэпутаты ніколі не выходзяць на трыбуну, не бяруць слова, каб адстойваць сваю пазіцыю ў

спрэчках, а толькі ціснуць на кнопкі, блакіруючы разумныя прапановы. Да гэтага часу не вырашаны ключавыя пытанні паскарэння рынкавай эканамічнай рэформы, арыентацыі на ўнутраны таварны рынак, стварэння банкаўскай сістэмы, сваёй валюты і г. д.

Не займаюцца як след наладжваннем эканомікі, абаронай інтарэсаў Беларусі і яе жыхароў у гэты надзвычай складаны час і наш урад, яго структуры на месцах. З іх дазволу вядзецца «дзікая прыхватызацыя», але няма дзяржаўнай праграмы сапраўды дэмакратычнай прыватызацыі, каб кожны насельнік Беларусі меў магчымасць набыць уласнасць, заняцца стваральнай працаю. Лібералізацыя цэн без дзеючай рынкавай гаспадаркі стала іх чарговым (ды яшчэ якім!) павышэннем. Мы бачым, як шырокаю ракою плывуць за межы рэспублікі тавары і прадукты, як расце карупцыя, як набірае яшчэ большую моц гандлёвая мафія, якая ва ўмовах бескантрольнасці і вечнага дэфіцыту бязбедна жыве ва ўсе часы, падкормліваючы патрэбных асоб у эталонах улады, а людзі павінны гадзінамі, днямі, мусолячы ў руках злашчасныя талоны і купоны, мерзнуць на марозе ў бясконцых чэргах, сноўдаць па пустых магазінах.

Але, крытыкуючы парламент і прызначаны ім урад, што чуецца сёння паўсюдна, давайце не шкадаваць і сябе. Туды трапілі людзі не толькі па разнарадцы ЦК КПБ, многіх з іх мы самі выбралі. Бясспрэчна, што нам патрэбен прынцыпова новы, ідэалагічна незашораны парламент, які працаваў бы, зыходзячы з уласнай гісторыі, культуры, тоадыцый і немалых магчымасцей рэспублікі, на беларускую дзяржаўнасць. Ён жа сфарміраваў бы і ўрад, куды б увайшлі не «свае людзі», што засталіся без пасад пасля развалу КПСС — КПБ і СССР і якія ўмеюць толькі дзяліць, а кампетэнтныя, ініцыятыўныя, адданыя Бацькаўшчыне кіраўнікі.

Але гэта пакуль што перспектыва. Ды і не ўсё залежыць ад кіраўніцтва. Сваёй прыхільнасцю да дэмакратыі, палітычнай, грамадзянскай і працоўнай актыўнасцю мы самі павінны штодня напаўняць абвешчаную незалежнасць Беларусі канкрэтным зместам. Нам неабходна ўсвядоміць, што жыць па-чалавечы можна толькі ва ўмовах свабоды, маючы ўласнасць, што, памнажаючы сваё дабро, мы ўмацоўваем нармальны лад быцця, які ўзнімаецца па прыступках: чалавек — грамадства — дзяржава, а не наадварот. А таму, хоць гэта і неймаверна цяжка, трэба пераадольваць люмпенскую псіхалогію, набываць уласнасць, займацца фермерствам, развіваць традыцыйныя рамёствы, ствараць невялікія прадпрыемствы харчавання і абслугоўвання. І гэта не вяртанне да капіталізму, якога, у нашым разуменні, ужо даўно няма ў найбольш развітых краінах, а ратунак ад

пагібелі, да якой мы спаўзаем штодня. Дык няўжо трэба зноў прайсці праз кроў грамадзянскай вайны, грабежніцтва і гвалт, апынуцца на самым краі бездані, каб урэшце спрацаваў спаконвечны інстынкт самазахавання? Ніякі дыктатар, ніякая моцная рука не накорміць, не апране і не абуе народ, усё мы павінны зрабіць сваімі рукамі і розумам.

І самае галоўнае — трэба любіць Беларусь. Ваяўнічая агрэсіўнасць у дачыненні да яе дзяржаўнасці, незалежнасці пэўнай часткі русіфікаванага мясцовага і заезджага люду, тых, хто дзесяцігоддзямі жыве на беларускай зямлі, спажывае яе дары, дыхае яе паветрам, але дагэтуль не знайшоў часу авалодаць, хоць з большага, мовай, азнаёміцца з нашай гісторыяй, культурай, дзівіць і бянтэжыць. Хацеў бы сказаць ім наступнае: тая зямля, якая цябе, чалавеча, тваіх дзяцей і ўнукаў корміць, поіць, абувае і апранае, мае ўсё ж права на ўзаемнасць, на няхай сабе не безаглядную, адданую любоў, але хоць бы на меркантыльную, прагматычную ўдзячнасць, бо разумны не сячэ галіну, сук, на якім сядзіць.

Сёння многія «дабрадзеі» — і чужыя, і мясцовыя — палохаюць нас то голадам, то холадам, то разрухаю, звязваючы ўсё гэта з набыццём незалежнасці. Мушу адказаць ім словамі героя славутай купалаўскай «Паўлінкі» Пранціся Пустарэвіча: «Глупства, глупства, пане дабрудзею!»

Эканамічны і навуковы патэнцыял, геаграфічнае становішча, разнастайныя прыродныя рэсурсы, якімі валодае Беларусь, яшчэ не зусім знішчаная здольнасць народа працаваць самаадданна дазваляюць, нягледзячы на ўсе нашы беды, аптымістычна глядзець у будучыню. У еўрапейскую цывілізацыю мы павінны ўвайсці сваім шляхам, са сваімі беларускімі здабыткамі. Зараз усё ў руках кожнага грамадзяніна рэспублікі незалежна ад яго нацыянальнасці, веравызнання, палітычнай арыентацыі.

Усе мы павінны ўсвядоміць, што наш час гістарычна вызначальны, такой магчымасці больш не будзе, што трэба думаць не пра тое, як адкусіць чым пабольш ад агульнага пірага, бо яго яшчэ мусім спячы, а настройвацца на цяжкую, часам нават няўдзячную працу, на шчырае прыкладанне розуму, умення, сіл кожнага. І гэта не проста словы. Неабходна запасціся мужнасцю, цярплівасцю, настойлівасцю, талерантнасцю, самакрытычнасцю, не разменьваць свае здольнасці і талент на дробязную валтузню, задавальненне ўласных амбіцый, каб усім разам зрабіць прарыў, выйсці на нармальны ўзровень эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага і духоўнага жыцця, вярнуцца да сваіх

каранёў, адрадзіць выдатныя традыцыі, мову, стаць сапраўдным народам, які будуць паважаць у блізкім і далёкім свеце.

А дапаможа нам, як было заўсёды ва ўсіх людзей, толькі яна — любоў. Бо любоў — гэта катэгорыя не толькі маральная, але і матэрыяльная. Без яе няма працягу жыцця, без яе не робіцца ніводная добрая справа, без яе стварэць немагчыма.

*Студзень 1992 года*

## «ІНТЭЛІГЕНТНАСЦЬ — ГЭТА ПЕРШ ЗА ЎСЁ СУМЛЕННАСЦЬ...»
## *(Адказы на пытанні карэспандэнта газеты «Звязда» Анатоля Мяснікова)*

*— Давайце начнем гутарку з агульнага, аднак, несумненна, важнага пытання: якім бачыцца вам лёс беларускай інтэлігенцыі на працягу апошніх 70 гадоў? Чаму? Мне здаецца, тут не ўсё яшчэ сказана, ды і вам асабіста ёсць што сказаць на гэты конт...*

— Цяжка нават агульнымі штрыхамі прасачыць надзвычай трагічны лёс беларускай інтэлігенцыі. Ніколі ў яе не было нармальных умоў для таго, каб набраць моц, разгарнуцца на поўную сілу. Інтэлігенцыя можа расці колькасна і плённа развівацца ў незалежнай, самастойнай дзяржаве. Тое становішча, у якім беларускі народ быў не адно стагоддзе, не стымулявала росту творчых сіл.

Прарыў адбыўся ў канцы XIX і на пачатку XX стагоддзя. Беларускае адраджэнне паступова назапашвала свой патэнцыял, каб у дваццатыя гады цяперашняга веку ўзняць магутную хвалю нацыянальнага абуджання, прытоку ў літаратуру, мастацтва, навуку, адукацыю, медыцыну многіх тысяч таленавітых сыноў і дачок народа. Яны сталі свядомымі, актыўнымі будаўнікамі эканамічнага і культурнага жыцця рэспублікі. За гэты час было зроблена нямала: адкрываліся беларускія школы, вучылішчы, тэхнікумы, ВНУ, выдавецтвы, тэатры, музеі, бібліятэкі. Нарэшце беларусы адчулі сябе людзьмі.

Аднак сонца глядзела ў наша акенца нядоўга. «Бацька ўсіх народаў» выдаў тэзіс пра ўзмацненне класавай барацьбы. І гэтая барацьба закіпела. Першымі ў сталінскія турмы трапілі тыя, хто быў навідавоку: прадстаўнікі творчай, навуковай і тэхнічнай інтэлігенцыі, актывісты, наогул, адукаваныя людзі.

У трыццатыя гады сталінскія жорны закруціліся ў шалёным тэмпе, перамолваючы тых, хто быў аб'яўлены «ворагам народа», «нацдэмам», «контррэвалюцыянерам». Пачалася сапраўдная народная трагедыя.

*— Лёс трагічны, згодзен з вамі. І ўсё ж цяпер давайце пяройдзем да дня сённяшняга. Якім бачыцца вам ідэал беларускага класічнага інтэлігента? Можа, слова «ідэал» і гучнае, але ж рэальнае. ...Ну, калі не ідэал, то ўзор... Не нейкага аморфнага, «мёртвага», застылага, а ўзор жывога, рэальнага для часу, дзейнага беларуса-інтэлігента...*

— Пытанне вы задалі наколькі няпростае, настолькі і важнае. Тое вынішчэнне таленавіцейшых, разумнейшых, сумленнейшых, пра што мы ўжо гаварылі, абразлівыя адносіны да інтэлігенцыі з боку лідэраў камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы (успомніце выразы, адрасаваныя ёй Леніным, Сталіным і іншымі «правадырамі»!), узвелічэнне і ўсхваленне не лепшых чалавечых, гуманістычных якасцей, не інтэлекту, розуму, таленту, майстэрства, а «класавай чысціні» і прывялі да заняпаду наша грамадства. Калі б яно, грамадства, развівалася ў нармальных умовах, то, несумненна, культурны ды і жыццёвы ўзровень любога народа былога СССР быў бы намнога вышэйшы. І ў самім асяроддзі інтэлігенцыі ўвесь час, як кажуць, планка паніжалася і паніжалася. Арыентацыя была не на сапраўдных інтэлігентаў старое загартоўкі, а на тое, як бы прыстасавацца да ўлады, дагадзіць «сильным мира сего». Калі героямі савецкага народа былі неадукаваныя, абмежаваныя ў культурным развіцці, але крыважэрныя і цынічныя «жалезныя наркомы», то пра што можа ісці гаворка. На вялікі жаль, мы і сёння бачым, як адносяцца да культуры, да інтэлігенцыі многія кіраўнікі. А таму і ў іншых сферах жыцця маем сумныя вынікі.

Сёння інтэлігентнасць многіх людзей заключаецца толькі ў тым, што яны маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі. Але дыплом — гэта яшчэ не ўсё, ён аўтаматычна не з'яўляецца пропускам у шэрагі сапраўдных інтэлігентаў.

Або, як я магу лічыць беларускім інтэлігентам чалавека, які хоць і скончыў дзве «цывільных» ВНУ ды ў дадатак яшчэ і ВПШ, але з пагардаю ставіцца да законаў, да маралі, нахабна крадзе народнае дабро і ў той жа час цынічна аплёўвае тую зямлю, тых людзей, з асяроддзя якіх ён выйшаў сам, розумам і рукамі якіх усе гэтыя шчадроты створаны? А такіх «інтэлігентаў» — былых і сённяшніх, малых і вялікіх наменклатуршчыкаў, свежаспечаных «прадпрымальнікаў» — процьма. Раней яны баяліся, што давядзецца пакласці на стол партбілет, страціць утульнае, з хлебам і маслам месцейка. А цяпер, у бязладдзі і вэрхале, якія яны самі і ствараюць, адчулі поўную свабоду, распаразаліся, іхні апетыт стаў воўчым.

Інтэлігентнасць — гэта перш за ўсё сумленнасць, высокая патрабавальнасць да сябе. А потым ужо ідуць належны інтэлектуальны ўзровень, кампетэнтнасць.

Акрамя гэтых якасцей, я не ўяўляю беларускага інтэлігента без любові да роднай зямлі, без ведання гісторыі свайго народа, без апантанага, актыўнага жадання зрабіць усё, каб наша Айчына стала сапраўды квітнеючай, заможнай, цывілізаванай, культурнай дзяржавай. Я ўжо не кажу пра павагу і ўвагу да людзей, пра дабрыню, спагаду і міласэрнасць. Гэта тычыцца кожнага чалавека.

*— У народаў, якія паважаюць самі сябе, спадчына, антычнасць, гістарычная даўніна з'яўляюцца бессмяротнымі. А ў нас? Ці здольныя мы адвыкнуць — адзін раз і назаўсёды — ад перапісвання гісторыі на розныя лады? І тут жа яшчэ адно пытанне, якое, на маю думку, мае з папярэднімі прамую залежнасць: як вы мяркуеце, ці перажыве наша беларуская культура (у самым шырокім сэнсе слова) тую дзяржаўнасць (па-руску — государственность), у якую наш край трапіў у 1917-ым? Ці выйдзе, урэшце, на новы, шырокі прастор?*

— Гісторыя нашага народа, яго мовы, культуры па свайму трагізму, відаць, не мае аналагаў. Яна ўвабрала ў сябе і балючыя для сэрца кожнага беларуса прыклады гвалту і знявагі ў дачыненні да нашых продкаў, і слаўныя, гераічныя старонкі змагання за сваю годнасць, і бяспрыкладны адраджэнцкі ўздым скарынавага часу, і бурлівае абуджэнне нацыянальнай свядомасці ў XIX і на пачатку XX стагоддзяў, і новы ўціск на сучасным этапе. Жыць паміж ваяўнічых і агрэсіўных суседзяў нялёгка. Праз нашу зямлю, якая ляжыць на скрыжаванні шляхоў з захаду на усход, з поўначы на поўдзень, на працягу многіх стагоддзяў без упынку пракочваліся вогненным валам малыя і вялікія войны, вынішчаючы беларусаў, а таксама набытак іхніх працавітых рук, розуму і таленту. Ці ж не зашчыміць сэрца ад такой згадкі: калі б народ жыў у нармальных умовах, то сёння беларусаў магло быць 35 мільёнаў? А багацці матэрыяльнай і духоўнай культуры? Колькі іх разбурана, спалена, знішчана альбо раскідана па ўсім белым свеце!

Не лепшым часам для нашай культуры была і савецкая «дзяржаўнасць», пра якую вы кажаце. Канешне ж, дзеля справядлівасці нельга сцвярджаць, што за семдзесят гадоў савецкай улады ў развіцці адукацыі, культуры не было нічога станоўчага. Многія выхадцы «з нізоў» атрымлівалі адукацыю, набывалі розныя новыя прафесіі і г. д. Але адраджэнне, беларусізацыя, якія хораша распачаліся ў 20-ыя гады, хутка захлібнуліся ў крыві сваіх творцаў, лепшых сыноў і дачок Беларусі.

Паслугачы бальшавіцкай ідэі вялі барацьбу на ўсе франты: і з храмамі, і з кнігамі, і з моваю, і з нацыянальна свядомымі людзьмі. А пазней у іхні хваравіты розум прыйшла абсурдная новая ідэя зліцця розных моў, культур, народаў, каб нарадзіць уніфікаваны савецкі народ з адною моваю і культураю. У плане русіфікацыі мясцовае чыноўніцтва пры дзейснай падтрымцы з Масквы праявіла самую вялікую актыўнасць, далека абагнала ўсе рэспублікі былога СССР. Дайшло да таго, што ў гарадах не стала ніводнай беларускай школы, вучылішча, тэхнікума, ВНУ, а ў вёсцы школы таксама амаль усе перайшлі на рускую мову навучання. Родная мова была выгнана адусюль. І сёння, калі разглядаць наша грамадства з пункту гледжання нацыянальнай мовы, культуры, трэба праўдзіва канстатаваць, што нацыянальнай меншасцю стала ў рэспубліцы карэннае насельніцтва — самі беларусы, многія з якіх не валодаюць роднаю моваю, не ведаюць уласнай гісторыі, згубілі нацыянальныя арыенціры.

Адкуль жа возьмуцца тыя нацыянальныя арыенціры, калі гісторыя самабытнага народа, які мае за плячамі многія стагоддзі развіцця сваёй культуры, у падручніках савецкага часу пачыналася... з 1917 года. А да гэтага, як сцвярджалі праімперскія гісторыкі, у нас былі толькі голад, холад, лапці і каўтун у галаве. Дастаткова сказаць, што Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына аб'яўляліся цемрашаламі.

Думаю, што падручнікі па гісторыі Беларусі, якія напішуцца цяпер, не трэба будзе перапісваць, а толькі дапаўняць новымі звесткамі, новымі слаўнымі старонкамі. І ў гэтым я зайздрошчу наступным пакаленням беларусаў, якія змалку будуць прычашчацца да жыццядайнай крыніцы — гісторыі свайго народа.

Сітуацыя, у якую мы трапілі, надзвычай складаная, але не безнадзейная. Патэнцыял мовы, культуры, які праз гады таталітарызму, русіфікатарства самаахвярна ахоўвалі і захоўвалі прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, настаўніцтва (у асноўным сыны і дочкі беларускай вёскі — нашай ратавальніцы!), немалы. Упэўнены, што ён будзе тою пляцоўкаю, на якой узнімецца светлы гмах беларускага Адраджэння. У нас ёсць з чым выйсці ў свет і сёння, а надалей набыткі культуры павінны стаць больш важкімі.

*— Вычляняцца, выдзяляцца нам, беларусам, з таго полінацыянальнага складу, я сказаў бы — сплаву, які называецца — не-не, не Савецкім Саюзам, а славянам братэрствам, — відаць, і нявapта, і проста неразумна. Як, на вашу думку, захавацца нам у славянскай супольнасці, і захавацца годна, скажам, на тым узроўні, на якім былі беларусы ў часы Залатога стагоддзя?*

— Я ўпэўнены, што ніводзін беларус і не думае, як вы сказалі, «вычляняцца, выдзяляцца» са славянскае супольнасці. Гэта абсурдна. Мы спакон вякоў жылі і будзем жыць на сваёй зямлі поруч з суседзямі-славянамі: рускімі, украінцамі, палякамі, а яшчэ і з латышамі, літоўцамі. Куды ад суседзяў дзенешся, хіба што толькі на Месяц? Размовы пра самаізаляцыю, а яны вядуцца ў пэўных колах нашых «суперінтэрнацыяналістаў», не толькі абсурдныя, але і смешныя. Такім жа смешным выглядае і іхняе абвінавачванне беларусаў у нацыяналізме. Дзе вы, шаноўныя, яго ўбчылі? Пабойцеся Бога!

Наш народ паважаюць ва ўсіх рэспубліках былога СССР за працавітасць, шчырасць, гасціннасць, душэўнасць, талерантнасць. Усюды, а мне даводзілася быць у самых розных мясцінах, калі толькі ты скажаш, што з Беларусі, то цябе сустракаюць як роднага. Але тыя ж людзі, прыязджаючы да нас, жахаюцца, наколькі заняпала наша мова, знікла нацыянальнае аблічча рэспублікі. Стаў ходкім нават жарт: Беларусь — гэта яшчэ адна вобласць РСФСР. А гэта ўжо зусім не смешна.

А таму і радасна, што, нарэшце, мы пачынаем будаваць сваю незалежную дзяржаву, пра якую марылі шмат стагоддзяў беларусы. Нашы сувязі з братамі-славянамі не перарвуцца. Ці ж народы вінаватыя ў тым, што зрабілі з кожным з іх таталітарызм, ідэалагічны манапалізм, цэнтр — монстр, на які ўсе, як рабы, працавалі, які бязлітасна эксплуатаваў нацыянальныя землі, рэсурсы, саміх людзей?

А ведаеце, хто ўвесь час крычыць у Беларусі, што нацыяналісты хочуць пасварыць нас з рускім народам? Той, хто палец аб палец не ўдарыў, каб нешта карыснае зрабіць дзеля дружбы славянскіх народаў. І мяне часта абвінавачваюць у нацыяналізме. Дык вось, хачу сказаць сваім абвінаваўцам-«інтэрнацыяналістам»: пакуль вы крычыце, я перакладаю творы рускіх, украінскіх пісьменнікаў, друкую іх у Беларусі. Маю шмат сяброў у Маскве, Санкт-Пецярбурзе, Мурманску, Уладзіміры, Курску, Ніжнім Ноўгарадзе, Разані, Барнауле, а таксама ў Кіеве, Львове, Чарнігаве, Мікалаеве, Луцку і многа дзе яшчэ. Не крычаць трэба, не абмеьвацца толькі заздраўнымі тостамі ў час выпадковых сустрэч, каб пасля забыцца на суседзяў, а пастаянна рабіць на гэтую дружбу.

Так працуе і калектыў рэдакцыі часопіса «Полымя». Абменны нумар з украінскім часопісам «Вітчизна», падборка вершаў паэтаў Санкт-Пецярбурга, апавяданні пісьменнікаў Расіі — гэта толькі частка таго, што апублікавана за апошнія гады. Мы разумеем, што ў наш, набрынялы крывёю, жорсткасцю і варожасцю, час, літаратура, куль-

тура могуць, як ніхто, плённа пракладваць шляхі ўзаемаразумення і сяброўства.

А што да нашай захаванасці ў славянскім коле, то беларуская літаратура і культура ў цэлым там вядомыя, нязменна карыстаюцца ўсюды ўвагаю і павагаю. І гэтая традыцыя, я ўпэўнены, не згасне, а будзе развівацца далей.

*— Доўгі час культурай, літаратурай, навукай, журналістыкай і ў краіне, і ў рэспубліцы кіраваў ідэалагічны монстр. Кіраваў ва ўрон усяму беларускаму, нацыянальнаму — гэта, як казаў адзін літаратурны герой, факт. Галоснасць, дэмакратыя, суверэнітэт змялі, нарэшце, монстра. Ці лічыце вы гэта заканамернасцю? Больш таго, ведаючы, што вы, калі так можна мовіць, былі блізка да беларускай ідэалагічнай машыны, добра знаёмы з яе «машыністамі», хачу спытаць і вось аб чым: ці не маглі б вы сёння прыадчыніць сакрэтныя дзверы, патаемны ўваход на тую ідэалагічную кухню, дзе распрацоўваліся сцэнарыі таго, як трэба было бэсціць і зневажаць Быкава, Адамовіча, іншых нашых «зорак», урэшце — і вас асабіста?*

— Што ж, можам пагаварыць і пра гэта. Сапраўды, у былым СССР ідэалагічны манапалізм, на аснове якога і вырас той монстр, пра якога вы кажаце, як наручнікі і кайданы, скоўваў творчасць таленавітых людзей, што працавалі ў самых розных сферах духоўнага жыцця. Прыкладаў можна прывесці безліч. Велізарны штат партыйных чыноўнікаў не толькі апрацоўваў грамадзян краіны ў зададзеным накірунку, але і пільна сачыў за інтэлектуальнаю элітаю грамадства — творчай інтэлігенцыяй. Яна заўсёды была пад прыцэлам, як на этапе: крок — улева, крок — управа, буду страляць! Ствараць трэба было толькі ў межах «адзіна правільнай ідэалогіі». Скажам, у партыйных дакументах, якія тычыліся літаратуры, нязменна прысутнічала заданне пісьменнікам: адлюстроўваць поспехі камуністычнага будаўніцтва, ствараць вобраз станоўчага героя. Асабліваю павагаю ў ідэалагічных чыноўнікаў карыстаўся той творца, які ў сваёй аповесці альбо рамане выводзіў у галоўныя героі і надзяляў усімі магчымымі і немагчымымі дадатнымі якасцямі партыйнага работніка. Такіх твораў было спечана нямала.

Але і тады была іншая літаратура — літаратура на ўсе часы, створаная не вернападданніцкай фантазіяй, а мужным і праўдзівым талентам, дзе заўсёды прысутнічала імкненне бескампрамісна спасцігаць складаныя варункі нашай гісторыі, людскога быцця, глыбока аналізаваць дабро і зло ў чалавеку, разглядаць характары герояў у самы складаны для іх час — момант выбару, зараджаць сэрцы чытачоў ідэямі гуманізму, справядлівасці і праўды. З гэтай кагорты беларускіх

пісьменнікаў назаву толькі імёны тых, хто яе сімвалізуе: Васіль Быкаў, Пімен Панчанка, Уладзімір Караткевіч.

У самы разгар кампаніі па цкаванні Быкава, разгорнутай партыйным чыноўніцтвам у Гродне і Мінску, ён атрымаў паштоўку ад выдатнага рускага паэта Аляксандра Твардоўскага, які заўсёды падтрымліваў нашага таленавітага земляка і сябраваў з ім. Там была такая фраза: «Все минется, а правда останется».

Справядлівасць гэтых слоў бясспрэчна. І разбурэнне ідэалагічнай машыны па вытворчасці дэмагогіі, фальшу і хлусні, канешне ж, заканамернае.

Вы напомнілі, што я і сам быў вінцікам ідэалагічнай машыны. Газета «Европейское время» нават заявіла, што я працаваў у ідэалагічным аддзеле ЦК КПБ, што і я былы, які стаў сённяшнім. Дык вось я не былы і не сённяшні, а заўсёдны. Жыву на сваёй зямлі, пад сваім небам разам са сваім народам, які люблю. Усё сваё жыццё ў меру здольнасцей служу беларускай нацыянальнай культуры. Гэтым я займаўся і на пасадзе загадчыка сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ. Ішоў туды не кіраваць, а дапамагаць. Сектар літаратуры за маю бытнасць у ім не выконваў нейкіх цэнзарскіх функцый. Гэтым займаліся іншыя. А мне давялося пастаянна адстойваць чалавечую, грамадзянскую годнасць і творы лепшых беларускіх пісьменнікаў ад нападак не толькі мясцовых ідэалагічных цэрбераў, але і тых, што працавалі ў ЦК КПСС. Наша бяда была ў тым, што там сабралася шмат землякоў: Зімянін, Шаура, Сяўрук і іншыя. Яны вельмі пільна сачылі за тым, што робіцца ў рэспубліцы, рэагавалі на «крамолу» імгненна. Не меней «шчыравалі» і свае ідэалагічныя босы. Мой рабочы дзень у ЦК нярэдка пачынаўся такім тэлефонным званком: «Если ты еще раз перейдешь мне дорогу, то я сломаю тебе хребет...», і званілі не аднекуль, а з гэтага ж будынка.

А таму ганаруся тым, што дапамагаў такім выдатным пісьменнікам, як Васіль Быкаў, Пімен Панчанка, Уладзімір Караткевіч, Алесь Адамовіч, Алесь Разанаў, і многім іншым. Ганаруся тым, што беларуская кніга ў гэты час заняла належнае месца ў выдавецтвах. Іншая справа, што не ўсё змог зрабіць. Вельмі шкадую сёння, што многія сур'ёзныя, грунтоўныя дакументы, як, скажам, праграмы развіцця нацыянальнай агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы, паляпшэння выдавецкай справы і іншыя, у распрацоўцы якіх удзельнічаў, у якія ўкладваў душу, былі пахаваны недзе ў архіве, бо ў гэтым партыйнаму начальству бачыўся нацыяналізм. Такім чынам згублена дзесяцігоддзе, за якое можна было зрабіць шмат чаго карыснага, хоць крыху

спыніць нацыянальную дэградацыю, не зайсці ў тупіковае становішча.

Словам, я магу спакойна і адкрыта сёння глядзець у вочы людзям.

*— Ідэалагічны бунт здзейсніўся, монстр памёр, гэта, вядома ж, добра. Дэмакратыя набіраецца сіл, хоць у нашай рэспубліцы — думаю, вы са мной пагодзіцеся — гэта адбываецца не так упэўнена, як хацелася б... Але ці верыце вы асабіста ў канчатковую і поўную перамогу дэмакратыі ў Беларусі? Каб не выглядала гэта пытанне нейкім падвохам, я растлумачу, чаму задаў яго. Мне здаецца, ёсць некалькі аргументаў, якія, так бы мовіць, папярэджваюць: сама дэмакратыя ў небяспецы. Па-першае, няпроста будзе паўстаць ёй у поўны рост, па-еўрапейску, з руінаў былога Саюза ССР... Па-другое, што мне здаецца даволі істотным ва ўмовах нашай рэспублікі, вельмі ўжо разрознена, не як на сваіх асяродках, трымаецца беларуская інтэлігенцыя, а менавіта ж яны — дзеячы культуры, літаратуры, мастацтва, настаўніцтва, навукоўцы — з'яўляюцца не толькі гордасцю любой цывілізаванай дзяржавы, але і праваднікамі рашучых пераўтварэнняў у ёй — ажно да ўсталявання новых формаў кіравання... Агульнымі заклікамі да аб'яднання тут не возьмеш. Патрэбна, як мне думаецца, свая беларуская нацыянальная ідэя, якая выразна акрэсліла б усім нам канчатковую мэту ў руху па шляху да сапраўднай дэмакратыі. Як лічыце вы?*

— Давайце спачатку скажам: што такое дэмакратыя? У перакладзе з грэцкае мовы гэтае слова складаецца з двух: народ і ўлада. Такім чынам, калі даваць больш поўнае азначэнне, дэмакратыя — форма грамадскай улады ў дзяржаве, якая заснавана на прызнанні народа крыніцаю ўлады, яго права ўдзельнічаць у рашэнні дзяржаўных спраў у спалучэнні з шырокім колам грамадзянскіх правоў і свабод. Савецкія энцыклапедыі і даведнікі сцвярджаюць, што сапраўдная дэмакратыя магчыма толькі ў сацыялістычнай дзяржаве. Гэта тэорыя, а давайце паглядзім, што было і ёсць у нашым рэальным жыцці.

Так, выбары ў СССР уяўлялі сабою як бы ўсеагульнае свята: ля выбарчых участкаў музыка, канцэрты, у буфетах — нейкія дэфіцытныя прадукты, якія спецыяльна прыхоўвалі да гэтага дня, а яшчэ піва, віно, гарэлка — гуляй народ! І народ хуценька, яшчэ з самага ранку аддаваў за бэзальтэрнатыўных кандыдатаў у дэпутаты свае галасы (бо не прагаласуеш, дык пастукаюць у дзверы хаты альбо кватэры, а мы ведаем, чым канчаўся такі стук у гады сталіншчыны, ды і ў пазнейшы час!), каб потым піць рускую горкую і «радавацца». Было

нават спаборніцтва: хто раней за ўсіх прагаласуе? Фота такіх «шчаслівчыкаў» змяшчалі ў друку, ім уручалі падарункі. І актыўнасць, колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, былі нязменныя: 99,99 альбо і ўсе 100 працэнтаў. А затым выбраныя дэпутаты (па разнарадцы тут былі і рабочыя, і сяляне, і інтэлігенцыя, і жанчыны, і камсамольцы, і г. д.) «удзельнічалі ў кіраўніцтве дзяржаваю» — пад наглядам рэальна кіруючага партыйна-дзяржаўна-ваенна-гаспадарчага наменклатурнага клана паслухмяна падымалі рукі за любую прапанову, якая ім спускалася «зверху».

А цяпер пра апошнія выбары ў нашай рэспубліцы. Яны сапраўды ў параўнанні з мінулым былі больш дэмакратычныя: народ не заганялі сілком да урнаў, у частцы акругаў меліся альтэрнатыўныя кандыдаты ў дэпутаты. Аднак успомнім, якімі метадамі прапіхвалі ў Саветы «сваіх людзей» ЦК КПБ, абкамы, гаркамы, райкамы, якую цынічную, брудную вайну вялі яны з тымі кандыдатамі, што займалі больш-менш дэмакратычныя пазіцыі. Вялікая частка сённяшніх дэпутатаў наогул не выбіралася народам: ад КПБ, ад ветэранскіх і іншых арганізацый.

Сёння сітуацыя змянілася: Рэспубліка Беларусь абвешчана суверэннаю, незалежнаю, узніклі новыя грамадскія сілы — многія палітычныя партыі, рухі, аб'яднанні. А ў парламенце рэспублікі засядае камуністычная пераважная большасць, якая мысліць катэгорыямі савецкай імперыі, якая ваюе супраць сваёй незалежнай дзяржавы, супраць дзяржаўнай мовы і ўсёй нацыянальнай атрыбутыкі, якая стараецца (і небеспаспяхова!) заблакіраваць законапраекты, што скіраваны супраць карупцыі, раскрадання народнага дабра і г. д.

Ачмураныя шматгадовою артадаксальнаю бальшавіцкаю прапагандаю, нагнятаннем нянавісці да ўсяго дэмакратычнага і нацыянальнага, затурканыя бегатнёю па чэргах з талонамі і карткамі, задушаныя нястачаю і жабрацтвам, многія суайчыннікі віну за эканамічныя і іншыя беды звальваюць на дэмакратаў. Хочацца сказаць ім: людзі добрыя, адкрыйце свае вочы, паглядзіце вакол сябе! Хто сёння расцягвае наша з вамі народнае дабро: скупляе за бясцэнак машыны, трактары, хто «прыхватызуе» ўсё, што трапіць пад руку, хто будуе за дзяржаўны кошт шматпавярховыя асабнякі, катэджы, дачы, хто варочае сотнямі мільёнаў і набівае свае кішэні ў розных сумніцельных СП і МП, хто правіць «пір у час чумы»? Дэмакраты? А дзе вы бачыце тых дэмакратаў у заканадаўчых і ўладных структурах? Жменька іх ёсць у парламенце, адзінкі ва ўрадзе, і так да самага нізу. Ці могуць яны рэальна ўплываць на становішча ва ўсіх сферах жыцця? Канешне ж, не могуць. Так што гаварыць пра дэмакратыю ў Беларусі не

даводзіцца. Яшчэ адзін крок да дэмакратыі наша грамадства зробіць, калі будуць праведзены выбары з улікам сённяшніх рэалій, на прынцыпова новай аснове. І тут усё залежыць ад народа, ад яго свядомасці.

Наш народ доўга яшчэ будзе вызваляцца з путаў таталітарызму, пераадольваць свой страх, грамадзянскую, палітычную пасіўнасць. Я часта сустракаюся з рознымі людзьмі, шмат дзе бываю і ведаю, які настрой пануе сёння ў гушчыні народа. Паўсюдна безліч кансерватыўна настроеных людзей: і ў горадзе, і, асабліва, у вёсцы. Кавалерыйскім наскокам гэты настрой не зменіш. Патрэбна актыўная, карпатлівая растлумачальная праца па абуджэнню свядомасці народа, падняццю ўзроўню ягонай палітычнай культуры. Вось тут многае магла б зрабіць беларуская інтэлігенцыя. Ды, зрэшты, ёю ўжо нямала здзейснена. Шкада толькі, што вялікая частка самой інтэлігенцыі таксама кансерватыўная і пасіўная. Аднак, паўтаруся, зрух ёсць. Пэўнае яднанне інтэлігенцыі, каб аберагчы і даць магчымасць развіцця кволым яшчэ парасткам дэмакратыі, заўважаецца.

Але не спяць у шапку і процілеглыя сілы. Няўклюдныя нападкі, беспардонная хлусня ў адрас свядомай і актыўнай нацыянальнай інтэлігенцыі поўняць не толькі старонкі прабальшавіцкіх, але і праімперскіх газет, якія, як пустазелле, запаланілі пад вэрхал перабудовы і бязладдзя ўсю інфармацыйную прастору Беларусі. Іх атака на палітычную, эканамічную незалежнасць, суверэннасць рэспублікі, на беларускую мову і культуру становіцца апошнім часам усё больш нахабнай і цынічнай, бо «працуюць» яны, прымерваючыся да падзей, што разгортваюцца цяпер у доме «магутнага ўсходняга суседа». Многія абаронцы імперыі, як і ў час жнівеньскага путчу, ужо задаволена пляскаюць у ладкі.

І гэта зразумела. Прадстаўнікі «пятай калоны» — люд, які спяшаў у «каўбасную» Беларусь «на ловлю счастья и чинов», як і дэнацыяналізаванае, разбэшчанае сваёю ўладаю над людзьмі мясцовае чыноўніцтва (ад верху і да самага нізу), ніколі не жылі клопатамі нашае шматпакутнае зямлі і яе народа, святым, спаконвечным спадзяваннем беларусаў — «людзьмі звацца». Яны ніяк не могуць змірыцца, што Беларусь сёння хоча быць не калоніяй, а незалежнай дзяржаваю, каб весці самастойную знешнюю палітыку, каб супрацоўнічаць на роўных з усімі народамі, каб будаваць сваё палітычнае, эканамічнае і духоўнае жыццё не пад наглядам «старэйшага брата», а зыходзячы з уласных інтарэсаў, улічваючы нацыянальныя асаблівасці і магчымасці, традыцыі і вопыт.

Пагарда да ўсяго беларускага, як іржа, настолькі раз'ела душы многіх жыхароў рэспублікі, што яны ў сваёй зацятасці і варожасці не заўважаюць, як сякуць галіну, на якой самі сядзяць. Усім трэба зразумець, што вярнуць савецкую імперыю, нават танкамі, аўтаматамі, праліццём вялікай крыві, немагчыма. А вось пабудаваць суверэнную, прававую, цывілізаваную Рэспубліку Беларусь, дзе будуць жыць заможна, разумна, культурна і годна прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей, усіх палітычных перакананняў, усіх веравызнанняў, можна, і да гэтага трэба імкнуцца. Калі мы — усёй народнаю сям'ёю — гэта зразумеем і зробім, выйграе кожны жыхар Беларусі. Вось яна, тая ідэя, пра якую вы вялі гаворку. Ці не так?

Шлях да дэмакратыі цярністы і доўгі. На ім могуць быць узлёты і спады, але я веру ў свой народ, у тое, што ён, рана ці позна, пабудуе сапраўды дэмакратычную Беларусь. Гэтая мара аплочана крывёю і пакутамі многіх лепшых сыноў і дачок народа, і яна павінна здзейсніцца.

— *Працягам папярэдніх пытанняў з'яўляецца гэта. Як вы мяркуеце, ці патрэбны ўсім нам сёння новыя маральныя каштоўнасці? Ідэі «вялікага і непарушнага» Саюза, савецкага інтэрнацыяналізму, вернасці марксізму-ленінізму і г. д. і да т. п. рухнулі. Але ж вакууму быць не можа, ці не так?*

— А навошта выдумляць нешта новае? Ёсць агульныя маральныя прынцыпы, каштоўнасці, якія выпрацаваны цывілізацыяй, усім чалавецтвам за доўгі час іхняга існавання. Няўжо можна прыдумаць нешта мудрэйшае? Няўжо ідэі марксізму-ленінізму або савецкага інтэрнацыяналізму былі такія ўжо важныя для простага чалавека, скажам, беларускага селяніна? Ён жыў так, як і ягоныя продкі, захоўваючы даўнія мудрыя традыцыі: любі сваю зямельку, шчыруй у працы, бо без гэтага не пражывеш, будзь акуратным, ашчадным, шануй маці і бацьку сваіх, ахінай ласкаю жонку і дзяцей, жыві дружна з суседзямі, не схлусі, не ўкрадзі, не забі... Той просты селянін з яго спрадвечнай мудрасцю, якога вынішчыла савецкая ўлада, мог пацягацца з класікамі ўсялякіх «ізмаў»! Гэтую б мудрасць усім нам сёння, і ў адносінах між народамі яна не пашкодзіць.

Якраз адыход ад агульначалавечых маральных прынцыпаў, калі класавая барацьба, нацкоўванне адных на другіх, дэмагогія і хлусня былі ўзведзены ў ранг дзяржаўнай палітыкі, і стаў нашаю страшнаю бядою.

— *Не ведаю, ці знайду ў вас паразуменне, але, на маю думку, сёння адна наменклатура ідзе на змену другой. Ці можаце вы выказаць прагноз: што, якія арыенціры прапануе яна ў якасці сваіх*

*лозунгаў, дэвізаў, праграм?.. Наколькі будуць яны адпавядаць запатрабаванням і спадзяванням людзей — простых смяротных?*

— А ў гэтым нічога дзіўнага няма. Пакуль што мяняюцца шыльды, з крэсла ў крэсла начатасоўваюцца старыя кадры, нават маладзейшыя па ўзросту, яны ўсё тыя ж — зашораныя, кансерватыўныя, дэнацыяналізаваныя. Прыток новых сіл, якія сапраўды любяць гэтую гаротную і цудоўную зямлю, дбаюць пра народ, яго будучыню, жывуць не адным толькі днём, вельмі слабы. Ды што зробіш, ёсць рэаліі, якія адным махам не пераскочыш. Павінна змяніцца многае, у тым ліку і сама псіхалогія людзей. А гэта доўгі працэс.

Ну а што да лозунгаў, дэвізаў і праграм, то яны знойдуцца і будуць вельмі прыгожымі. Вы ж не скажаце, што дэкрэты бальшавікоў былі непрывабнымі? А чым скончылася іхняе ажыццяўленне? Бяда ў тым, што за лозунгамі, як паказваюць і даўняя гісторыя, і наша рэчаіснасць, няма адэкватных канкрэтных спраў.

*— Ці ёсць у беларускай культуры, у яе прадстаўнікоў з самых розных сфер нявыкарыстаны патэнцыял, свайго роду зарад, які можа — ужо ў недалёкім будучым — ажывіць наша духоўнае жыццё? Як прывесці яго ў рух?*

— А мне здаецца, што не выкарыстоўваецца належным чынам нават той патэнцыял культуры, які ўжо маецца. Ён агромністы. І не трэба думаць, што ўсё створанае за савецкі час сёння нікуды не вартае. На Беларусі былі і ёсць майстры культуры, творы якіх паслужаць не толькі нам, але і нашым дзецям, унукам, праўнукам і яшчэ многім пакаленням. Узяць хоць бы тую ж літаратуру. Яна не ўключана на поўную сілу ў шматгранны працэс выхавання. Мы ведаем, колькі непрадуманасці, непаразумення ў школьных праграмах (і з класікаю, і з сучаснымі творамі), у іх ідэалогія бярэ верх над мастацкімі вартасцямі, як нядбайна, прымітыўна выкладаецца беларуская мова і літаратура ў многіх школах, вучылішчах, тэхнікумах, ВНУ, як і тое, што многія бібліятэкі не маюць падпісак на літаратурныя часопісы, што ў дзіцячых бібліятэках не хапае нават тых кніг, якія ўключаны ў школьную праграму, і бацькам даводзіцца перапісваць апавяданні і вершы ад рукі. Наогул, няма паслядоўнай сістэмы далучэння людзей да мастацкага слова, іх літаратурнай адукацыі. Многія юнакі і дзяўчаты перастаюць сябраваць з кнігаю адразу пасля школы, а літаратура ж павінна ісці поруч з чалавекам праз усё жыццё. Ні тэлебачанне, ні кіна- і відэафільмы, ні тэатр, пры ўсёй павазе да іх, не могуць замяніць літаратуру.

А калі гаварыць пра ўмовы, у якіх сёння жывуць і працуюць работнікі культуры, то яны надзвычай складаныя і ў маральным, і ў

матэрыяльным плане. Заўсёды ў час грамадскіх узрушэнняў, у хаосе пераходнага перыяду найбольшыя страты нясуць духоўнасць, культура. Яшчэ не аслабанілася іхняе далікатнае, хрупкае горла ад ідэалагічнага хамута, як на яго ўжо накінута і зацягваецца эканамічная пелька.

Усюды ў краінах з адладжаным жыццём ёсць увага і павага да культуры і яе творцаў. Дзяржава ўкладвае ў культуру вялікія сродкі і не лічыць гэта марнатраўствам. Духоўнасць, маральнае здароўе народа дапамагаюць яму жыць цывілізавана, заможна. Хочацца, каб і ў нашых кіраўнікоў усё ж выспелілася такое разуменне.

А цяпер наконт нявыкарыстанага патэнцыялу ці зараду. Канешне ж, як і ў любой сферы чалавечай дзейнасці, ёсць ён і ў культуры. Ды мастацкая творчасць — справа тонкая, далікатная, індывідуальная. Тут масавага прарыву няма. Усё залежыць ад кожнага асобнага таленту. Прыйдзе час, і ён скажа сваё слова.

*— А пісьменнікі выступяць са сваім словам і на старонках «Полымя». Хацелася б ведаць: як рэдакцыйны калектыў сустракае 70-годдзе часопіса?*

— Вось-вось падпішам у свет 764-ую кніжку «Полымя». Столькі нумароў часопіса выйшла за час яго існавання. Гэта цэлая бібліятэка, неацэнны скарб. Гартаючы нумары, бачыш, які вялікі шлях прайшоў часопіс, далучаючы новыя і новыя пакаленні беларусаў да жыццядайнай, чыстай крыніцы роднай мовы, літаратуры, культуры.

Гэтая дарога не была прамою і гладкаю. Таталітарызм, ідэалагічны манапалізм, якія панавалі ў грамадстве, не маглі не скоўваць творчую волю тых, хто выпускаў «Полымя» ў свет. У трыццатыя, саракавыя гады якія толькі разносныя опусы не траплялі на яго старонкі! Але асноўную сваю задачу — знаёміць чытачоў з лепшымі набыткамі айчыннае літаратуры, абуджаць нацыянальную годнасць, свядомасць беларусаў, узнімаць культуру народа — часопіс, нават у самыя змрочныя часы, выконваў пастаянна, мэтанакіравана. За гэта шчырая, сардэчная ўдзячнасць нашым папярэднікам.

«Полымя» — важны асяродак духоўнага развіцця нацыі. У апошнія гады часопіс набыў новае дыханне. Расшырыліся раздзелы і рубрыкі, поруч з сучаснаю прозаю, паэзіяй, драматургіяй, крытыкай друкуецца шмат матэрыялаў па гісторыі нашага народа, яго культуры, літаратурная спадчына. Усё гэта так неабходна сёння і для школы, і для вышэйшых навучальных устаноў, ды і для кожнага беларуса.

Калектыў рэдакцыі бачыць, што наша праца патрэбна людзям (пра гэта сведчыць рост падпіскі), а таму працуе самааддана і натхнёна.

*— Сёння модна шукаць паратунак у духоўным. Ці верыце вы асабіста ў астралогію, прадказанні? Аб чым думаецца вам у хвіліны роспачы, адчаю? Ці не стамляе вас палітыка, барацьба розных сіл у рэспубліцы, якая, думаецца, будзе не заціхаць, а абвастрацца і разгарацца?.. Чаго больш за ўсё вы баяліся і баіцеся цяпер у жыцці?*

— Якраз і кепска, што модна. Да гэтага кожны чалавек павінен прыходзіць сам, а не ў гурце.

А чаму б і не верыць у астралогію? Гэта сур'ёзная навука. Мы, людзі, як і ўсё існае, непарыўна звязаны з космасам. І ў нас, на Беларусі, здаўна былі выдатныя астролагі, скажам, той жа Сімяон Полацкі. Іншая справа, што каля гэтага сёння распачалася непатрэбная валтузня, мітусня розных дылетантаў.

Сумныя хвіліны прыходзяць нярэдка. Жыццё такое — бязладнае, няпэўнае. А ўспамінаю я тады родныя мясціны, маленства, думаю пра маці, бацьку, пра сваіх дзяцей. Гэтым і лячуся. А яшчэ працаю, якую люблю. Рэдактарскія клопаты сёння надта вымотваюць, але выйдзе чарговы нумар часопіса, бярэш яго ў рукі — і так радасна на душы: жывем, не згінулі. На сваю асабістую літаратурную працу часу застаецца няшмат. Пішу познімі вечарамі, ноччу, а яшчэ тады, калі прыхварэю, у час чарговага адпачынку.

Што да палітыкі, то яна і мяне ўкруціла ў сваё кола. У 1991 годзе ўступіў у Беларускую сацыял-дэмакратычную грамаду, стаў сябрам Цэнтральнай рады. Уваскрашэнне, адраджэнне беларускай сацыял-дэмакратыі, якая была на пачатку стагоддзя значнаю палітычнаю сілаю ў нашым краі, а потым фізічна вынішчана, гістарычная заканамернасць. Яе ідэалы — улада ўсяго народа, сацыяльная справядлівасць, абарона людзей наёмнай фізічнай і разумовай працы, гуманізм, дзяржаўная незалежнасць — не могуць не прываблівацъ. І я стараюся ўнесці сваю, хай сабе і невялічкую, лепту ў станаўленне гэтай партыі, якая паступова заваёўвае аўтарытэт у народзе.

Шматпартыйнасць — гэта норма кожнай цывілізаванай краіны. І палітычная барацьба ў рэспубліцы будзе набіраць размах. Гэта нармальна. Галоўнае, каб вялася яна карэктна.

Апошняе пытанне з гэтай вязанкі крыху дзіўнае, але адкажу і на яго. Я ўжо сваё адбаяўся. Пасля Чарнобыля, пасля таго, што ўбачыў і перажыў летам 1986 года на палескай зямлі, з чым сутыкаюся штодзённа і цяпер, я асабіста нікога і нічога не баюся. Мяне палохае толькі лёс нашых дзяцей, унукаў, увогуле будучыня нацыі.

*— Што больш за ўсё цэніце вы сёння ў людзях? А якія рысы і якасці іх вам не падабаюцца?*

— Цаню ў людзях мужнасць, сумленнасць і талент, а ненавіджу подласць, угодніцтва і крывадушша.

*1992*

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

**ЗМЕСТ**

ІНШАГА ШЛЯХУ НЯМА
ГОД АБУДЖЭННЯ
ДЭФІЦЫТ ПРАЎДЫ
НЕЛЬГА ЖЫЦЬ ДУШОЮ КВОЛЫМІ
СЦЕЖКА ПРАЗ ЖЫТА
НАШ ПАРАТУНАК — АДРАДЖЭННЕ
ВЫБАРЫ ПА-ВІЦЕБСКУ, АБО ЯК Я «СПРАБАВАЎ ЗАХАПІЦЬ УЛАДУ»
ПАЧУЕМ ПРОДКАЎ ГАЛАСЫ
БЕЛАРУСКАЕ СЭРЦА
ВЕРУ Ў, РОЗУМ НАРОДА
СВЯТКАВАЦЬ ПЕРАМОГУ ЯШЧЭ РАНА
БЕЗ ЛЮБОВІ СТВАРАЦЬ НЕМАГЧЫМА
«ІНТЭЛІГЕНТНАСЦЬ — ГЭТА ПЕРШ ЗА ЎСЁ СУМЛЕННАСЦЬ»

**Законнікаў С.**

Беларускае сэрца: Публіцыст. роздум, эсэ.— Мн.: Беларусь, 1993.—110 с.— (Плошча Свабоды).

ISBN 5-338-011007-7.

У кнізе публіцыстычнага роздуму ўсхвалявана, з трывогаю і болем пісьменнік вядзе гаворку пра засілле на нашай зямлі двух Чарнобыляў — духоўнага і радыяцыйнага, горача выступае ў абарону роднай мовы і культуры, за захаванне маральнага і фізічнага здароўя людзей, напамінае пра вялікую адказнасць за нацыянальнае Адраджэнне, за будучыню беларусаў.

Для масавага чытача.